НАПЕРАДЗЕ — ВЕЧНАСЦЬ

6

МАМА, ПАЙШЛІ ДА «МАРУСІ»

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 СТУДЗЕНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 12 (29381)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй САВІНЫХ, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў:

«Перш за ўсё хачу падкрэсліць, што знешняя палітыка Беларусі грунтуецца на прынцыпах, а не на адносінах. Мы заўсёды гатовыя — гэта наш знешнепалітычны прынцып — да канструктыўнага супрацоўніцтва з любымі замежнымі партнёрамі. Не будзе выключэннем, натуральна, адміністрацыя Байдэна. Іншае пытанне, у якой ступені амерыканскі бок здолее адказаць канструктыўнай пазіцыяй на нашу прапанову, — пакажа будучыня. Тым не менш, безумоўна, мы будзем весці дыялог у кірунку ўмацавання даверу, супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння».

КАРАТКА

- **Урад зацвердзіў дзяржпраграму «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» да 2025 года.**
- «Белвест» у 2020 годзе спрацаваў з дадатным знешнім эканамічным сальда ў $9,5 млн.
- **«Белпошта» 23 студзеня будзе бясплатна дастаўляць паштоўкі.**
- У Беларусі за 2021 год плануецца пабудаваць 4 млн кв. м жылля.
- **Папуляцыя высакароднага аленя ў Віцебскай вобласці да 2025 года павялічыцца ў два разы.**
- Лазерны апарат для лячэння ран, якія доўга не загойваюцца, устанавілі ў Брэсцкай абласной бальніцы.

ISSN 1990 — 763X

НА ФОНЕ РАДЗІВІЛАЎСКІХ АЛЕЙ

Жыхар Нясвіжа Сяргей ЦВІРКА любіць пешыя прагулкі са сваімі малалетнімі дочкамі Софіяй і Анастасіяй па прыгожых мясцінах славутага горада-музея. Маладую сям'ю вабіць знакаміты радзівілаўскі парк з ягонымі пышнымі алеямі і відам на палацавы комплекс. У любое надвор'е тут не бывае сумна. У марозны і пагодны дзянёк мне давялося ўбачыць клапатлівага бацьку адразу з двума санкамі, на якіх сядзелі яго дочкі-пагодкі: сямейны экіпаж прагульваўся па беразе замкавага возера на ўскрайку парку, які мае гістарычную назву «Англійскі». Перад намі адкрылася шыкоўная панарама з маляўнічай і казачнай архітэктурай.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Размова па сутнасці

Мір, суверэнітэт, сацыяльны характар дзяржавы і высокія тэхналогіі

Неблагі падмурак для дыскусіі аб будучыні краіны ў Год народнага адзінства

Першы Указ Прэзідэнта ў бягучым годзе — аб аб'яўленні 2021-га Годам народнага адзінства — закранае паняцці, без якіх немагчымае існаванне дзяржавы ўвогуле, — згоду і лад у грамадстве. Указ досыць лаканічны — змяшчае ўсяго тры пункты. Але беларусам як ніколі неабходны яскравы і дакладны пасыл да яднання, і справа тут зусім не ў колькасці радкоў і слоў.

Як дасягнуць адзінства нацыі і наколькі важная для беларусаў гэта тэма? Аб гэтым у фармаце круглага стала «Звязды» разважалі палітычныя аглядальнікі Аляксей ДЗЕРМАНТ і Аляксандр ШПАКОЎСКІ, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй КАРОЛЬ і дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ Вадзім ГІГІН.

СТАР. 4

Актуальны дыялог

Пераемнасць важная ва ўсіх справах

Любы рух павінен быць паступальным, а не разбуральным

Фота БелТА.

Так лічыць першы намеснік міністра аховы здароўя Алена БОГДАН. Алена Леанідаўна некалі ўдзельнічала ў падрыхтоўцы гэтага рэспубліканскага мерапрыемства. Сёння яна сама дэлегат УНС, якога вылучыў Беларускі саюз жанчын. Нядаўна прадстаўніцу Міністэрства выбралі старшынёй гэтага грамадскага аб'яднання, і яна расказала чытачам «Звязды», ці плануе Беларускі саюз жанчын стаць першай жаночай палітычнай партыяй у краіне і як гэта — сумяшчаць работу ў дзяржапараце з актыўнай грамадскай дзейнасцю.

СТАР. 6

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У аснове павінны быць мэтазгоднасць, эканамічная эфектыўнасць і сацыяльная справядлівасць»

Гэтыя словы Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сказаў адносна праекта Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы і іншых дакументаў у сферы эканомікі на нарадзе з кіраўніцтвам Савета Міністраў.

Учора на парадку дня нарады ў кіраўніка дзяржавы было пяць пытанняў: Дзяржаўная інвестыцыйная праграма, рэалізацыя асобных, найбольш значных, інвестпраектаў, змяненне заканадаўства аб гаспадарчых таварыствах, рашэнні ў сферы электраэнергетыкі і аграэкатурызму.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўсе разнапланавыя дакументы, вынесеныя на абмеркаванне (праекты чатырох указаў і аднаго закона) аб'ядноўвае адно — «актуальнасць для нашай дзяржавы». Маецца на ўвазе немагчымасць іх адкладання, звярнуў увагу Прэзідэнт. «Трэба прымаць рашэнні, або мы замарудзім развіццё як мінімум на канкрэтным участку эканомікі. ***Тармажэнне на асобным канкрэтным участку — гэта тармажэнне ў цэлым. Гэтага быць не павінна. Але і памылкі быць не павінна»,*** — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён растлумачыў, што перш чым падпісваць дакументы, хацеў бы атрымаць дадатковую інфармацыю і яшчэ раз пачуць высновы распрацоўшчыкаў і меркаванне тых, хто будзе дакументы рэалізоўваць, перш за ўсё — кіраўнікоў рэгіёнаў. «Мае падыходы па большасці пытанняў вядомыя. ***Пры абмеркаванні прапанаваных тэм у аснове павінны быць мэтазгоднасць, эканамічная эфектыўнасць і сацыяльная справядлівасць»,*** — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

У праекце Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы прадугледжана будаўніцтва каля 130 аб'ектаў на суму больш за шэсцьсот мільёнаў рублёў, адзначыў Прэзідэнт. Сума для дзяржавы невялікая, але і тут павінна быць эканомія, запатрабаваў ён. Неабходна вылучаць найбольш важнае і неабходнае для развіцця.

«Мяне цікавіць, наколькі выверaны і аптымальны гэты пералік, які мы ўносім у Дзяржаўную праграму? Ці няма ў ім празмернасцяў? Ці абгрунтаванае фінансаванне кожнага аб'екта?» — задаў ён пытанне распрацоўшчыкам.

«Па камерцыйных праектах, разгляд якіх выносіцца на ўзровень кіраўніка дзяржавы, я таксама стаўлю аналагічныя пытанні, — пракаментаваў Прэзідэнт другі пункт парадку дня. — ***Свабодных грошай няма, шалёных грошай няма. Тым больш для тых аб'ектаў, якія самі павінны прыносіць даход.*** А любое зацягванне тэрмінаў іх рэалізацыі — гэта фінансавыя страты, якія нехта будзе вымушаны аплаціць».

У сферы дзяржаўных інвестыцый трэба абавязкова дабудаваць тое, што распачалі. Калі немагчыма — адтэрмінаваць хоць бы на год, бо ніхто зараз не бярэцца сказаць, якім будзе год, што наступіў. Рызыкаваць нельга, пераканаць Прэзідэнт.

Пра карэкціроўку заканадаўства па пытаннях дзейнасці гаспадарчых таварыстваў Аляксандр Лукашэнка сказаў наступнае: ***«Заканадаўства тым не менш не павінна часта змяняцца. І калі мы нешта дапаўняем, то павінны пераканацца, што ўсё ўлічана.*** Тым больш, што пытанні, якія рэгулююцца гэтым законапраектам, закранаюць большасць арганізацый краіны».

Новаўвядзенні ўтрымліваюць палажэнні, якія за кошт мер фінансавага аздараўлення дазволяць палепшыць эканамічнае становішча прадпрыемстваў, прыцягнуць дадатковы капітал, стымуляваць кіраўнікоў на эфектыўнае развіццё. Прэзідэнт запатрабаваў больш глыбокай ацэнкі таго, што гэта дасць прадпрыемствам.

«Пры гэтым хачу падкрэсліць: не дай бог вы мяне не пераканаеце ў адваротным, што паціху вось такім чынам падштурхоўваеце прыватызацыю, продаж прадпрыемстваў або такім чынам дзейнічаеце, што потым мы не адыграем назад, — папярэдзіў беларускі лідар. — ***Па прыватызацыі мы канцэптуальна вызначыліся, і гэта прынята народам. Калі ласка, поўная свабода развіцця прыватнай уласнасці, дзяржаўна-прыватнага партнёрства, калі ласка, дзейнічайце. Але тое, што створана народам, — не кранайце».***

На нарадзе абмяркоўвалася прапанова ўрада дазволіць вытворцам прадаваць лішкі электрычнай энергіі спажыўцам у любую вобласць краіны. Галоўнае патрабаванне Прэзідэнта — захаванне адзінай сістэмы ў сферы электраэнергетыкі.

Яшчэ адно пытанне нарады датычылася прадаўжэння льгот для аб'ектаў аграэкатурызму. «Дзякуючы створаным у апошнія гады ўмовам, з'явіўся новы сектар эканомікі, які атрымаў магутнае развіццё, — адзначыў беларускі лідар. — За 14 гадоў колькасць аб'ектаў аграэкатурызму выраслa ў 80 разоў (з 34 да амаль трох тысяч). Летась яны прынялі больш за паўмільёна гасцей».

Пры гэтым паслугі турызму сталі вельмі папулярныя як сярод гасцей нашай краіны, так і ў беларусаў, асабліва ў перыяд пандэміі, калі большасць краін для падарожжаў закрыліся, дадаў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу на рост попыту на этнаадпачынак ва ўсім свеце, які, відавочна, працягнецца. Прапанова беларускага ўрада — падоўжыць дзеючыя ўмовы для аграэкасядзіб, а льготнае крэдытаванне захаваць да 2030 года.

Прэзідэнт не супраць падтрымліваць гэты від дзейнасці. Але яго патрабаванне — ***не выходзіць у прыняцці адпаведных рашэнняў за межы пяцігодкі і не дапускаць у гэтай сферы злоўжыванняў. Ён даручыў ураду дасканала вывучыць функцыянаванне аграэкасядзіб,*** каб выключыць ільгатаванне тых, хто не мае ў тым патрэбы і тых, хто займаецца іншымі відамі дзейнасці пад шыльдай экатурызму. Прэзідэнт падкрэсліў: ***важна, каб такі адпачынак быў запатрабаваны беларусамі і быў даступны для іх.***

Аляксандр Лукашэнка асобна спыніўся на праблеме сыходу ад падаткаў: «Капітальная задача для ўсіх прысутных, для парламента перш за ўсё, і для ўрада. ***Унясіце самыя жорсткія меры па парушэнні заканадаўства па падаткаабкладанні.*** Унясіце «амерыканскія законы», якія дзейнічаюць у Злучаных Штатах Амерыкі. Давайце прымем іх, ніхто крытыкаваць не будзе, яны (ЗША. — **«Зв.»**) — «апора дэмакратыі». Там падаткаабкладанне рэгулюецца жорстка, і за нявыплату падаткаў там шалёныя тэрміны — да 15 і больш гадоў (зняволення. — **«Зв.»**)».

У Беларусі цэлыя галіны сыходзяць у цень ад падаткаабкладання, сказаў Аляксандр Лукашэнка. У сувязі з гэтым, яшчэ адно праблемнае пытанне — так званыя заробкі ў канвертах. «Самае жорсткае пакаранне, — запатрабаваў ён. — Вазьміце гэта да выканання неадкладна!»

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

У ТЭМУ

Праект Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы будзе перагледжаны ўрадам праз прызму эфектыўнасці рэсурсаў, якія накіроўваюцца на вытворчасць і ў сацыяльную сферу, падвёў вынікі нарады для журналістаў **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ.** Па яго словах, у дакуменце застануцца тыя праекты, якія ў найбліжэйшы час дадуць рэальную аддачу ў плане стварэння новых рабочых месцаў, паступлення падаткаў у мясцовыя бюджэты, падтрымаюць развіццё раёнаў, якія адстаюць.

«У цэлым, калі характарызаваць высновы аб Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме, яна павінна стаць эфектыўнай у адносінах да ўкладзеных дзяржаўных рэсурсаў», — падсумаваў міністр.

Рэсурсы скацэнтруюць у сферах аховы здароўя, транспартнай інфраструктуры, энергетыкі і меліярацыі, дадаў ён.

Журналісты спыталі кіраўніка міністэрства эканомікі, які працэнт ВУП, на думку спецыялістаў, недаатрымлівае краіна ад бізнесу, які ўхіляецца ад падаткаў.

«Гэта лічба (недаатрыманы ВУП з-за «шэрага» бізнесу. — **«Зв.»**) вар'іруе ў дастаткова вялікіх межах, — адказаў ён. — Паводле ацэнак нашых вучоных, гэта каля 12 %. Паводле ацэнак міжнародных арганізацый, гэты паказчык даходзіць да 18 %, недзе разглядаецца лічба каля 20 %. Таму плаціць падаткі трэба. Гэта абавязак любога бізнесу. Але павінен быць баланс. Калі мы робім больш жорсткай падатковую сістэму, то на вагах павінны быць іншыя паслабленні».

Аляксандр Чарвякоў таксама пракаментаваў дакумент, які датычыцца пралангацыі льгот для аграэкатурызму. Ён не сумняваецца, што развіццё гэтага кірунку мае добры патэнцыял. «Мы павінны выкарыстоўваць прыродныя багацці, каб ствараць рабочыя месцы там, дзе не заўсёды можна арганізаваць буйную вытворчасць», — лічыць ён.

Саюзная дзяржава, ЕАЭС і барацьба з ковідам

Увечары 20 студзеня гэтыя і іншыя тэмы падчас першай у бягучым годзе тэлефоннай размовы абмеркавалі прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін. Пра гэта паведаміла прэс-служба кіраўніка краіны.

Прэзідэнты падрабязна абмеркавалі актывізацыю разнапланавага супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы, узаемадзеянне ў ЕАЭС і іншых інтэграцыйных структурах, а таксама шэраг кадравых пытанняў.

У сваёй размове кіраўнікі дзвюх краін закранулі актуальныя тэмы міжнароднага парадку дня. Асаблівая ўвага, паводле інфармацыі прэс-службы Прэзідэнта Беларусі, аддадзена тэматыцы барацьбы з распаўсюджваннем COVID-19. Пацверджаны раней дасягнутыя дамоўленасці аб працягу сумесных намаганняў і далейшай цеснай кардынацыі дзвюх краін па супрацьдзеянні дадзенай інфекцыі.

Прафсаюзы занепакоены

Павышэнне падаткаў можа прывесці да росту цэн на шэраг тавараў

Пра гэта заявілі ў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) па выніках аналізу тэндэнцый на спажывецкім рынку і кансультацый з прадстаўнікамі рытэйлу.

Нагадаем, што з пачатку года ў адпаведнасці з абноўленым Падатковым кодэксам былі павялічаны стаўкі падатку на дабаўленую вартасць з 10 % да 20 % на шэраг харчовых тавараў і тавараў для дзяцей, а таксама лекавых сродкаў і медыцынскіх вырабаў. Акрамя таго, прадугледжана істотнае павелічэнне падатку на зямлю ў дачыненні да ўчасткаў, на якіх размешчаны гандлёвыя аб'екты.

«У канцы 2020 года мы фіксавалі рост цэн на шэраг сацыяльна значных тавараў. У першую чаргу гэта датычыцца імпартных прадуктаў, такіх як алей сланечнікавы, рыба, чай, крупы і некаторыя іншыя. У асноўным гэта тлумачыцца павышэннем сусветных і, адпаведна, закупачных цэн, — адзначыла **намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Алена МАНКЕВІЧ.** — Цяпер фактарам павышэння цэн, у тым ліку на харчовыя тавары, можа стаць павелічэнне падаткаў. Паколькі павышэнне выдаткаў вытворцаў і прадаўцоў, у тым ліку і падатковых адлічэнняў, у канчатковым выніку, як правіла, адбіваецца на кошыку спажыўца».

Акрамя таго, як падкрэслілі ў ФПБ, павышэнне ставак зямельнага падатку можа прывесці да росту арэндных плацяжоў для прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу, якія арандуюць памяшканні ў гандлёвых цэнтрах.

«Ва ўмовах пандэміі ў першую чаргу пацярпелі прадпрыемствы малога і сярэдняга бізнесу. Далейшае павелічэнне выдаткаў для іх за кошт павышэння арэндных плацяжоў можа прывесці да іх закрыцця. А гэта ўжо пытанні занятасці і рабочых месцаў для людзей», — адзначыла Алена Манкевіч.

Як расказалі ў Федэрацыі прафсаюзаў, у найбліжэйшы час будзе арганізавана правядзенне шэрагу сумесных нарад з усімі зацікаўленымі бакамі — вытворцамі, пастаўшчыкамі, гандлёвымі сеткамі — для выпрацоўкі сумесных збалансаваных рашэнняў, якія дазволяць пазбегнуць рэзкага росту рознічных цэн і пры гэтым забяспечыць рынак неабходнымі таварамі.

Сяргей КУРКАЧ.

Блізкая ўлада

ВЫСЛУХАЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

У Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах адбудуцца прамыя лініі

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 23 студзеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

З «ЧЫРВОНАЙ» ЗОНЫ НА БУДПЛЯЦОЎКІ

Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч наведаў «чырвоную» зону ў Рагачоўскай бальніцы, што на Гомельшчыне, і будоўлю новых карпусоў у Магілёве

Падчас сустрэчы з калектывам Рагачоўскай цэнтральнай раённай бальніцы міністр расказаў пра планы па развіцці сістэмы аховы здароўя і адказаў на пытанні медыкаў.

Мяркуецца, што ў найбліжэйшыя гады ў бальніцы запрацуе свой камп'ютарны тамограф. Месца для яго ўстаноўкі ўжо вызначана. А перад запускам спецыялісты атрымаюць магчымасць прайсці навучанне. Адзін з работнікаў службы хуткай дапамогі падняў пытанне аб аднаўленні работы медыцынскіх выцвярэзнікаў. Такая практыка абмяркоўваецца апошнім часам як у Расіі, так і ў Беларусі.

Не пакінуў без увагі Дзмітрый Піневіч і пытанні, звязаныя з рамонтам будынкаў, умовамі працы медыкаў падчас COVID-19, таксама былі абмеркаваны праблемы даснашчэння рэанімацый і аперацыйных новай высокатэхналагічнай апаратурай.

Змяніўшы пінжак на касцюм індывідуальнай аховы, Дзмітрый Піневіч прайшоў у «чырвоную» зону, дзе паразмаўляў з медыкамі і пацыентамі. Апошнія таксама выказалі пажаданне стварэння пры бальніцы цэнтра з камп'ютарным тамографам. «Мы разумеем, што жывём у стагоддзе інфекцыйных эпідэмій, і свой КТ на раён быў бы вельмі запатрабаваны», — сказаў міністру адзін з пацыентаў, які трэці тыдзень праходзіць лячэнне не толькі ад каранавіруса, але і ад сваіх хранічных захворванняў. Таксама міністр абмяркоўваў з медыкамі выкладванне пацыентаў у прон-пазіцыю (на жывот), фінансаванне перапрафіляваных аддзяленняў, наяўнасць сродкаў аховы і лекаў, аплату працы і іншыя пытанні.

У Магілёве Дзмітрый Піневіч пабываў у трох медустановах. У мясцовым анкадыспансеры вядуцца актыўныя будаўнічыя работы — узводзіцца радыялагічны корпус. Высокатэхналагічнае абсталяванне будзе пастаўлена сюды за кошт рэспубліканскага бюджэту. Наведаў міністр і бальніцу хуткай дапамогі, дзе прапанавана пабудаваць новы корпус экстраннай цэрэбракардыяваскулярнай хірургіі. Тут змогуць лячыць неадкладныя станы ў нейрахірургіі, неўралогіі і кардыялогіі.

Азнаёміўся міністр і з будаўніцтвам на тэрыторыі абласной клінічнай бальніцы. Тут узводзіцца кардыяхірургічны корпус. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы, Міністэрства аховы здароўя мусіць дааснасціць корпус высокатэхналагічным абсталяваннем. Як праінфармаваў міністра **начальнік упраўлення аховы здароўя Магілёўскай вобласці Аляксандр СТАРАВОЙТАЎ,** на тэрыторыі бальніцы прапануецца пачаць будаўніцтва і кардыятэрапеўтычнага корпуса з дыспансерным аддзяленнем.

Алена КРАВЕЦ.

Надвор'е

Паўднёвы вецер — і бывай, зіма?

Пасля моцных маразоў на тэрыторыю краіны прыйшла студзеньская адліга

Радуйцеся, мы з вамі становімся сведкамі вялікай пагоднай «перабудовы» ў атмасферы.

А справа вось у чым. Маразы, якія занесла да нас з «порцыяй» халоднага паветра з паверхні Паўночнага Ледавітага акіяна, трымаліся амаль тыдзень. Але ўжо ў сераду-чацвер вятры змяніліся на паўднёвыя і адразу ж запахла вясной. У атмасферы над нашай краінай пачалі пераважаць патокі ўжо з Атлантычнага акіяна, а істотнае цяпло ў найбліжэйшы час распаўсюдзіцца на ўсю тэрыторыю краіны, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У Беларусі да канца тыдня будзе досыць цёплае для студзеня надвор'е.

Сёння ўдзень умовы надвор'я ў краіне будзе вызначаць цёплая паветраная маса атлантычнага паходжання. Пераважна без ападкаў. Месцамі прагназуюцца туман і слабы галалёд. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ад 1 марозу да 4 цяпла.

І ў суботу захаваецца ўплыў цёплай вільготнай паветранай масы. Месцамі па краіне пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах чакаюцца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёвы парывісты. Уначы будзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла, удзень — ад нуля да плюс 5 градусаў, па Брэсцкай вобласці месцамі — да 7 цяпла.

У нядзелю адліга працягнецца. У гэты дзень на тэрыторыю краіны перамесціцца франтальны раздзел з Карпат і прынясе ўначы пераважна ў паўднёва-заходніх раёнах, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, які па захадзе будзе пераходзіць у мокры снег. У асобных раёнах чакаюцца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёвы парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла, удзень будзе ад нуля да плюс 5 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Жыллёвая палітыка

З МЕГАПОЛІСА Ў МАЛЫ ГАРАДОК

Перспектыва будаваць жыллё без чаргі ў малых гарадах і вёсках стане для мінчан альтэрнатывай гарадам-спадарожнікам і стымулам для развіцця сельскіх тэрыторый

Аб гэтым паведаміў старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама Аляксей БЫКАЎ на прэс-канферэнцыі «Будаўніцтва аб'ектаў сацыяльнага прызначэння ў Мінску і Мінскай вобласці: рэалізаваныя планы і перспектыўныя кірункі».

Каментуючы ініцыятыву, сутнасць якой у тым, каб людзям, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, без чаргі прапаноўваць жыллё ў малых гарадах і вёсках (прынцып зваротнай міграцыі насельніцтва ў малыя і сярэднія гарады з абласных цэнтраў і сталіцы), Аляксей Быкаў адзначыў, што пакуль толькі распрацаваны праект нарматыўнага прававога акта аб змяненні заканадаўства ў частцы дзяржаўнай падтрымкі такіх чаргавікоў. Сам механізм па ўжыванні льготнага будаўніцтва пры такой міграцыі яшчэ выпрацоўваецца.

«Сем'і без кватэр і проста чаргавікоў будуць інфармаваць аб наяўнасці кватэр у такіх населеных пунктах. Калі яны захочуць, змогуць пераехаць. У нас ёсць населеныя пункты, што дазваляюць прымаць у жылыя дамы, якія будуюцца, чаргавікоў са сталіцы. Гэта можа быць выкарыстана як альтэрнатыўны для гарадоў-спадарожнікаў варыянт. А таксама стане яшчэ адным стымулам для развіцця сельскіх тэрыторый. Але зразумела, што, акрамя жылля, людзям патрэбна работа. Наколькі новы кірунак будзе запатрабаваны, пакажа час. У гэтым кірунку і будзем рухацца», — сказаў Аляксей Быкаў.

Як заявіў напярэдадні **міністр архітэктуры і будаўніцтва Руслан ПАРХАМОВІЧ** на прэс-прэзентацыі асноўных кірункаў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады, прычына дадзенай ініцыятывы банальная: чым большы горад, тым большая чарга тых, хто мае адпаведную патрэбу, у той час як у невялікім населеным пункце шанцы пабудавацца за найбліжэйшыя пару гадоў значна вышэйшыя. Пры гэтым права на атрыманне дзяржпадтрымкі чаргавікоў будзе захавана ў абавязковым парадку.

Аляксей Быкаў адзначыў, што сёлета ў сталічным рэгіёне будзе пабудавана некалькі агульнаадукацыйных школ і тры дзіцячыя садкі, плавальны басейн і паліклініка.

Пералічыўшы ўведзеныя ў 2020 годзе аб'екты, Аляксей Быкаў дадаў, што сацыяльная накіраванасць захаваецца ў інвестыцыйнай праграме і на гэты год. Па аб'ёме сродкаў — каля 120 млн рублёў — яна засталася амаль на тым жа ўзроўні, што і годам раней (трохі скарочана).

Вядуцца будаўнічыя работы з уводам у эксплуатацыю ў 2021 годзе двух дзіцячых садкоў — у Калодзішчах-2 (палігон) Мінскага раёна, у Дружным (Пухавіцкі раён). Плануецца ўвод сярэдніх школ у Смалявічах і Стоўбцах, а дзіцячы садок — пачатковую школу ўвядуць у эксплуатацыю ў Маладзечне.

Нарэшце будзе здадзены доўгачаканы для жыхароў Жодзіна аб'ект — дзіцячая паліклініка. Другая чарга — дзіцячы шматпрофільны корпус у Барысаве. У бягучым годзе пачнецца будаўніцтва паліклінічнага корпуса Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы магутнасцю 800 наведванняў у змену — у вёсцы Бараўляны (Мінскі раён). На стадыі завяршэння праектныя работы па ўзвядзенні паліклінік у Смалявічах і вёсцы Азярцо Мінскага раёна.

У канцы мінулага года пачата будаўніцтва ФАК з плавальным басейнам у Старых Дарогах, плануецца завяршыць першую чаргу гэтага аб'екта да канца 2021-га.

«У цэлым у рамках распараджэння кіраўніка дзяржавы ў найбліжэйшыя гады плануецца ўзвесці 11 аб'ектаў: чатыры дзіцячыя садкі, тры школы, тры фізкультурныя аб'екты і адну паліклініку. Рэалізацыю мы пачалі ў 2020 годзе, асноўныя аб'екты павінны завяршыць да канца бягучага года, усе работы — у 2022-м», — падсумаваў Аляксей Быкаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Здарэнні

МАШЫНА ПРАВАЛІЛАСЯ Ў ВОЗЕРА

Амаль у пяць гадзін вечара ў службу ратавання па тэлефоне «101» паступіла паведамленне ад відавочцы аб тым, што ў Калінкавічах па вуліцы Міра ў возера праваліўся легкавы аўтамабіль, самастойна выбрацца не можа.

Як паведамляе МНС, пасля прыбыцця да месца выкліку ратавальнікаў было ўстаноўлена, што мужчына 1983 года нараджэння на аўтамабілі «УАЗ-469» праваліўся пад лёд часткова высахлага возера і захрас. Работнікамі МНС з выкарыстаннем буксіровачнага троса і тэхнікі «Амкадор 342С4» КУП «Камунальнік Калінкавіцкі» аўтамабіль быў выцягнуты. Пацярпелых няма.

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота з сайта МНС.

Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аховe здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы выказвае глыбокае спачуванне намесніку начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, экспертызы, зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб — начальніку ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Мігаль Таццяне Фёдараўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае шчырыя спачуванні намесніку міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандру Васілевічу Гарошку ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ. Падзяляем ваш смутак.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Байдэн падпісаў 15 указаў, якія адмяняюць рашэнні Трампа

Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн пасля інаўгурацыі адмяніў шэраг рашэнняў свайго папярэдніка Дональда Трампа. Ён мае намер вярнуць ЗША ў Парыжскае пагадненне па клімаце і Сусветную арганізацыю аховы здароўя, спыніць будаўніцтва сцяны на мяжы з Мексікай і трубаправода на мяжы з Канадай. Байдэн падпісаў указ аб паўсюдным нашэнні масак на працягу 100 дзён і абавязаў федэральныя ўстановы забяспечыць на сваіх тэрыторыях захаванне масачнага рэжыму і сацыяльнай дыстанцыі. Таксама новы гаспадар Белага дома абвясціў 20 студзеня нацыянальным днём адзінства, адпаведная заява апублікавана на сайце Белага дома.

Пры атацы тэрарыстаў-смяротнікаў у Багдадзе загінула 32 чалавекі

Два выбухі былі здзейсненыя тэрарыстамі-смяротнікамі ў Багдадзе, паведаміла Associated press са спасылкай на мясцовую паліцыю. Міністэрства аховы здароўя Ірака паведаміла аб 32 ахвярах. Па інфармацыі канала, тэрарысты прывялі ў дзеянне выбуховыя прылады на ажыўленым гандлёвым рынку на плошчы Таяран. Ён размешчаны паблізу плошчы Тахрыр у цэнтры іракскай сталіцы. Associated press адзначыла, што ўжо некалькі гадоў у цэнтры Багдада не было падобных нападаў смяротнікаў, але ў апошнія месяцы іншыя рэгіёны Ірака станавіліся мішэнню тэрарыстаў «Ісламскай дзяржавы». Як вядома, у кастрычніку ў краіне павінны прайсці выбары.

Капітал заснавальніка Alibaba вырас на $1,4 млрд пасля яго з'яўлення на публіцы

Напярэдадні Джэк Ма паказаўся на публіцы ўпершыню з кастрычніка. Па даных рэйтынга Forbes Real-Time, які абнаўляецца ў рэжыме рэальнага часу, яго капітал адразу павялічыўся да 62 мільярдаў долараў. У апублікаваным відэа заснавальнік Alibaba заклікаў падтрымліваць кітайскіх педагогаў і сістэму адукацыі. Прадстаўнік дабрачыннага фонду Джэка Ма ўдакладніў, што бізнесмен «узяў удзел у анлайн-цырымоніі» праграмы ў падтрымку вясковых настаўнікаў Паднябеснай, якую ён праводзіць штогод. Як адзначае агенцтва Bloomberg, кароткага з'яўлення Ма ў відэаканферэнцыі было дастаткова, каб інвестары «ўздыхнулі з палёгкай»: рынкавы кошт Alibaba Group вырас на $58 млрд.

Мір, суверэнітэт, сацыяльны характар дзяржавы і высокія тэхналогіі

ГОД НАРОДНАГА АДЗІНСТВА І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ

Аляксей ДЗЕРМАНТ: Год народнага адзінства — гэта нагода звярнуцца да тэмы нацыянальнай

ідэі, без якой немагчыма ўявіць адзінства нацыі. Яе звычайна аб'ядноўвае ўяўленне аб мінулым, аб сучасным свеце, вобраз будучыні... Часам кажуць: маўляў, нацыянальная ідэя — паняцце састарэлае, бо сучасны свет фрагментарны. Ён жыве дамовамі паміж грамадзянамі, і няма аднаго вызначанага шляху для краіны. Але гэта наіўнае мысленне. Кірунак развіцця заўсёды ёсць, яго вызначаюць палітычныя эліты, інстытуцыі ў выглядзе «фабрыкі думак», ён папулярызуецца СМІ і падхопліваецца палітыкамі.

Пастаноўка пытання пра нацыянальную ідэю актуальная, сучасная. Гэты год павінен быць выкарыстаны для пошуку адказаў на выклікі і ідэі, якая яднае. Неабходныя дыскусіі, кнігі, даклады, пастаянная прысутнасць у інфармацыйнай прасторы прапаноў з боку дзяржавы. Бо апаненты ўлады заўсёды прапануюць нейкія мадэлі.

Я разглядаю гэты год як аснову пачатку агульнанацыянальнай дыскусіі з актыўнай роляй у ёй прадзяржаўных грамадскіх арганізацый, партый, якія прасоўваюць свае прапановы вобраза будучыні. У выніку абмеркавання павінна стварыцца агульная канцэпцыя і праект.

Нацыянальная ідэя беларусаў даволі нетыповая, звязана са спецыфікай нацыі. Ідэнтычнасць большасці беларусаў складвалася вакол пытанняў мовы, старажытнай гісторыі, а не вакол пытання адштурхоўвання ад магутнага суседа, якім з'яўляецца Расія. Амаль усе нашы суседзі ішлі іншым шляхам — паглыблення ў этнічнае, у карані, гіпертрафіраванай увагі нацыянальнай мове, у іх ідэалогіі пануе ўяўленне, што чым далей адштурхнуцца ад Расіі і пайсці на Захад, тым лепш будзе для народа. Розныя прыклады паказваюць, што гэта прыводзіць да нацыянальных канфліктаў, напружанасці ў грамадстве, што бачна ў краінах Балтыі, ва Украіне.

Наша нацыянальная ідэя іншая, на мой погляд, яна заключаецца ў жаданні быць гаспадарамі на сваёй зямлі, самастойна вызначаць свой лёс, каб не было нейкіх абраных колаў, а ўсе былі роўныя. То-бок ад пачатку беларускі нацыянальны рух быў звязаны з сацыяльнымі ідэямі. Яны застаюцца і сёння нацыянальным стрыжнем. Такую сацыяльнасць, мне здаецца, і варта класці ў падмурак нашай нацыянальнай ідэі. Мы не пайшлі бяздумна на Захад, а прытрымліваемся сваёй лініі. Мы накіраваны на інтэграцыю з еўразійскай прасторай. Гэты выбар таксама трэба класці ў падмурак нацыянальнай ідэі. Мы з'яўляемся краінай на памежжы, таму варта разглядаць прыкметай нацыянальнай ідэі імкненне да міру, згоды, суіснавання заходняй і ўсходняй цывілізацый.

Аляксандр ШПАКОЎСКІ: Відавочна, што няпросты час патрабуе ад інтэлектуальных колаў Беларусі актывізацыі работы ў кірунку ства-

рэння сэнсаў, якія могуць стаць асновай для новай формулы нацыянальнага кансэнсусу. Гэта формула з'яўляецца неабходнай умовай для далейшага суверэннага развіцця нашай дзяржавы.

Сацыяльна-эканамічны і палітычны крызіс ва ўсім свеце, які быў запушчаны пандэміяй каранавіруса, на жаль, не абмінуў і Беларусь. Нашу краіну, што чарговы раз выбрала самастойны шлях і адмовілася ад самагубства эканамічнага лакдаўну, паспрабавалі пахіснуць палітычна. Агрэсіўная кампанія знешняга ціску падчас прэзідэнцкіх выбараў і пасля абвяшчэння рэзультатаў, спробы арганізацыі «каляровай рэвалюцыі» негатыўна адбіліся на стане беларускага грамадства. Многія грамадзяне апынуліся ў дэзарыентаваным становішчы, таму, сутыкнуўшыся з па-майстэрску падрыхтаванай хлуснёй, выступілі супраць сваёй дзяржавы, а фактычна супраць уласнай будучыні.

Кіраўніцтву Беларусі, у адрозненне ад многіх іншых дзяржаў, што сталі ахвярамі падобных аперацый, удалося ўтрымаць сітуацыю пад кантролем, захаваць канстытуцыйны лад. Але нанесеныя беларускаму грамадству траўмы трэба лячыць, неабходна разбірацца не толькі з замежным уплывам, але і з унутранымі памылкамі, што дазволілі варожай да Беларусі прапагандзе так лёгка завалодаць свядомасцю многіх грамадзян, асабліва моладзі.

Менавіта з гэтай нагоды кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў сваёй навагодняй прамове аб'явіў 2021-ы Годам народнага адзінства. Гэта значыць, што Беларусі не патрэбна «паляванне на ведзьмаў», як тое было ў ЗША ў 50-х гадах XX стагоддзя. Хутчэй інтарэсы нашай краіны патрабуюць аналізу грамадства, пошуку шляхоў дыялогу ў прававым полі, правядзення рэформаў, але, перш за ўсё тых, што будуць накіраваны на ўмацаванне, а не разбурэнне беларускай дзяржавы.

Андрэй КАРОЛЬ: Сёння глабальныя працэсы постындустрыяльнага свету вядуць да паскоранага тэмпу жыцця, страты ўнутранай прасторы, сэнсаў чалавека.

Наступствам гэтага з'яўляецца павышэнне ступені аднастайнасці і аднолькавасці людзей у грамадстве, фарміраванне масавага («аднолькавага») чалавека. Такі чалавек схільны да ўплыву меркаванняў іншых людзей, перавагі ў яго свядомасці знешніх фактараў над унутранымі, ён становіцца больш маніпулятыўным і менш крытычны ва ўспрыманні з'яў навакольнага свету. А «сэнсы» заключаюцца менавіта ў разнароднасці — разнароднасці дзяржаў і грамадстваў, людзей. І таму роля Года народнага адзінства складаецца ў здабыцці сэнсаў, у першую чаргу — унутраных сэнсаў беларускага грамадства.

Вадзім ГІГІН: Увогуле, нацыянальная ідэя як з'ява магчыма толькі пры наяўнасці яе ўспрымання ўсёй нацыяй альбо пераважнай большасцю. Інакш цяжка казаць пра сапраўднасць такой ідэі. Што датычыцца народнага адзінства,

то гэта яшчэ не нацыянальная ідэя. Тут не варта блытаць два паняцці. Разам з тым, сама такая прапанова — абвясціць Год народнага адзінства — вельмі своечасовая. У нас склалася свая традыцыя з назвамі гадоў. На мой погляд, не ўсе яны былі ўдалыя. А зараз — проста трапілі ў дзясятку! Мінулы год быў вельмі цяжкі. Грамадства стамілася, завіравала. Падзел прыйшоў у калектывы, сем'і. У пэўны момант мы апынуліся літаральна ля мяжы грамадзянскай вайны. І трэба падкрэсліць годнасць нашага народа, бо мы гэту мяжу не перайшлі. Настаў час загаіць раны, дараваць адно аднаму, агледзецца і рухацца далей. Бо зараз такі час, калі не тое што нельга таўчыся на адным месцы, нават павольны рух — гэта адставанне. Пасля перамогі над каранавірусам, якой усе чакаюць, краіны свету пачнуць гонку за аднаўленне эканомікі, перадзел рынкаў. Нельга дапусціць, каб Беларусь апынулася сярод адстаючых.

Я зараз нават не казаў бы пра нацыянальную ідэю асобна. Столькі вакол гэтага паняцця валтузні і пустаслоўя. Калі мы дарэчы і не вельмі згадваем нацыянальную ідэю, то часам нават не разумеем, што гэта такое. І гутарка набывае прыкметы дыскусіі «пікейных камізэлек». І ўсё ж здаецца, што мы сапраўды набліжаемся да асэнсавання беларускай нацыянальнай ідэі. У гэтым рэчышчы вельмі ўдалым выглядае наш знакаміты слоган «Разам — за моцную і квітнеючую Беларусь!» Тут сапраўды можна заўважыць рысы ідэі, што аб'ядноўвае і натхняе нацыю. Моцная краіна, дзяржава здолее гарантаваць сваім грамадзянам годнае і бяспечнае жыццё, умовы для ўласнага развіцця, самарэалізацыі. Цяпер урад прапаноўвае новую мадэль узаемадзеяння з грамадствам — дзяржава-партнёр. Фактычна гэта эвалюцыя яшчэ аднаго вядомага беларускага палітычнага брэнда — «Дзяржава для народа».

ФІЛАСОФІЯ ЯДНАННЯ

Аляксей ДЗЕРМАНТ: Народнае адзінства не бывае абсалютам. Больш за 9 мільёнаў беларусаў не будуць трымацца адной думкі і падтрымліваць аднаго палітыка. Такога нідзе не бывае. Адзінства павінна існаваць у нейкім стратэгічным поглядзе.

То-бок ёсць разуменне ў эліт, якія прымаюць рашэнне ў дзяржаве. Эліты выбіраюцца з народа, яны яго частка. Вакол гэтага маналіту павінна адбывацца дыскусія аб прапанаваных варыянтах шляхоў. Нават з гэтай дыскусіі можа стварацца адзінства. Далей для адзінства павінна быць заснавана грамадзянская падтрымка эліты. Так мы зможам збудаваць супольнасць народа, больш-менш адзінага ў сваіх мэтах, сэнсах.

Натуральна, што заўсёды будзе існаваць апазіцыя, якая кардынальна не згодная з магістральным кірункам і можа намагацца яго абвергнуць. З такімі апанентамі, калі яны адэкватныя і нерадыкальныя, магчыма ўключацца ў дыскусію, іх выслухоўваць карысныя парады.

Адзінства нараджаецца ў канцэптуальным сэнсе з існавання ў грамадстве нейкага ўяўлення пра наш шлях, дыскусіі, да якой прыцягваюцца шырокія масы, гэта тлумачыцца простаму чалавеку з дапамогай інфармацыйных сродкаў. Я ўяўляю адзінства такім чынам. Галоўнае, каб людзі існавалі ў рамках нейкага кансэнсусу, калі ты з яго выпадаеш, задача дзяржавы — цябе падцягваць, падаваць руку. Важна мець мэтанакіраванае ядро, якое вядзе за сабой большасць і спрыяе адзінству.

Андрэй КАРОЛЬ: Сучасныя сацыяльныя праблемы сталі вынікам стэрэатыпнасці і шаблоннасці мыслення «аднолькавага» чалавека ў грамадстве. З педагагічнага пункту гледжання, прычыны хаваюцца ў інфармацыйным падыходзе ў адукацыі, калі інфармацыя як вопыт чалавецтва перадаецца ад «дасведчанага» настаўніка да вучня. І тады вучань вымушаны ў сваім адказе на «выхадзе» трансляваць тое, што яму дадзена на «ўваходзе». Але чалавек і свет вакол яго — не лінейны, а перадача — лінейная. Яна вядзе да стэрэатыпнасці ў мысленні, паводзінах і зносінах чалавека. І тут адбываецца падмена паняццяў «веданне» і «інфармацыя». Гэта не адно і тое ж. Інфармацыя — усеагульная, чужая, а веданне з'яўляецца выключна ўласным. Адукацыя — гэта не сума навук або вопыт, які перададзены чалавеку. Нельга перадаць веды або досвед — іх можна вырасціць знутры. Адукацыя чалавека павінна быць накіраваная на тое, што трэба чалавеку, — на выяўленне, раскрыццё і рэалізацыю яго патэнцыялу адпаведна яго місіі і прызначэнню.

У гэтай сувязі ўспамінаюцца словы Германа Гесэ: «Мудрасць, якую мудрэц спрабуе камусьці паведаміць, заўсёды гучыць як глупства». Чаму? Ці заўсёды тое, што нам даюць, мы бяром? Ці заўсёды тое, што мы ўзялі, становіцца па-сапраўднаму нашым? Ці не замяшчаем чужым сваю ўнутраную прастору — нашы сэнсы, інтэнцыі і пытанні? Такая перадача інфармацыі без уліку асобасных асаблівасцяў вучня вядзе да асноўнай праблемы ў адукацыі — адчужэння вучня ад перадаванага яму чужога кантэнту. Гэта цягне за сабой і страту матывацыі да навучання.

Здавалася б, якая сувязь гэтых тэзаў з заяўленай тэмай нашага абмеркавання. Самая непасрэдная. Паводле адной з вядомых сацыялагічных тэорый Габрыэля Тарда, гісторыя ёсць сутыкненне колаў перайманняў, калі кожны творчы чалавек акружаны людзьмі, якія перайманюць. Гэтыя колы сутыкаюцца, у выніку з'яўляюцца канфлікты, войны, катаклізмы. Такім чынам, чым вышэй на выхадзе любой ступені адукацыі шкала тых, якія пераймаюць і стэрэатыпных людзей, тым хутчэй будзе «ляцець гісторыя», аддаляючы нас ад унутранай прасторы нацыі — гістарычнай памяці. Нават вынікі сучаснай гуманітарнай навукі кажуць пра тое, што гісторыя як рух адмаўляе гістарычную памяць.

ЯК ЗРАБІЦЬ ГРАМАДСТВА АДЗІНЫМ?

Аляксей ДЗЕРМАНТ: Я прапанаваў бы серыю дыскусій, інфармацыйных нагод, мерапрыемстваў, звязаных з асэнсаваннем беларускіх каштоўнасцяў, вакол якіх гуртуюцца людзі. Каб каштоўнасці асэнсаваць, неабходна збіраць людзей з рознымі поглядамі. Сама практыка абмеркавання і давядзення свайго пункту гледжання ў дыскусіі — гэта важна. На мой погляд, неабходна моцна зацвердзіць дзяржаўную пазіцыю. Апошнія некалькі гадоў працягнутую апанентам руку ўспрынялі не як жэст добраахвотнай мэты, а як слабасць. Зараз мы павінны зрабіць крыху па-іншаму. Сцвярджаць, што нашы каштоўнасці, сімвалы, шлях — такі і такі. Мы на гэтым стаім, а вы, апаненты, калі можаце нешта дапоўніць і прапанаваць, — калі ласка. Калі так будзе адбывацца, тады зрушыцца справа і можна ўключаць розныя апазіцыйныя групы ў дыскусію. Гэта складаная справа, бо нямногія з іх гатовыя пайсці насустрач, адмовіцца ад радыкальных патрабаванняў, але такія людзі ёсць, і з імі неабходна працаваць. Прысутнічаць яны павінны і на Усебеларускім народным сходзе, магчыма,

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

у парламенце, каб была разнастайнасць поглядаў.

Самае важнае, што кожны звычайны грамадзянін можа зрабіць для гэтага адзінства, — не выяўляць варожыя памкненні да сваіх суайчыннікаў. У твайго суседа, калегі могуць быць іншыя погляды, але самая апошняя справа ціснуць на яго. Раскол, грамадзянскі канфлікт пачынаюцца не з сутычак паміж міліцыяй і пратэстуючымі, а калі ў адным двары людзі групуюцца па палітычных прыкметах. Прадухіліць гэта можна толькі, калі ў нашай свядомасці будзе: «Так, тыя іншыя, але мы не пераступаем мяжу закону. Ніякіх пагроз, гвалту». Гэта мінімальнае патрабаванне, з якога пачынаецца адзінства.

Андрэй КАРОЛЬ: Калі мы хочам фундаментальна, а не імгненна і павярхоўна вырашыць гэтае пытанне, трэба абапірацца на больш глыбокія канстанты. А гэта ў першую чаргу — адукацыя, якую часта называюць «мяккай сілай» у кіраванні любой дзяржавай. Сёння велізарны патэнцыял у эўрыстычнай тэхналогіі навучання. Яна накіравана на адкрыццё чалавекам сваіх уласных сэнсаў, вучыць глядзець на сябе з боку, ставіць пытанні, аналізаваць, параўноўваць, супастаўляць, бачыць свет і глядзець на сябе з розных бакоў, развіваць здольнасць унутранага дыялогу. Толькі навучыўшыся камунікаваць з самім сабой, можна навучыцца камунікаваць і з іншымі людзьмі і чуць адзін аднаго.

Сувязь паміж дыдактычнай сістэмай навучання, праблемай гістарычнай памяці і народнага адзінства вельмі глыбокая. Навучыўшы чалавека адкрываць самога сябе, мы адкрыем яго ўнутраную прастору і тым самым будзем садзейнічаць чутнасці і бачнасці адзін аднаго, аб'яднанню вакол свайго родавага дрэва, якое і стане крыніцай адзінства. Калі мы не адкрыем дзверцы да сябе, мы будзем бяздумна прытрымлівацца інстынктаў натоўпу. Таму сучасная адукацыя павінна быць накіравана не на перадачу сумы ведаў, уменняў і навыкаў, а на здабыццё чалавекам самога сябе.

Аляксандр ШПАКОЎСКІ: Вялікая агульнанацыянальная дыскусія па пытаннях будучага развіцця краіны, рэформы Канстытуцыі Беларусі, палітычнага будаўніцтва і сацыяльна-эканамічных прыярытэтаў разгорнецца на палях Усебеларускага народнага сходу, які запланаваны для правядзення 11—12 лютага гэтага года з удзелам 2700 дэлегатаў. Падаецца, што фундаментальнымі каштоўнасцямі, вакол якіх патрэбна будаваць нацыянальны кансэнсус, мусяць быць мір у грамадстве і суверэнітэт Беларусі. Гэтыя базавыя прынцыпы падзяляюцца большасцю грамадства і павінны быць дапоўнены іншымі ідэямі, мэтамі і ўстаноўкамі.

Аналізуючы прапановы да Усебеларускага народнага сходу, якія дасылаюць найбольш актыўныя грамадзяне, трэба адзначыць, што найважнейшым для людзей з'яўляецца пытанне захавання сацыяльнай ролі дзяржавы. Гэта характэрна не толькі для беларусаў сталага веку, але і для моладзі. Праблематыку рэалізацыі пенсійнай рэформы, дэкрэтнага водпуску, пашырэння практыкі выплаты сямейнага капіталу трэба вырашаць вельмі ўзважана, каб у пагоні за рынкавым эфектам, на чым настойваюць асобныя «рэфарматары», не пакрыўдзіць найбольш безабаронныя слаі грамадства.

Вадзім ГІГІН: Пытанне пра тое, як ажыццявіць мэту народнага адзінства, — сапраўды самае складанае. Мы бачым, што пакуль групоўкі з рознымі палітычнымі меркаваннямі досыць непрымірымыя. Нават тыя з ліку апанентаў улады, хто гатовы пайсці на дыялог, адразу пасля канкрэтных крокаў трапляюць пад шквал крытыкі і траўлі з боку сваіх больш радыкальных паплечнікаў. Тым не менш ёсць і пэўныя пазітыўныя зрухі. Напрыклад, нядаўні зварот кіраўнікоў асноўных рэлігійных канфесій нашай краіны. Вельмі важная роля персон, каго звычайна адносяць да маральных аўтарытэтаў. Паглядзіце, як развітвалася літаральна ўся краіна з ганаровым Патрыяршым Экзархам Філарэтам, што пайшоў ад нас. Прычым незалежна ад рэлігійнай прыналежнасці. Так, гэта сумная падзея, але яна прадэманстравала, што значыць асоба. Мітрапаліт Філарэт здолеў сваім жыццём, сваімі ўчынкамі набыць павагу ўсяго народа. Мы ведаем, што ён да апошняга маліўся аб дабрабыце нашага народа. Вось менавіта такія людзі, якія застаюцца сярод нас, павінны сказаць свае словы. Дзейсны мітрапаліт Веніямін заклікаў усіх да пакаяння, каб не дапусціць новага супрацьстаяння. Прычым дзейснага пакаяння — праз добрыя справы і выпраўленне няправільных дзеянняў. Упэўнены, што і без гэтага нельга абысціся, каб знайсці выхад з той сітуацыі, якая склалася. Тым больш што наперадзе ў нас шмат працы. Трэба ажыццяўляць канстытуцыйную рэформу і, нарэшце, далей будаваць эканоміку.

СУВЕРЭНІТЭТ І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ ЯК ІДЭІ ЗГУРТАВАНАСЦІ

Аляксей ДЗЕРМАНТ: Я думаю, што людзі збольшага ўжо асэнсавалі каштоўнасць паняццяў «суверэнітэт» і «незалежнасць». Па вялікім рахунку суверэнітэт — гэта магчымасць самастойна прымаць рашэнні аб сваім лёсе і шляху развіцця. Разважлівы чалавек разумее, што самастойна гэта зрабіць лепш, чым слухаць некага. З іншага боку, спрэчкі ідуць вакол таго, у якіх кантэкстах і саюзах нам лепш суверэнітэт рэалізаваць. Вось тут могуць быць сур'ёзныя разыходжанні, але таксама ёсць падстава для нейкага адзінства. Калі нехта лічыць, што суверэнітэт у нас на Захадзе закапаны, хай тады працуе, каб не было санкцый і былі больш разнастайныя кантакты з гэтымі краінамі. А тым, хто мяркуе, што Расія нам бліжэй, трэба з ёй больш актыўна дзейнічаць.

Аляксандр ШПАКОЎСКІ: Асобнае пытанне — міжнароднае становішча, роля Беларусі ў свеце, дзе ўсё большую моц набывае геапалітычная барацьба, калі некаторым заакіянскім гульцам надта карціць вярнуць планету да аднапалярнага парадку. Беларусь, якая мае стратэгічнае значэнне ў сістэме абароны Расіі, заўжды будзе ў полі зроку праціўнікаў Масквы, і на правакацыю розных «зменаў» у нашай краіне ўжо не першы раз накіроўваюцца сур'ёзныя інтэлектуальныя, тэхнічныя і матэрыяльныя рэсурсы.

У гэтых умовах Мінску трэба ўмацоўваць еўразійскую інтэграцыю, Саюзную дзяржаву з Расіяй, але так, каб у гэтым працэсе не забыцца пра свае ўласныя інтарэсы, бо часам буйны расійскі капітал паводзіць сябе як слон у пасуднай краме ва ўласнай краіне, не кажучы ўжо пра СНД і Беларусь у тым ліку.

Навукова-тэхнічны прагрэс, маштабныя праекты развіцця, такія як Беларуская АЭС, развіццё электранспарту могуць не толькі забяспечыць імпульс, неабходны для рыўка айчыннай эканомікі, але і стаць фактарам яднання грамадства вакол ідэі маладой высокатэхналагічнай Беларусі будучыні.

Калі размова ідзе аб новым грамадскім дагаворы, то патрэбна адзначыць, што мір, суверэнітэт, сацыяльны характар дзяржавы і высокія тэхналогіі — неблагі падмурак для дыскусіі аб будучыні Рэспублікі Беларусь у Год народнага адзінства.

Марыя ДАДАЛКА.

Слова — удзельнікам

«Нам патрэбны новыя падыходы ў грамадзянска-патрыятычным і маральным выхаванні моладзі»

Квасоўская сярэдняя школа Гродзенскага раёна — адна з нямногіх школ у краіне, дзе навучанне вядзецца на беларускай мове. І такі падыход тут захоўваецца ўсе 95 гадоў, колькі існуе сама школа. Алег ХРЫПТОВІЧ вось ужо 15 гадоў узначальвае Квасоўскую сярэднюю школу. Рашэннем сесіі Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў ён абраны дэлегатам на VI Усебеларускі народны сход.

Алег Каліставіч паведаміў, што для яго як дэпутата абласнога Савета і педагога вельмі пачэсна і разам з тым адказна ўпершыню браць удзел у такім важным мерапрыемстве, як Усебеларускі сход. Народны форум, што праходзіць раз у пяць гадоў, заўсёды быў пунктам новага адліку. Менавіта тут краіна вызначае праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку. Сёлетні сход стане яшчэ больш эпахальным, бо на ім будуць разгледжаны і важныя грамадска-палітычныя пытанні, у тым ліку канстытуцыйнае будаўніцтва, лічыць дэлегат.

Важнай перадумовай для правядзення сходу сталі дыялогавыя пляцоўкі. Алег Каліставіч як іх удзельнік заўважыў, што там абмеркавана нямала актуальных прапаноў, якія таксама знойдуць сваё выражэнне падчас работы сходу. Нямала слушных заўваг паступае ад жыхароў падчас прамых ліній і прыёму грамадзян. Агучаныя пытанні, упэўнены гродзенскі дэпутат, не застануцца па-за ўвагай форуму. Яны будуць улічаны і акумуляваны ў рэзалюцыі Усебеларускага народнага сходу.

— Наколькі мне вядома, у арганізацыйны камітэт ужо паступіла 17 тысяч прапаноў ад жыхароў Беларусі. Гэта пытанні як мясцовай праблематыкі, так і агульнадзяржаўнага ўзроўню. Сярод іх ёсць і такія, што патрабуюць змен у кіраванні і самакіраванні краіны, Выбарчага кодэкса, размеркавання паўнамоцтваў паміж структурамі ўлады, — адзначыў дэлегат.

На думку Алега Хрыптовіча, дыялог павінен быць цікавы і мусіць адпавядаць часу. Пачаўся новы год пяцігодкі, перад краінай стаіць задача выпрацаваць сучасныя, эфектыўныя, сапраўды дзейсныя механізмы, якія будуць спрыяць эканамічнаму росту. Таму перад удзельнікамі сходу стаіць у тым ліку і задача выпрацаваць курс на пераадоленне праблем і крызісаў, каб падтрымаць дабрабыт нашых грамадзян, палепшыць якасць іх жыцця.

— Як кіраўніка ўстановы адукацыі і педагога мяне хвалююць пытанні далейшага ўдасканалення сістэмы адукацыі, — падкрэсліў суразмоўца. — А гэта і замацаванне ў Канстытуцыі краіны права на агульную сярэднюю адукацыю, зацвярджэнне і ўступленне ў дзеянне абноўленага Кодэкса аб адукацыі, выпрацоўка эфектыўнай сістэмы аплаты працы педагагічных работнікаў, змяненні па пытаннях выніковай атэстацыі вучняў і ўступнай кампаніі. Таксама варта перагледзець падыходы да грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі.

Чаму так важна звярнуць увагу на сістэму адукацыі? — задаецца пытаннем дэлегат. На яго думку, гэта зразумела, бо гаворка ідзе пра будучае пакаленне. Разам з тым школа — не толькі месца, дзе можна атрымаць адукацыю. Гэта свет штодзённага адкрыцця, зносін з аднагодкамі, магчымасць рэалізаваць свае здольнасці і захапленні. Для настаўнікаў гэта не проста работа, а цэлае жыццё. Саюзам прафесіяналаў называе свой педагагічны калектыў дырэктар Квасоўскай школы.

— Вось ужо 95 гадоў наша беларускамоўная школа кожны дзень гасцінна расчыняе свае дзверы. Мы ганарымся добрай матэрыяльна-тэхнічнай базай, навучальнымі, спартыўнымі і творчымі дасягненнямі сваіх вучняў і педагогаў. Школа наладзіла цесныя сувязі з усімі аб'ектамі соцыуму, адчувае важкую падтрымку з боку вытворчага кааператыва імя В. І. Крамко. Таксама радуе, што ўмацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў адукацыі ўсяго Гродзенскага раёна. За апошнюю пяцігодку ў яе развіццё ўкладзена больш як сем мільёнаў рублёў, — паведаміў Алег Хрыптовіч.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота з сайта Квасоўскай сярэдняй школы.

«Горадаўтваральныя прадпрыемствы ў райцэнтрах трэба падтрымліваць і развіваць»

Юрый ВІТРУК узначальвае адно з найстарэйшых горадаўтваральных прадпрыемстваў раёна — ААТ «Маларыцкі кансерваваагароднінасушыльны камбінат». Першая прадукцыя сышла з канвеера названага прадпрыемства ў далёкім 1955 годзе. Сёння тут выпускаюць больш за 180 найменняў прадукцыі, з якіх каля 150 — сокі, нектары, пюрэ для дзяцей пад маркай «Таптунок».

На прадпрыемстве наладжаны поўны цыкл вытворчасці: ад перапрацоўкі сыравіны да выпуску гатовай прадукцыі. Штогод на камбінаце нарыхтоўваюць і захоўваюць да 3000 тон сыравіны ў выглядзе натуральнага пюрэ-паўфабрыкату, што дазваляе выпускаць шырокі асартымент прадукцыі на працягу года.

Маларыцкія дзіцячыя сокі і пюрэ ў 250-грамовых слоічках памятаюць мамы, якія ў 80-90-я гады мінулага стагоддзя гадавалі дзяцей. З той пары вытворцы карыснай прадукцыі правялі некалькі этапаў мадэрнізацыі. Першыя маштабныя інвестыцыі былі ўкладзеныя ў рэканструкцыю ў 2005-м. Тады сушыльны цэх поўнасцю перавялі на новыя рэйкі. Сушаная бульба, якую выпускалі раней, перастала быць актуальнай на рынку, а вялікі цэх поўнасцю перапрафілявалі пад кансервы для дзіцячага харчавання ў так званым еўраслоіку. Паставілі найноўшае для таго часу абсталяванне, укаранілі перадавыя тэхналогіі.

Пяць гадоў таму камбінат асвоіў выпуск дзіцячага харчавання ў гнуткай упакоўцы з камбінаваных матэрыялаў. Асвоіў, дарэчы, першы ў краіне. Тады 23 працэнты сродкаў на мадэрнізацыю выдзеліў канцэрн «Белдзяржхарчпрам», 28 працэнтаў — Брэсцкі аблвыканкам, астатнія 49 працэнтаў склалі крэдыты. Зараз рыхтуюцца дакументы для чарговага этапу мадэрнізацыі з падтрымкай «Белдзяржхарчпрама». Будзе набыта абсталяванне для яшчэ адной лініі па разліве сокаў у гнуткую ўпакоўку.

— Такія ўкладанні сябе апраўдваюць, — лічыць Юрый Вітрук. — Летась прадпрыемства адгрузіла на экспарт прадукцыі на 6,2 мільёна долараў, што складае 113,1 працэнта ад узроўню папярэдняга года. Лічу, што дзяржава павінна і надалей падтрымліваць горадаўтваральныя прадпрыемствы раёнаў, і не толькі тыя, што выпускаюць сацыяльна значную прадукцыю, як у нашым выпадку. Наш камбінат сёння — гэта калектыў у дзве сотні чалавек, якія маюць прыстойную зарплату і такі ж сацпакет. Для невялікай Маларыты апошняе з'яўляецца важным фактарам. Нашы людзі цэняць сваё прадпрыемства, трымаюцца за рабочае месца, стараюцца працаваць добра, бо бачаць перспектыву як для сябе, так і для вытворчасці. Усё ўзаемазвязана.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Маларыцкі раён.

Фота БелТА.

Пераемнасць важная ва ўсіх справах

— Алена Леанідаўна, вы ў верасні мінулага года сталі старшынёй Беларускага саюза жанчын, скажыце, што азначае асабіста для вас гэты новы від дзейнасці?

— Перш за ўсё адказнасць. Так атрымалася, што я ўсё жыццё працую ў сістэме аховы здароўя. Пачынала інтэрнам у Мінскай абласной дзіцячай бальніцы, потым стала ўрачом прыёмнага аддзялення. І ўжо з пасады намесніка галоўнага ўрача сыходзіла ў аддзел медыцынскай дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя. Усё маё працоўнае жыццё звязана з аховай здароўя. Грамадскай работай я не займалася, і калі пяць гадоў таму Мар'яна Шчоткіна запрасіла мяне ў БСЖ і расказала, што гэта такое, я зацікавілася і прыклала нават некаторыя намаганні, каб у нашых паліклініках і бальніцах з'явіліся пярвічныя аддзяленні БСЖ. З таго часу мы правялі мноства цікавых праектаў. Сярод іх мне падабаецца штогадовы праект, калі ў Чарнобыльскі рэгіён выязджае комплексная брыгада аховы здароўя, каб абследаваць жанчын гэтай мясцовасці. Мы прывозім туды спецыялістаў рэспубліканскага ўзроўню: дацэнтаў, прафесараў, кандыдатаў навук, дактароў навук... Быў яшчэ праект РНПЦ экалогіі чалавека па скрынінгу раку шыйкі маткі. Праект рэалізоўвалі сумесна з Ротары-клубам у Беларусі і іспанскімі партнёрамі. У рамках праекта было закуплена абсталяванне, навучаны спецыялісты і наладжана сістэма скрынінгу. Цяпер вынікамі гэтага праекта карыстаецца ўся сістэма аховы здароўя Беларусі. Калі гаварыць пра БСЖ у цэлым, то многія пачынанні, святы і акцыі, якія ўспрымаюцца сёння як рэспубліканскія, прыдумалі актывісты БСЖ. Мне хочацца не страціць тое, што ёсць у арганізацыі, і прыдумаць не менш значныя праекты.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Прэса шмат піша пра акцыі вашай арганізацыі, а як людзям патрапіць у шэрагі БСЖ?

— Каб трапіць у нашу арганізацыю, перш за ўсё трэба быць самімі сабой і неабыякавымі да таго, што адбываецца навокал. Мы адкрытыя для тых, хто хоча зрабіць нешта добрае для краіны і людзей, якія ў ёй жывуць. На сённяшні дзень у арганізацыі каля 144 тысяч чалавек. У нас ствараюцца пярвічныя арганізацыі ў розных установах, міністэрствах, ведамствах. Калі хтосьці зацікавіўся, можна зайсці на сайт БСЖ і звярнуцца па ўказаных там тэлефонах. Мы будзем вельмі рады, калі нашы шэрагі папоўняцца нераўнадушнымі і актыўнымі людзьмі.

— Вы таксама з'яўляецеся і першым намеснікам міністра па ахове здароўя. Як атрымліваецца сумяшчаць гэтыя дзве пасады? Ёсць жа і сям'я, якой трэба ўдзяліць час...

—Так, у мяне дружная і моцная сям'я, дома ведаюць, што маці шмат працуе *(смяецца)*. На самай справе ў мяне ўжо дарослыя дзеці, таму сям'я не патрабуе вельмі шмат увагі. Прызнаюся, што раней, калі я прачыналася, думала, што яшчэ можна зрабіць у міністэрстве. Сёння ў мяне з'явілася яшчэ і грамадская нагрузка. Гэта вялікая адказнасць — працаваць побач з энтузіястамі, бо ў нас толькі некалькі чалавек атрымлівае за сваю работу невялікія грошы, астатнія — проста грамадскія актывісты. Самая галоўная задача — захаваць тых, хто сёння з намі, і прыцягнуць у нашу каманду людзей, якія дакладна змогуць рабіць тое, што трэба. Упэўнена, што без каманды аднадумцаў і выразна выбудаванай вертыкалі працаваць будзе складана. На маю грамадскую дзейнасць у БСЖ, вядома, уплывае мой досвед работы ў органах дзяржкіравання, калі ёсць добра выбудаваная іерархія, праходжанне дакументаў, справаздачнасць і кантроль. Вось з гэтым падыходам я стараюся працаваць і ў БСЖ.

«Мне хочацца не страціць тое, што ёсць у арганізацыі, і прыдумаць не менш значныя праекты».

— А вы не баіцеся, што з такім падыходам БСЖ ператворыцца ў чэрствую чыноўніцкую структуру?

— Я не згодная, што чыноўнік чэрствы. Калі чалавек становіцца бяздушным, яму няма чаго рабіць у дзяржапараце. Мы тут для таго, каб вырашаць задачы людзей, а не іншыя. Як і ў дзяржапараце, «каманда» ў БСЖ павінна даходзіць і да абласных, і да раённых узроўняў. Калі мы праводзім акцыю, то праводзім яе па ўсёй краіне, у кожным раённым цэнтры. Так і павінна быць. Тут няма бяздушнасці. Калі хтосьці прыдумаў

Фота БелТА.

цікавую акцыю, трэба пра яе расказаць, гэта своеасаблівая заява пра тое, хто наогул такія — жанчыны з БСЖ. Мы арыентуемся на ўсю краіну, і так нас пачуюць тыя, каму цікава тое, што мы робім. Магчыма, тады такія людзі далучацца да нашай арганізацыі.

Не сакрэт, што БСЖ ужо выгадаваў цэлую плеяду жаночых лідараў. У складзе арганізацыі ёсць міністры, парламентарыі, кіраўнікі розных узроўняў... У БСЖ ёсць кіруючы орган, праграма і мэты, а таксама вядзецца пэўная прапагандысцкая дзейнасць. Акрамя таго, актывісты БСЖ актыўна ўдзельнічаюць у палітычным жыцці краіны.

— Можа, БСЖ ужо неўзабаве стане палітычнай партыяй?

— Я перад сабой такой задачы не стаўлю. Грамадскае мы аб'яднанне або палітычная партыя... Выкананню таго, што запісана ў нашым мандаце, гэта абсалютна не перашкаджае. Сапраўды, члены нашай арганізацыі актыўна ўдзельнічалі ў палітычным жыцці краіны: удзельнічалі ў перадвыбарнай кампаніі як давераныя асобы, як члены выбарчых камісій, недзе нават як старшыні выбарчых камісій, удзельнічаем і ў мітынгах у падтрымку кіраўніка дзяржавы. Магчыма, мы і «вырасцем» да жаночай палітычнай партыі, але пакуль у нашай арганізацыі ёсць іншыя задачы, і галоўная з іх — прыцягнуць моладзь у нашы шэрагі.

— У вас ужо ёсць план, як гэта зрабіць?

— Ёсць. Ва ўсіх справах важная пераемнасць! Прасцей, калі за плячыма ёсць тыя, хто ўжо прайшоў нейкі шлях — з іх вопытам, жыццёвай, эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай мудрасцю. Нам ёсць, што сказаць маладым. Любы рух павінен быць паступальным, а не такім, дзе трэба ўсё разбурыць і будаваць нанава. Таму мы вельмі хочам прыцягнуць актыўную моладзь у нашы шэрагі і потым яе не страціць. Мы хочам зрабіць школу жаночага лідарства, і калі ўсё будзе добра, то хутка пачнём праект з Акадэміяй кіравання па падрыхтоўцы жанчын-лідараў.

— БСЖ вылучыла на Усебеларускі сход 135 дэлегатаў, у тым ліку вас. Скажыце, вы ўпершыню з'яўляецеся дэлегатам? Што для вас азначае стаць прадстаўніком на Усебеларускім народным сходзе?

— На самай справе ў нас не 135 дэлегатаў. Ёсць актывісты ў БСЖ, якіх вылучылі ў дэлегаты ад іншых арганізацый, напрыклад ад Белай Русі, нашы ёсць і сярод дэпутацкага корпусу, пачынаючы з дэпутатаў ад мясцовых Саветаў да Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў. Сама я ўпершыню з'яўляюся дэлегатам. Раней удзельнічала ў падрыхтоўцы УНС у арганізацыйным камітэце. Таму піетэт да мерапрыемства ў мяне ўжо ёсць. Асабіста для мяне быць дэлегатам — гэта непасрэдна ўплываць на Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Мы правялі дыялогавыя пляцоўкі, дзе імкнуліся агучыць праблемы, якія сёння ёсць. Мы сабралі інфармацыю, згрупавалі і выбралі 67 найбольш важных прапаноў, накіраваных на абарону сям'і, выхаванне патрыятызму моладзі, пашырэнне магчымасцяў пры працаўладкаванні і дапамозе людзям, якія прынялі рашэнне застацца жыць у вёсцы. Гэтыя прапановы могуць палепшыць сацыяльную палітыку дзяржавы. Калі ж мы аналізавалі Канстытуцыю, то прыйшлі да высновы, што істотных змяненняў у дачыненні да сацыяльнай абароны нашых грамадзян у дакумент уносіць не трэба. Таму што права на адукацыю, права на ахову здароўя, на культурную спадчыну і сацыяльныя правы, якія ёсць, шырэй прапісаць ужо немагчыма.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Навінкі

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ:

НАПЕРАДЗЕ — ВЕЧНАСЦЬ!..

«Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выдала персанальную энцыклапедыю «Уладзімір Караткевіч». Аддрукавана кніга ў 65, 45 улікова-выдавецкіх аркушаў тыражом 1000 экзэмпляраў на ААТ «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа».

Каля 1000 артыкулаў змешчана пад адной вокладкай. Ва ўступным артыкуле энцыклапедысты адзначаюць: «Энцыклапедыя — гэта першы крок, трывалая прыступка да стварэння паўнавартаснай шматтомнай персанальнай энцыклапедыі «Уладзімір Караткевіч». Некаторыя артыкулы могуць стаць тэмай для абароны кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, натхніць студэнтаў на напісанне курсавых работ. Настаўнікі знойдуць шмат карыснай інфармацыі для падрыхтоўкі ўрокаў, а вучні — дадатковы матэрыял для атрымання высокай адзнакі. На ніве караткевічазнаўства ёсць яшчэ да канца не распрацаваныя тэмы — гэта багатая глеба для маладых спецыялістаў». Такім чынам, выдаўцы сціпла заўважылі, што адзіны том, у якім сабрана ўсё ж неймаверна шмат інфармацыі пра жыццё і творчасць класіка беларускай літаратуры, — проста пачатак.

І ўсё ж зроблена вялікая, вартая станоўчых ацэнак справа. Нагадаем, што персанальных энцыклапедый не так і шмат увогуле. І зусім няшмат іх у гісторыі беларускага кнігадрукавання. Няма і паўстагоддзя, як такія выданні, дзякуючы «Беларускай Энцыклапедыі...», пачалі з'яўляцца на свет. У 1986 годзе выйшла адна-томная персанальная энцыклапедыя «Янка Купала». Параўнальна нядаўна — паўторнае выданне ў трох тамах. Ёсць персанальныя энцыклапедыі, прысвечаныя Францыску Скарыну і Максіму Багдановічу. І вось героем яшчэ адной персанальнай энцыклапедыі становіцца аўтар рамана «Каласы пад сярпом тваім», іншых неўміручых твораў і ўсё, што звязана з яго імем.

У чытача новага выдання (удзел у стварэнні апошняга ўзялі многія і многія дасведчаныя аўтары) з'явіцца віртуальная магчымасць адправіцца па розных адрасах, дзе жыў і дзе пісаў свае творы вялікі пісьменнік. Арэнбург («У Арэнбургу скончыў шосты клас», — з аўтабіяграфіі У. Караткевіча), Віцебск, Гродзеншчына, Далёкі Усход (плёнам уражанняў Караткевіча ад убачанага стала аповесць «Чазенія»), Друскінінкай, Дубултыі, Кіеў (у час вучобы ў Кіеўскім універсітэце Уладзімір зацікавіўся гісторыяй паўстання 1863—1864 гг.; актыўна займаўся навуковай работай, удзельнічаў у археалагічных раскопках, супрацоўнічаў з многімі музеямі, пісаў вершы), Крым, Кунгур (некаторы час знаходзіўся ў яго наваколлі ў дзіцячым доме ў Вялікую Айчынную вайну), Лесавічы (вёска ў Кіеўскай вобласці, дзе пасля заканчэння Кіеўскага ўніверсітэта пісьменнік працаваў настаўнікам), Масква, з якой Уладзіміра Сямёнавіча звязвала надзвычай шмат, Мір... Магчыма, што і не ўсе караткевічаўскія адрасы ўвайшлі ў энцыклапедыю, пра некаторыя гарады, паселішчы, мясціны напісана вельмі сцісла. І ўсё ж у гэтых згадках — сапраўдная караткевічаўская геаграфія, якая тлумачыць і характар многіх твораў.

Надзвычай захапляльнымі падаюцца артыкулы пра сяброў, блізкіх Караткевічу людзей: Адама Мальдзіса, Вячаслава Рагойшу, Таццяну Кабржыцкую, Рыгора Барадуліна, Сяргея Панізніка... Часам пра некаторых з сяброў, добрых знаёмых напісана коратка, зусім лаканічна. Але ж нельга не ўлічваць, што перад намі — энцыклапедычнае выданне, якое і патрабуе гэтай лаканічнасці. Асобна расказваецца пра творы класіка. Многія тэмы — пра гістарычныя падзеі, пэўныя мастацкія з'явы, віды мастацтва, жанры літаратуры ў дачыненні да творчасці У. Караткевіча: «Грунвальдская бітва», «Дакументальнае кіно», «Дэтэктыў», «Балада», «Неарамантызм», «Сатыра»... Шмат артыкулаў — пра мастакоў, акцёраў, рэжысёраў, з якімі сябраваў пісьменнік, што нараджалі творы пад уплывам яго раманаў, аповесцяў, вершаў, здымаліся ў фільмах па творах У. Караткевіча, ігралі ў спектаклях па яго п'есах.

«Уладзімір Караткевіч» — пачатак энцыклапедычнага асэнсавання жыцця і творчасці слаўнага сына нашай Бацькаўшчыны. Важна захаваць энергію, пашырыць ініцыятывы, якія спрыялі нараджэнню гэтага па-свойму ўнікальнага творчага, навукова-выдавецкага праекта. І ў такім разе ў энцыклапедыі «Уладзімір Караткевіч» абавязкова будзе працяг.

А што да новых ідэй, якія хацелася б бачыць рэалізаванымі ў рэчышчы стварэння персанальных энцыклапедый, то даўно наспела патрэба ў выданнях пра народных паэтаў Беларусі Якуба Коласа, Аркадзя Куляшова, пра Максіма Гарэцкага, Францішка Багушэвіча, іншых дзеячаў беларускай культуры, асветніцтва, беларускага прыгожага пісьменства.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

22 студзеня 2021 г. № 2 (587)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

У ФАРМАЦЕ АДКРЫТАГА ДЫЯЛОГУ

Правяла сустрэчу са студэнтамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава

ПЕРАДГІСТОРЫЯ гэтага мерапрыемства наступная. Паводле слоў спікера верхняй палаты парламента, адносна нядаўна на адной з яе сустрэч з моладдзю ад студэнтаў БДУ прагучала просьба арганізаваць для іх наведванне Савета Рэспублікі. Маладыя людзі выказалі жаданне на свае вочы ўбачыць, што ўяўляе сабой гэты дзяржаўны орган, чым ён займаецца і дзе знаходзіцца. Наталля КАЧАНАВА паабяцала, і вось праз пэўны тэрмін студэнты і магістранты БДУ былі запрошаны ў госці на Чырвонаармейскую, 9.

Сустрэлі іх гасцінна і ў нечым па-свойску: гаспадары наладзілі экскурсію па будынку Савета Рэспублікі, правялі па музейнай экспазіцыі, пачаставалі гарбатай з цукеркамі і печывам, сфатаграфаваліся разам на доўгую памяць. Студэнтам таксама растлумачылі як ажыццяўляецца заканатворчая дзейнасць парламентарыяў канкрэтна ў верхняй палаце парламента. Таксама госці пачулі пра асаблівасці работы Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе, пра тых, хто ўваходзіць у савет.

А потым быў больш чым трохгадзінны канструктыўны дыялог. Менавіта гэтак, бо як сказала Наталля Качанава, любая падобная сустрэча — гэта дыялогавая пляцоўка, дзе можна адказаць на пытанні, а самае важнае — даведацца, што хвалюе сёння маладых людзей, пачуць іх думкі. І яна іх пачула.

Пытанняў было вельмі шмат і на самыя розныя тэмы: пра эканоміку, а дакладней пра перспектывы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, пра Кодэкс аб адукацыі і верагодныя змяненні ў ім, пра барацьбу з пандэміяй і гэтак далей. А паколькі ў зале прысутнічалі студэнты журфака БДУ, то суразмоўцы даволі грунтоўна абмеркавалі асаблівасці дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі на сучасным этапе. Юнакі і дзяўчаты пыталіся і пра асабістае меркаванне і стаўленне Наталлі Качанавай да пэўных з'яў і падзей, грамадскіх праблем.

Яна ў размове з журналістамі потым адзначыла рознасць пытанняў студэнтаў па маштабе, змесце і глыбіні. Тым не менш гэтая сустрэча спадабалася Наталлі Качанавай. Бо, выходзячы з такіх сустрэч, сенатары і робяць важныя для іх дзейнасці адпаведныя высновы, якія дазваляюць больш дакладна разумець, у якім кірунку трэба рухацца далей.

Трэба сказаць, што ў сваю чаргу студэнты ў сілу сваіх магчымасцяў і здольнасцяў, жыццёвага досведу падрыхтаваліся да дыялогу са старшынёй Савета Рэспублікі. Напрыклад, прадстаўнік 4-га курса факультэта журналістыкі БДУ Максім Цюцянкоў прызнаўся, што да гэтай сустрэчы ён асабліва старанна рыхтаваўся, распытваў сваіх аднакурснікаў аб тым, што іх хвалюе больш за ўсё. Безумоўна, студэнцкую моладзь цікавіць і хвалюе ў першую чаргу адукацыйны працэс. А студэнтаў старэйшых курсаў, як гаворыцца, без пяці хвілін выпускнікоў — пытанні праходжання вытворчай практыкі і наступнага размеркавання.

Увогуле, па словах Максіма, дыялог са старшынёй Савета Рэспублікі зрабіў моцнае ўражанне. Ён упэўнены, што сустрэча адыграе вялікую ролю ў станаўленні яго як будучага журналіста. Пачутай інфармацыяй ён збіраецца абавязкова падзяліцца са сваімі аднагодкамі. Максім лічыць, што такія дыялогавыя пляцоўкі для моладзі актуальныя. Бо менавіта тут можна атрымаць з першых вуснаў адказы на пытанні, якія цікавяць.

Дарэчы, і студэнтку 4-га курса філалагічнага факультэта БДУ Анастасію Яўтушкевіч, якая вучыцца на бюджэце, зараз асабліва хвалюе будучае працаўладкаванне. Дзяўчына ўдзячна за сустрэчу з моладдзю ў Савеце Рэспублікі, дзе, на яе погляд, адбыўся канструктыўны дыялог. Для студэнтаў гэта вельмі важна.

Удзельнікі адкрытага дыялогу пасля яго завяршэння падзякавалі Наталлі Качанавай за такую грунтоўную сустрэчу, за магчымасць шчыра пагаварыць на роўных, а таксама ўбачыць і зразумець, як і дзе прымаюцца законапраекты, што сабой уяўляе работа апарату верхняй палаты парламента, як наладжана дзейнасць сакратарыята і членаў Савета Рэспублікі.

Леанід ТУГАРЫН, фота БелТА.

МЕРКАВАННЕ

«Спорт сёння стаў заложнікам палітыкі»

Анатоль ІСАЧАНКА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі, выказаў свой пункт гледжання на сваёй старонцы ў адной з сацыяльных сетак:

Фота з сацыяльных сетак.

— Шкада, што сёння спорт стаў заложнікам палітыкі, якая прадыктавала рашэнне спартыўных улад аб адмене чэмпіянату свету па хакеі ў Рэспубліцы Беларусь.

Падобнае ў сучасным свеце мы бачылі не раз. Аднак беларуская сітуацыя абсалютна іншая. Вестунамі гэтага рашэння сталі ўцекачы-спартсмены — тыя, якія былі ў дзяржавы як «у Бога за пазухай», тыя, хто на ўласным прыкладзе ведае, што ў Беларусі робіцца для развіцця спорту і падтрымкі таленавітых маладых спартсменаў. Такое можна назваць толькі здрадай. Подлай і падступнай. Яны здрадзілі не толькі ўладзе і дзяржаве, але і ўсім сапраўдным аматарам спорту!

АКЦЭНТЫ

Актуальныя ідэі і новыя медыйныя праекты

Абмяркоўваліся на сустрэчы старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктара ЛІСКОВІЧА з кіраўніцтвам рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

Савет Рэспублікі выступае адным з заснавальнікаў газеты «Звязда». Увага старшыні профільнай камісіі была скіравана ў першую чаргу на перспектывы развіцця друкаванай прэсы, кніжнай групы Выдавецкага дома «Звязда» і трансфармацыі друкаванага прадукту ў лічбавую прастору.

У прыватнасці, абмяркоўваліся пытанні ролі кнігі ў сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным жыцці краіны і ўплыў яе на развіццё ўнутранага турызму.

— Унутраны турызм — гэта адзін з ідэалагічных складнікаў захавання гістарычнай памяці, спадчыны і фарміравання духу і аблічча сучаснага грамадзяніна і патрыёта, — падкрэсліў Віктар Лісковіч.

Акрамя таго, на парадку дня былі і арганізацыйныя пытанні правядзення III Фестывалю-кірмашу «Кніжныя сустрэчы ў Мірскім замку».

На сустрэчы абмяркоўваліся новыя медыйныя формы работы Выдавецкага дома ў лічбавай прасторы; перспектывы супрацоўніцтва з вядучымі ВНУ краіны ў рамках падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў для галіны і пытанне практыкаарыентаванасці навучання вышэйшай школы.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

МЭТАВЫЯ АРЫЕНЦІРЫ І КЛЮЧАВЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ

ПАСТАЯННАЯ камісія Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах падвяла вынікі сваёй дзейнасці за мінулы год і вызначыла задачы на бягучы.

Як паведамілі ў профільнай камісіі, на пасяджэнні, якое прайшло ў фармаце відэаканферэнцыі, былі вызначаны мэтавыя арыенціры і планавыя мерапрыемствы на 2021 год, а таксама разгледжаны некаторыя прапановы па ўдасканаленні заканадаўства.

— Нягледзячы на пандэмію, мы досыць часта праводзілі пасяджэнні Пастаяннай камісіі, — звярнула ўвагу **старшыня профільнай камісіі Таццяна РУНЕЦ,** якая пазітыўна ацаніла вынікі работы камісіі за мінулы год, — Усяго такіх пасяджэнняў летась было 14. Прычым на парадку дня кожнага з іх былі тыя ці іншыя законапраекты, якія мы прадметна абмяркоўвалі, фармулявалі свае прапановы для спецыялістаў, трымалі на кантролі ход распрацоўкі законапраектаў.

Яна выказала ўпэўненасць, што такі сапраўды актыўны, ініцыятыўны і — самае галоўнае — прадукцыйны характар дзейнасці захаваецца і ў бягучым годзе. Так, падчас пасяджэння сенатары дэталёва разгледзелі і прааналізавалі вынікі дзейнасці камісіі па розных кірунках: ад нарматворчай дзейнасці да работы са зваротамі грамадзян.

Напрыклад, што датычыцца нарматворчай дзейнасці і ініцыятыўных прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства, у 2020 годзе былі падрыхтаваны заключэнні па сямі законапраектах, якія сенатары падтрымалі на пасяджэннях сесіі Савета Рэспублікі. У прыватнасці, гаворка ідзе аб законах «Аб змяненні законаў па пытаннях валютнага рэгулявання і валютнага кантролю», «Аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за 2019 год», «Аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва за 2019 год», «Аб змяненні законаў па пытаннях гаспадарчых таварыстваў», «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на 2021 год», «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2021 год» і, нарэшце, «Аб змяненні Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь».

Акрамя таго, была працягнута работа над законапраектамі на розных стадыях іх падрыхтоўкі. Праведзены круглыя сталы, пашыраныя пасяджэнні Пастаяннай камісіі па ключавых законапраектах, якія ўжо ў найбліжэйшай перспектыве будуць ствараць прававы ландшафт нацыянальнай эканомікі і фінансавай сферы. Гэта датычыцца аплатных сістэм і аплатных паслуг, вырашэння неплацежаздольнасці і самарэгулявальных арганізацый.

У цэнтры ўвагі членаў профільнай камісіі таксама былі вынікі іх дзейнасці ў складзе рабочых груп, камісій, саветаў і іншых міжведамасных утварэнняў, міжнародная дзейнасць (у тым ліку на інтэграцыйным трэку), работа са зваротамі грамадзян. Так, летась членамі Пастаяннай камісіі было разгледжана 627 зваротаў грамадзян, іх прадстаўнікоў, прадстаўнікоў юрыдычных асоб. Людзі звярталіся па пытаннях утрымання жыллёвага фонду і арганізацыі работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, пытаннях гандлю і рэгулявання спажывецкага рынку, сацыяльнага і пенсійнага забеспячэння. Па многіх зваротах былі прынятыя станоўчыя рашэнні.

Акрамя таго, сенатары сустракаліся з працоўнымі калектывамі: летась адбылося 447 сустрэч, дзе абмяркоўваліся ключавыя прыярытэты сацыяльна-эканамічнай палітыкі і законы, што прымаюцца для рэалізацыі гэтых прыярытэтаў.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

АКЦЭНТЫ

Больш за 600 зваротаў

разгледжана летась членамі Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці

ДНЯМІ былі падведзены вынікі работы профільнай камісіі за 2020 год. Акрамя работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, сярод асноўных «індыкатараў» таксама выступалі сустрэчы з працоўнымі калектывамі, асвятленне дзейнасці камісіі ў сродках масавай інфармацыі і сацыяльных сетках, удзел у значных для краіны падзеях.

Як паведамілі ў профільнай камісіі, найбольшую колькасць зваротаў разгледзеў яе **старшыня Віктар ЛІСКОВІЧ.** Звароты большай часткай датычыліся аховы здароўя, сацыяльнага і пенсійнага забеспячэння, занятасці насельніцтва, аховы працы, адукацыі, навукі і культуры, словам, тых кірункаў, што ўваходзяць у кампетэнцыю Пастаяннай камісіі.

Напрыклад, У Савет Рэспублікі да старшыні профільнай камісіі звярнулася Аляўціна Іванаўна, жыхарка горада Ліда, што на Гродзеншчыне, з просьбай аб садзейнічанні ў высвятленні дыягназу і медыцынскай дапамозе яе ўнуку. Па выніках разгляду Міністэрствам аховы здароўя яе звароту маладога мужчыну гаспіталізавалі ў неўралагічнае аддзяленне № 3 РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі, дзе правялі ўсе неабходныя дыягнастычныя даследаванні, кансультацыі ўрача-псіхолага, урача-псіхіятра, лагапеда, на аснове якіх з'явіцца канчатковы дыягназ і будуць дадзены рэкамендацыі па далейшым лячэнні і назіранні.

А вось аднаго прадпрымальнага мінчаніна хвалявала пытанне арэнды памяшканняў для арганізацыі спартыўных заняткаў, з просьбай аб садзейнічанні ў якім ён і звярнуўся ў Савет Рэспублікі. Як расказалі ў профільнай камісіі, у вырашэнні гэтага пытання быў задзейнічаны Мінгарвыканкам — заяўніку было прапанавана чатыры памяшканні на выбар.

А вось Ірына Васілеўна са Стаўбцоўскага раёна, што на Міншчыне, звярнулася ў Савет Рэспублікі з набалелай і дастаткова складанай праблемай. Па заканчэнні Салігорскага дзяржаўнага каледжа яе прыёмная дачка была накіравана на работу ва ўпраўленне адукацыі Салігорскага райвыканкама, але не змагла распачаць сваю працоўную дзейнасць, бо паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры на платную форму навучання. У адпаведнасці з законам дзяўчыне неабходна кампенсаваць сродкі, якія былі выдаткаваны на яе навучанне ў каледжы.

Гэтую праблему старшыня Пастаяннай камісіі абмеркаваў з міністрам адукацыі Ігарам Карпенкам. З улікам усіх абставін было прынята рашэнне аб перараз меркаванні дзяўчыны ў Мінскі раён. 17 снежня яна пачала працаваць у Бараўлянскай сярэдняй школе № 2 і была вызвалена ад кампенсацыі сродкаў за сваё папярэдняе навучанне.

Што датычыцца іншых кірункаў дзейнасці сенатараў, то і тут актыўнасць апынулася на высокім узроўні. Напрыклад, летась было праведзена без нечага 650 сустрэч з працоўнымі калектывамі. У лідарах — Дзмітрый Варанюк, Алег Дзячэнка, Каліна Капуцкая і Віктар Ліскоўіч.

Падчас такіх сустрэч агучваліся праблемы стану дарог, арганізацыі вольнага часу вяскоўцаў, якасці пітной вады, замацавання маладых спецыялістаў на вёсцы, перспектыў развіцця творчых здольнасцяў падрастаючага пакалення. Праблемы, якія часта абмяркоўваліся, — наяўнасць жылля для маладых спецыялістаў і новая форма аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый. Па іх вялася актыўная растлумачальная работа сумесна з органамі мясцовай выканаўчай улады.

Так, старшыня камісіі праводзіў сустрэчы ў Гродзенскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы бытавога абслугоўвання насельніцтва, дзяржаўным каледжы тэхнікі, тэхналогіі і дызайну, аграрным каледжы, «купалаўскім» універсітэце, удзельнічаў у рабоце пяці рэгіянальных дыялогавых пляцовак «Гродзенскі дыялог — 2020». Браў удзел у абмеркаванні пытанняў канстытуцыйнага рэфармавання і партыйнага будаўніцтва, а таксама шырокага кола пытанняў, што закранаюць галіны аховы здароўя, адукацыі, культуры, спорту і маладзёжнай палітыкі.

Дарэчы, усе ініцыятывы, якія былі агучаны на дыялогавых пляцоўках, прапрацаваны і падрыхтаваны да разгляду на Усебеларускім народным сходзе.

На рахунку значных спраў камісіі на працягу года былі арганізацыйная работа па стварэнні і каардынацыі дзейнасці Маладзёжнага савета (парламента), падрыхтоўка і правядзенне мерапрыемстваў VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, адкрыццё музейнай экспазіцыі ў Савеце Рэспублікі і гэтак далей. Важнай з'яўляецца ініцыятыва і пачатак добрай традыцыі — аказанне падтрымкі медыцынскім установам, пацыентамі якіх з'яўляюцца дзеці. У прыватнасці, па ініцыятыве Савета Рэспублікі ў РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі створаны апякунскі савет, які ўзначаліў Алег Суконка. На працягу года цэнтру перадалі камп'ютарную тэхніку, сродкі індывідуальнай аховы, аказана дапамога ў добраўпарадкаванні тэрыторыі.

Вольга АНУФРЫЕВА.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

ПАВЕДАМІЦЬ АБ ПРАБЛЕМАХ — ЗРУЧНА І ПРОСТА

У мінулую суботу прарэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, член Савета Рэспублікі Алег ДЗЯЧЭНКА правёў традыцыйную прамую лінію для жыхароў Магілёўскага і Чавускага раёнаў Магілёўскай вобласці, падчас якой адказаў на пытанні, звязаныя з грамадска-палітычнай сітуацыяй у краіне і падрыхтоўкай да правядзення VI Усебеларускага народнага сходу.

— Аднак не толькі палітычныя тэмы хвалююць сёння жыхароў вёскі, — паведаміў сенатар. — Дзякуючы прамой лініі вяскоўцы могуць расказаць пра набалелыя праблемы свайго населенага пункта. Гэта вельмі зручна і проста.

Вось гэтым разам на прамую лінію звярнуліся жыхары вёскі Амхавая Магілёўскага раёна з просьбай аказаць садзейнічанне ў вырашэнні праблемы ўстаноўкі электрычных катлоў для ацяплення прыватных домаўладанняў і юрыдычнага афармлення гэтага працэсу.

З вёскі Дубінка Вендаражскага сельсавета Магілёўскага раёна датэлефанаваўся пенсіянер, які прапанаваў увекавечыць на мясцовым мемарыяльным комплексе не толькі імёны землякоў, што

загінулі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, але і франтавікоў, якія ў пасляваенны час жылі і працавалі на тэрыторыі сельсавета, аднаўлялі разбураную эканоміку і сацыяльную сферу.

— Гэта прапанова заслугоўвае асаблівай увагі, — кажа Алег Дзячэнка. — Апошнія з удзельнікаў вайны ўжо ў нашы дні сыходзяць з жыцця і знаходзяць спачын на сельскіх грамадзянскіх могілках. Таму своечасовай з'яўляецца задача захавання памяці і ўшанавання іх імёнаў. Для гэтага патрэбна не толькі вызначыць крыніцы фінансавання гэтага праекта, але і стварыць поўную базу даных аб героях вайны і працы.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

ПААБЯЦАЛІ — ЗРАБІЛІ

УЛЕТКУ член Савета Рэспублікі Сяргей АНЮХОЎСКІ сустракаўся з працоўным калектывам бабруйскага завода жалезабетонных вырабаў. Тады звароты да парламентарыя работнікаў будаўнічай сферы датычыліся гарадскога грамадскага транспарту.

У сераду, 20 студзеня, сенатар зноў прыехаў на гэты завод. Работнікі падзякавалі члену Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах за актыўную сенатарскую дзейнасць і неабыякавасць да праблем жыхароў горада на Бярэзіне.

Акрамя таго, гаворка зайшла і аб грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне і свеце, аб будучым Усебеларускім народным сходзе, дэлегатам якога, між іншым, з'яўляецца Сяргей Анюхоўскі.

Дарэчы, у цэнтры ўвагі папярэдняй сустрэчы было цяжкае фінансавае становішча завода. На сёння заробкі хоць і маленькаму калектыву, які складаецца з 30 чалавек, выплачваюцца своечасова, прызначаны выконваючы абавязкі кіраўніка. Завод будуе дзіцячы садок у 7-м мікрараёне, таму работа ёсць.

НА «КУЛЬТУРЫ» — СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ПРАГРАМА ДА ЮБІЛЕЮ КЛАСІКАЎ

Канал «Культура» Беларускага радыё адзначыць у эфіры юбілейныя даты з дня нараджэння Івана Шамякіна і Івана Мележа спецыяльнымі выпускамі ўласных праектаў і падборкай аўдыёпастановак паводле твораў абодвух класікаў айчыннай літаратуры.

100-годдзе народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна, якое споўніцца 30 студзеня, тут пачнуць ушаноўваць ужо ў найбліжэйшыя выхадныя. Так, 23 і 24 студзеня ў напаўненні перадачы «Радыётэатр плюс» выкарыстаюць дзве часткі радыёспектакля «Адна на падмостках» паводле аднайменнай аповесці класіка. Галоўную ролю ў гэтай пастаноўцы 1994 года выканала народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч. А непасрэдна ў святочныя выхадныя 30 і 31 студзеня ў літаратурна-мастацкім праекце прагучаць радыёспектаклі «Трывожнае шчасце» і «Выгнанне блудніцы» паводле твораў Івана Шамякіна.

«Гэтыя аўдыяльныя работы, створаныя паўстагоддзя таму пры ўдзеле акцёраў двух галоўных драматычных тэатраў краіны — імя Янкі Купалы і Якуба Коласа — не страчваюць сваёй актуальнасці, — адзначае дырэктар канала «Культура» Уладзімір Трапянок. — Юбілейныя даты дазваляюць нам зноў і зноў звяртацца да выбраных радыёспектакляў, каб нагадаць пра іх пастаяннаму слухачу, а таксама пазнаёміць маладое пакаленне з найлепшымі літаратурнымі творамі Беларусі, якія некалі набылі аўдыяльнае гучанне і сталі здабыткам мастацкага радыёвяшчання краіны».

А 100 гадоў з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа, што прыпадае на 8 лютага, радыёканал «Культура» адзначыць у першыя выхадныя апошняга зімовага месяца трансляцыяй інсцэнаваных апавяданняў «У завіруху» і «Ноччу», а таксама радыёспектаклямі «Хто прыйшоў уначы» і «Подых навальніцы».

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 112

Наступную задачу склаў мінскі шахматыст Валерый Разінкін ***(гл. дыяграму).***

Белыя: Крe7, Фе8, Ла8, Лс8, Cd7, Kb8, Kd6 (7).

Чорныя: Крb4, Kb1, Kb2, пп. b3, b6 (5).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

104-е першынство славутага шахматнага клуба імя Ф. Маршала (ЗША) сёлета праходзіла ў анлайн-рэжыме (33 удзельнікі). Перамаглі ў ім нашы суайчыннікі: Сяргей Азараў заняў першае месца, Кірыл Ступак — другое. У «Паўночнаамерыканскім турніры» (таксама анлайн) Аляксей Аляксандраў падзяліў 2-5 месцы, а ў яшчэ адным турніры на сайце chess.com — 4-12 месцы. Аляксандра Тарасенка заняла 26-е месца ў моцным жаночым анлайн-турніры «Кубак Шарджы».

* * *

Прааналізуем эцюд вядомага беларускага майстра Івана Бондара (Ганцавічы).

Белыя: Крb4, Лg3, Лh3, Ka5, пп. a2, c5 (6).

Чорныя: Крa7, Ce1, пп. b7, c6, d2, d7 (6).

Нічыя.

Рашае 1. K:c6+! bc 2. Лa3+ Крb7 3. Крa4! d1Ф+ 4. Лhb3+ Кр~ — пат.

* * *

Наш чытач Сяргей Дарошчанка даслаў свае кампазіцыі, адрасаваныя найперш шахматыстам-пачаткоўцам. Ва ўсіх трох белыя даюць мат за 2 хады.

№ 1

Белыя: Крh1, Лb1, Лf1, Ch2, пп. a6, e6 (6).

Чорныя: Крe8, Лa8, пп. a7, e7 (4).

№ 2

Белыя: Крh6, Лf1, Ca2, пg6 (4).

Чорныя: Крh8, Лg8, пg2 (3).

№ 3

Белыя: Крb5, Лg3, Kb6, Kd7, пc6 (5).

Чорныя: Крa7, Cd6, пb7 (3).

* * *

У мінулым выпуску мы змясцілі партыі пераможцаў нядаўніх суперфіналаў чэмпіянатаў Расіі. А вось як перамагалі «сярэбраныя» прызёры.

Сяргей Каракін — Пётр Свідлер. 1. e4 c5 2. Kf3 d6 3. d4 cd 4. K:d4 Kf6 5. Kc3 a6 6. Cg5 e6 7. f4 Фc7 8. C:f6 gf 9. Фd2 Kc6 10. 0-0-0 b5 11. Крb1 K:d4 12. Ф:d4 Ce7 13. f5 Cd7 14. Фd2 0-0-0 15. Ke2 d5 16. ed Cc6 17. Фe3 C:d5 18. Kc3 Cb7 19. Cd3 Крb8 20. fe Cc5 21. Фh3 fe 22. Ф:e6 Cd4 23. Ce4 C:c3 24. C:b7 Кр:b7 25. bc Ф:c3 26. Фe7+ Крc8 27. a3 Лhe8 28. Ф:h7 Ф:a3 29. Фf5+ Крc7 30. Фf4+ Крb7 31. Ф:f6 Фb4+ 32. Фb2 Фg4 33. Л:d8 Л:d8 34. Лe1 Ф:g2 35. Лe7+ Крa8 36. Фf6 Фg1+ 37. Крa2 Фg8+ 38. Лf7, 1:0.

Паліна Шувалава — Таццяна Гетман. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. g3 d5 4. Cg2 Cb4+ 5. Kd2 0-0 6. Kgf3 b6 7. 0-0 Cb7 8. Ke5 Cd6 9. cd ed 10. Kdc4 Ce7 11. Cf4 c6 12. Ke3 Kh5 13. Kf5 K:f4 14. gf g6 15. K:e7+ Ф:e7 16. Лc1 f6 17. Kd3 Kd7 18. e3 f5 19. Фa4 Лfc8 20. Лc3 a5 21. Лfc1 Фd6 22. Фb3 Крg7 23. a3 Лab8 24. Фc2 Фe6 25. Фa4 Крh6 26. Cf3 Лc7 27. b4 ab 28. ab Лa8 29. Фb3 Лcc8 30. b5 cb 31. Лc7 Л:c7 32. Л:c7 Лa1+ 33. Крg2 Ca8 34. Ф:b5 Лa3 35. Л:d7 Л:d3 36. Лa7, 1:0.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Ke5! Першыя правільна адказалі: Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч.

Вадзім ЖЫЛКО.

О, спорт!..

Сусветны біятлон на пятай кнопцы

Адкрываем сакрэты стварэння папулярнай праграмы

Кожную сераду ў цэнтры ўвагі аматараў спорту — біятлон, якому прысвечана праграма «Агнявы рубеж» на тэлеканале «Беларусь 5». Гэта не проста біятлонныя звесткі, а эксклюзіўныя інтэрв'ю, якасная аналітыка, рэпартажы з гонак і неверагодныя гісторыі спартсменаў. І ўсё гэта робіць адзін чалавек — аўтар і вядучая праекта Ганна ЛЮБЯНКОВА. Яна адкрыла «Звяздзе» закулісе папулярнай праграмы.

— Гадоў пяць таму я прапанавала кіраўніцтву канала «Беларусь 5» ідэю праекта, прысвечанага біятлону. Спорт у краіне папулярны, вынікі ў спартсменаў добрыя, аматарам такая праграма прыйшлася б даспадобы. Але тады мая ідэя не рэалізавалася. Новы кіраўнік канала Павел Булацкі яе падтрымаў, і я прыступіла да стварэння свайго праекта. Гэта было ў пачатку лістапада, а ў канцы месяца мы ўжо выходзілі ў эфір. Першы сезон прайшоў як у тумане — я фактычна жыла на рабоце, ад'язджала дадому на апошнім цягніку метро, а вярталася з самага ранку. І вось ужо чатыры гады зіма для мяне — самы гарачы час. Я жыву ад серады да серады, ад выпуску да выпуску.

«Агнявы рубеж» складаецца з розных блокаў: інфармацыя аб нядаўнім турніры, зараз гэта этапы Кубка свету, дайджэст навін. Раней я збірала праграму цэлы тыдзень, але з часам навучылася выбіраць тое, што мне патрэбна, і аптымізаваць сваю работу. Увесь тыдзень я збіраю інфармацыю, навіны, а ў панядзелак і аўторак складаю новы выпуск. Цяпер, калі праз пандэмію не магу паехаць у камандзіроўку на турніры, узнікаюць цяжкасці з інтэрв'юіраваннем спартсменаў. Выратоўваюць нашы сяброўскія адносіны, біятланісты запісваюць мне відэа, даюць свае каментарыі. Дзякуючы доступу да відэаархіва Міжнароднага саюза біятланістаў, ёсць магчымасць паказаць гледачам цікавыя матэрыялы з месца падзей. Калі еду на спаборніцтвы, прывожу адтуль матэрыялу на год наперад. І ў мяне засталося яшчэ шмат цікавага з мінулага сезона. Выдатныя моманты гонак, жывыя інтэрв'ю са спартсменамі — што ў праграмы, — гэта манціраваць, астатняму ўсяму навучылася. У мінулым годзе працавала нават без аператара. У нас была ўмова: або я еду адна на два этапы Кубка свету, або — на адзін, але з аператарам. Канешне, я паехала на два этапы самастойна і працавала і за карэспандэнта, і за аператара. Мне дапамагаў фатограф федэрацыі біятлона Дзяніс Касцю-

чэнка, і многае я зняла сама. Гэта быў мой першы аператарска-карэспандэнцкі вопыт, цікавы, неардынарны, але паўтараць яго я не хачу. З аператарам працаваць прасцей, кожны выконвае свае абавязкі і пры неабходнасці дапамагае адзін аднаму. Напрыклад, аператар можа папрасіць спартсмена спыніцца ў мікс-зоне. А так я падчас гонкі брала камента-

біятлоне рэдкасць — абавязкова выйдуць у эфір напярэдадні чэмпіянату свету ў лютым, калі будзе зацішша ў Кубку свету і аператыўнай інфармацыі стане мала.

Выпуск тэлевізійнай праграмы на 27 хвілін — вялізная праца, і многія здзіўляюцца, што я раблю ўсё сама. Але гэта так, каманды ў мяне няма. Адзінае, чаго я не ўмею рабіць для прарый у першага, хто фінішаваў, бегла ў прэс-цэнтр, адтуль адпраўляла матэрыял у Мінск і там ужо яго ставілі ў эфір. На першы погляд можа падацца, што працаваць на месцы падзей лёгка — спаборніцтвы, спартсмены. Але гэта цяжка, хоць я і люблю такую работу ўсёй душой.

За чатыры гады ў мяне сабралася некалькі любімых выпускаў «Агнявога рубяжа». Больш за ўсё мне падабаюцца навагоднія праграмы, дзе біятланісты віншуюць аматараў, а тыя — біятланістаў. У мяне быў выпуск, калі я па горадзе хадзіла з камерай і мікрафонам і прасіла людзей павіншаваць нашу біятлонную каманду. Атрымалася вельмі душэўна. Самыя любімыя выпускі — з Осла, Цюмені 2018 года, калі Надзея Скардзіна выйграла Малы хрустальны глобус, калі Дар'я Домрачава выйгравала. Гэта былі апошнія гонкі Дашы і Надзі, пра што ніхто не ведаў. Я манціравала іх ноччу, каб паспець раніцай даць у эфір... Я вельмі люблю выпускі праграмы, знятыя на месцы падзей, — яны перадаюць антураж, атмасферу спаборніцтваў. Робячы кожны выпуск «Агнявога рубяжа», стараюся зацікавіць гледачоў, каб яны палюбілі біятлон так, як люблю яго я.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота з асабістага архіва гераіні.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.15 Навіны надвор'я.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «На тваім баку-2» (16+).
13.05, 15.25 Серыял «Ныральшчыца за жэмчугам» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
18.15, 0.10 «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
22.00 Серыял «След» (16+).
23.50 Арэна.
0.30 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 19.25 Тэлебарометр.
9.05 «Панаехалі. Канікулы ўслепую» (16+) [СЦ].
10.05 Камень, нажніцы, папера (16+).
10.40 «На тыдзень» (16+).
11.30 «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
12.30 «Каралі палат» (16+).
13.00 Прыгоды «Жалезны чалавек-3» (12+).
15.05 Анімацыйны фільм «Уверх» (12+).
16.40 М/с «Пінгвіны з Мадагаскара» (0+).
17.50 «Мяняю жонку» (16+).
19.55 «Сямейныя гісторыі» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.15 «Тата папаў» (16+).
23.05 Хачу ў тэлевізар!
23.10 Серыял «Анатомія страсці» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня». Чарнасліў з тварагом.
8.05, 12.00, 20.20, 23.20 Навіны культуры.
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.15, 17.30 «Надзвычайнае здарэнне». Маст. фільм (12+).
12.50 «Наперад у мінулае».
13.15, 21.05 «Апошні дзень». Данатас Баніёніс (12+).
13.55, 21.40 «Вечны кліч». Маст. фільм (12+) [СЦ].
15.05 «Навукаманія» (6+).
15.30 Канцэрт. «Яўген Глебаў. Музыка з кінафільмаў».
16.40 «Кадры жыцця».
20.40 «Калыханка» (0+).
22.55 «Фарбы памяці». Мастак Эдуард Куфко.

Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.10 Біятлон. Кубак свету. Антхольц-Антэрсельва. Эстафета. Жанчыны.
8.50, 17.20, 22.20 Гандбол. Чэмпіянат свету. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
10.30, 0.00 Гандбол. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
11.05 Біятлон. Кубак свету. Антхольц-Антэрсельва. Мас-старт. Мужчыны.
12.00 Вынікі тыдня.
12.45 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Калеў» (Талін).
14.35 Вялікі спорт.
15.20 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — ХК «Гомель».
19.00 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Поўначсталь» (Чарапавец). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
21.30 Вось гэта спорт!
21.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.10** Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15 Серыял «Айчым» (16+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 Серыял «Шпік» (12+).
22.10 Серыял «Айчым» (16+).
0.10 «Док-ток». «Сапраўдная гісторыя Юліі Началавай» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
8.40 «Тыдзень».
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 21.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.15 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.45 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.40, 16.50 «Меч». Серыял (16+).
20.30, 23.05 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Міншчына».
22.00 «Глядзець усім!» (16+)
0.00 «Загадкі чалавецтва» (16+).
0.45 «Самая карысная праграма» (16+).
1.35 «Мінтранс» (16+).

МІР

5.00, 10.10 Серыял «Страсці па Чапаеву» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
11.15, 4.55 Маст. фільм «Вас чакае грамадзянка Ніканорава» [СЦ] (12+).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 17.15, 3.45 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 4.10 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 Міравое пагадненне (16+).
18.15, 19.25 Серыял «Чужы раён-3» [СЦ] (16+).
21.40 «Гульня ў кіно» (12+).
22.25 «Назад у будучыню» (16+).
23.25 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
0.15 Серыял «Маргарыта Назарава». 1—4-я серыі [СЦ] (16+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Таямніцы Беларусі» (16+).
12.30 «Зроблена». Дак. праект.
12.50 «У людзях».
13.35 «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.40 Серыял «Марозава» (12+).
17.15 «60 хвілін».
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Скліфасоўскі» (12+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.10 Спорт-мікс.
6.25 Беларусы (6+).
7.05 «Здароўе» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.25 Зламаць стэрэатыпы (12+).
08.45, 10.25, 13.50 Баявік «Маёр Ветраў» (16+).
13.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.25 «Зразумець і абясшкодзіць».
14.55 «Чакай мяне» (12+).
16.20, 19.40, 22.05, 23.25 Сёння. Галоўнае.
16.25 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 «ДНК» (16+).
18.00 Серыял «Добрая жонка» (16+).
19.55 Серыял «Пёс» (16+).
21.05, 22.25 Серыял «Чужая зграя» (12+).
22.10 «НЗ.by».
23.40 «Справа ўрачоў» (16+).

8 канал

7.00, 15.50, 18.15, 21.05, 1.10 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 16.00 «Мультпарад». «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (6+).
7.30, 15.55, 20.50 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).
8.00, 19.25 Серыял «Раманавы» (12+).
9.30 Мультфільм «Усе сабакі святкуюць Раство».
10.45 Фантастыка «Мсціўцы. Фінал» (16+).
13.50 Серыял «ОА» (16+).
14.35 Серыял «Неўтаймоўны валадар» (16+).
15.20 Серыял «Будызм у Кітаі» (12+).
16.25 Серыял «Нішто не здараецца двойчы» (16+).
18.20 Серыял «Гамбіт каралевы» (18+).
20.55 «Вечарніца» (6+).
21.10 Фантастыка «Чужы супраць драпежніка» (18+).
22.50 Прыгоды «Аквамен» (12+).

ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.35 Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
9.25, 16.35 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
10.00, 1.50 «Проста кухня» (16+).
11.00 «Шоу выхаднога дня» (16+).
12.00 «Наш рамонт» (16+).
12.35 Баявік «Хлопчык-налётчык» (16+).
14.40 Серыял «Філатаў» (16+).
17.30 Камедыя «Маленькая Італія» (16+).
19.30 Шоу «Поўны блэкаўт» (16+).
21.00, 0.10 «Уральскія пельмені» (16+).
22.25 Шоу «Стэндап андэграўнд» (16+).
23.20 Скетч-шоу «Зала чакання» (16+).
1.00 «Рогаў у справе» (16+).
3.25 Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
4.45 Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30 «Маўглі». М/ф.
8.15 «Сын». Маст. фільм [СЦ].
9.40 «Звычайны канцэрт».
10.10 «Кароль кажа». Маст. фільм.

12.00 Колер часу. Надзя Рушава.
12.10 Лісты з правінцыі. Ладзейнапольскі раён [СЦ].
12.40 «Серэнгеці». Дак. фільм [СЦ].
13.40 «Іншыя Раманавы». «Вянок для каралеўны» [СЦ].
14.10 «Гульня ў бісер». «Аляксей Рэмізаў. «Агонь рэчаў».
14.50 «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
15.05, 0.05 «Пісталет «Пітон 357». Маст. фільм (16+).
17.10 100 гадоў з дня нараджэння спевака. «Невырашальныя супярэчнасці Марыё Ланца». Дак. фільм.
18.05 «Пешшу...» Тэатр Абразцова [СЦ].
18.35 «Рамантыка рамансаў».
19.30 Навіны культуры.
20.10 «Час адпачынку з суботы да панядзелка». Маст. фільм [СЦ].
21.35 Ільдар Абдразакаў, Вераніка Джыоева, Клаўдыё Сгура, Лучана Ганчы ў канцэрце «Вердзі-гала».
23.25 «Кінескоп». «Расійскае кіно. Міжнародныя прэм'еры».
2.10 Шукальнікі. «Цмок Блакітных азёр».

Настальгія

6.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1992. 1-я частка. 2010 год (16+).
7.05, 8.45, 9.45, 13.00, 17.25, 20.25, 3.45, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.15 Маст. фільм «Дзве версіі аднаго сутыкнення» (16+).
9.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00 «Колба часу» (16+).
11.05 Дак. фільм «Дзеці XX з'езда» (12+).
12.00 «Погляд. Перавароот». 1991 год. (16+).
13.25 «Пад знакам задыяка». 1993 год (16+).
15.00 «Быў час». 2009 год (16+).
16.00 Маст. фільм «Ранішняя шаша» (18+).
18.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
18.55 «Вакол смеху». 1980 год (12+).
21.40 Маст. фільм «Гу-Га» (18+).
23.55 Фільм-спектакль «Балалайкін і К». 1975 год (16+).
2.00 Фільм-канцэрт «Міхаіл Жванецкі. Сам-насам з сабой...» 1992 год (12+).
5.20 Дак. фільм «Каханне і галубы года 1957» (16+).

EuroSport 1

1.35, 7.00, 18.10 Скачкі на лыжах з трамплінаКубак свету (12+).
2.30, 15.30 Лыжныя гонкі (6+).
3.30, 10.00 Горныя лыжы (12+).
5.00, 8.30, 21.05 Снукер. German Masters (6+).
8.00, 17.10 Лыжнае двааборʼе. Кубак свету (12+).
20.00 Біятлон. Чэмпіянат Еўропы (6+).

Кінакамедыя

1.20 Споведзь невідзімкі (12+).
3.05 Сэрцаедкі (16+).
5.20 Белыя цыпачкі (12+).
7.15 Мілашка (18+).
8.55 Закону тут не месца (12+).
10.40 Зводныя браты (18+).
12.30 Гамбіт (16+).
14.05 Асаблівасці нацыянальнага палявання (16+).
16.00 Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі (16+).
17.50 Нацыянальная бяспека (12+).
19.30 Таксі-5 (18+).
21.20 Падмануць дарослых (16+).
23.10 Дзеці сексу не перашкода (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.20 «Улегцы» (12+).
8.50 Калекцыя «Беларусьфільма»: «Хроніка ночы» (12+).
10.25 «Глядзі сам» (16+).
18.15 «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
22.25 Меладрама «Дочкі-маці» (16+).
1.45 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 16.25 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
9.55 «На нажах» (16+).
11.00, 18.15 Дэтэктыў «Унутры» (16+).
12.45, 17.20 «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
13.40, 23.15 «Да пабачэння» (16+).
14.25 «Камень, нажніцы, папера».
14.55 Серыял «Анатомія страсці» (16+).
15.40 Нічога сабе ньюз (12+).
15.45 «ПІН_КОД». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
16.30 «Клон». Серыял (16+).
20.05 «Сакрэтны мільянер» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
21.20 Драма «Са дна вяршыні» (12+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня». Капусныя бліны і кіслая капуста з просам.
8.05, 12.00, 20.20, 23.15 Навіны культуры.
8.25, 18.10 «Вольф Месінг. Ён бачыў скрозь час». Маст. фільм (16+).
10.05 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
10.30, 15.55 «Хлеб дзяцінства майго». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.45 «Сіла веры».
13.10, 21.05 «Легенды кіно». Георгій Юматаў (12+).
13.55, 21.40 «Вечны кліч». Маст. фільм (12+) [СЦ].
15.00 «Кадры жыцця». Салістка Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Наталля Дзяменцьева.
17.20 «Рэдакцыя» з Барысам Герстэнам. Тэлемасты.
17.50 «Жывая спадчына». Абрад «Перанос Міхайлаўскай свечкі» (аг. Валяцічы, Барысаўскі раён, Мінская вобласць).
19.55 «Камертон». Артыст Валянцін Кірыленка.
20.40 «Калыханка» (0+).
22.50 «Фарбы памяці». Мастак Лазар Ран.

Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.10 Хакей. КХЛ. «Барыс» (Нур-Султан) — «Нафтахімік» (Ніжнякамск).
9.10 Хакей для ўсіх.
9.40 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва-Мінск».
11.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
12.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі.
14.35 Біятлон. Кубак свету. Антхольц-Антэрсельва. Эстафета. Жанчыны.
16.10 Агнявы рубеж.
16.40 Біятлон. Кубак свету. Антхольц-Антэрсельва. Мас-старт. Мужчыны.
17.35 Вось гэта спорт!
17.55, 21.35 Спорт-цэнтр.
18.05 Авертайм.
18.40 Авертайм. КХЛ.
19.00 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — ЦСКА (Масква). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
21.45 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
22.20 Гандбол. Чэмпіянат свету. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.45** Нашы навіны.
9.10 «Тэорыя змовы» (16+).
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 23.00 Серыял «Дзе жыве Надзея» (12+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Трывожная кнопка» (16+).
16.40, 18.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
18.50 «Поле цудаў» (16+).
20.00 Час.
21.10 «Свая каляіна». Лепшае (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.05 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 21.00, 1.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.15 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.45, 16.50 «Пасажыр без багажу». Серыял (16+).
20.30, 23.05 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Міншчына».
22.00 «Глядзець усім!» (16+)

МІР

5.00 Серыял «Выходжу цябе шукаць» (16+).
8.40, 10.20 Серыял «Чужы раён-3» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 16.20 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.00 Серыял «Чужы раён-3» [СЦ] (16+).
19.15 Ток-шоу «Слабае звяно» (12+).
20.15 «Гульня ў кіно» (12+).
21.00 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
21.40 Маст. фільм «Вій» [СЦ] (6+).
23.10 Маст. фільм «Уцекачы» (16+).
1.00 Маст. фільм «Прэферанс па пятніцах» (16+).
2.25 Маст. фільм «Вясёлыя рабяты» [СЦ] (12+).
3.55 М/ф (0+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35 Серыял «Жыццё пасля жыцця» (12+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.40 Меладрама «Я не вярнуся» (12+).
17.15 «60 хвілін». Ток-шоу.
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Скліфасоўскі» (12+).
23.10 «Дом культуры і смеху. Хутка вясна» (16+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.00, 8.20, 16.20, 19.40, 22.05, 23.40 Сёння. Галоўнае.
6.10 Спорт-мікс.
6.25 Беларусы (6+).
7.15 «Здароўе» (12+).
8.00, 10.00, 13.00,16.00, 19.00 Сёння.
8.35 Сфера інтарэсаў.
8.55 «Навукаманія» (6+).
9.30 «НЗ.by».
9.50, 10.25 Серыял «Юрысты» (16+).
12.15, 13.50 Серыял «Пчаляр» (16+).
13.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.55 Пракурорская праверка (16+).
16.25 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 «ДНК» (16+).
18.00 Серыял «Добрая жонка» (16+).
19.55 Серыял «Пёс» (16+).
21.05, 22.40 Серыял «Чужая зграя» (12+).
22.10 «НЗ.by: час вынікаў».
23.55 «Справа ўрачоў» (16+).

8 канал

7.00, 16.00, 19.55, 21.10, 1.35 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 «Мультпарад». «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу».
7.30, 20.50 «Прыколы 13-й школы».
7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).
8.00, 20.00 Серыял «Знайдзі мяне» (16+).
9.35 Драма «Камандзір шчаслівага «Шчупака» (6+).
11.10 Дакументальны фільм.
11.40 Баявік «Трансформеры. Эпоха вынішчэння» (12+).
14.25, 19.05 Серыял «Гамбіт каралевы» (16+).
15.15 Серыял «Неўтаймоўны валадар» (16+).
16.05 «Мультпарад» (0+).
17.00 «Гатуй як шэф».
17.15 Серыял «Нішто не здараецца двойчы» (16+).
20.55 «Вечарніца».
21.15 Трылер «Трансформеры. Апошні рыцар» (12+).
23.50 Баявік «Драпежнік» (16+).

ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.00 Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
10.35, 21.30 Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
12.05 «Лаві момант» (16+).
13.00 «Руса турыста» (16+).
15.50, 3.05 Серыял «Лонданград» (16+).
16.55 «Уральскія пельмені» (16+).
17.30, 19.00 Серыял «СеняФедзя» (16+).
20.30 Серыял «Івановы—Івановы» (16+).
23.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
0.05 Серыял «Новы чалавек» (16+).
1.00 «Супермамачка» (16+).
1.50 Серыял «Татавы дочкі».
3.55 Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 Скетч-шоу «6 кадраў».

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Феадосія Айвазоўскага.
7.05, 20.05 «Правілы жыцця».
7.35, 18.40 «Сапраўдная вайна прастолаў». Дак. серыял [СЦ].
8.25 Легенды сусветнага кіно. Людміла Гурчанка.
8.50, 16.30 «Тайнік каля Чырвоных камянёў». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 1.25 XX стагоддзе. «Дагані аўтамабіль». «Проста метро». Дак. фільмы.
12.15 Дарогі старых майстроў. «Дрэва жыцця».
12.25, 22.15 «Ідыёт». Серыял [СЦ].
13.20 Жывы Сусвет. «Пошукі жыцця». Дак. фільм.
13.50 Штучны адбор.
14.30 Да 85-годдзя Леаніда Гакеля. «Я не баюся, я музыкант». Дак. серыял.
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Біблейскі сюжэт».
15.45 «Белая студыя».
17.35 Колер часу. Аловак.
17.45 В. А. Моцарт. Каранацыйная імша. Уладзімір Співакоў, Нацыянальны філарманічны аркестр Расіі і Акадэмічны вялікі хор «Майстры харавых спеваў».
19.45 Галоўная роля.
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.50 Абсалютны слых.
21.35 «Блакада. Збавенне». Дак. фільм.
23.10 «Іосіф Бродскі. Вяртанне» [СЦ].
0.00 Міжнародны дзень памяці ахвяр халакосту. Дж. Вердзі. Рэквіем. Сцэнічная версія тэатра «Гелікон-опера».
2.30 Раман у камені. «Крым. Мыс Плака». Дак. фільм.

Настальгія

5.55 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Уладзімір Высоцкі». 2005 год (18+).
6.50, 9.45, 11.00, 12.50, 14.40, 15.45, 17.00, 20.15, 21.45, 23.00, 2.25, 3.45, 5.35 Музычная настальгія (12+).
7.10 Маст. фільм «Ніколі» (16+).
8.35 Канцэрт «Спявае ВІА «Сіняя птица». 1979 год (12+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00,16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «У адзінай сям'і брацкіх народаў». 2006 год (16+).
13.10 Маст. фільм «Дзіця да лістапада» (18+).
18.00 «Сляем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2008 год (12+).
19.00 Маст. фільм «Сярод тысячы дарог...» (16+).
0.00 Маст. фільм «Восеньская гісторыя» (16+).
4.00 Маст. фільм «Шчанят» (18+).

EuroSport 1

0.30, 15.30 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету (12+).
2.00 Лыжныя гонкі. Кубак свету (6+).
3.30, 7.00, 20.00 Горныя лыжы (12+).
5.00, 11.30 Снукер. German Masters-220 (6+).
8.15 Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Жанчыны. Індывідуальная гонка (6+).
9.15 Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Жанчыны. Мас-старт (6+).
9.45 Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Жанчыны. Эстафета (6+).
10.30 Лыжнае дваябор'е. Кубак свету (12+).
12.25, 16.55, 21.05 Снукер. German Masters (6+).

Кінакамедыя

1.10 Мілашка (18+).
2.50 Споведзь невідзімкі (12+).
5.00 Ашуканцы (16+).
6.45 Пенелопа (12+).
8.40 Голая праўда (16+).
10.30 Не жартуйце з Зоханам! (16+)
12.35 Аднакласнікі-2 (16+).
14.25 Дзюплекс (12+).
16.00 Дзікая штучка (16+).
17.50 Гамбіт (16+).
19.30 Хлопчык у дзяўчынцы (16+).
21.15 Закону тут не месца (12+).
23.00 Секс па-сяброўску (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.50 «Перыскоп» (16+).
10.10, 16.05, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
11.10, 17.45 «Сны» (16+).
12.10, 18.45 «Сляпая» (16+).
13.20, 19.55, 4.05 «Варажбітка» (12+).
14.30, 3.15 «Містычныя гісторыі» (12+).
15.30 «Паляўнічыя на прывіды» (16+).
17.10 «Знакі лёсу» (16+).
21.05 «Косці». Серыял (16+).
22.55 «Грым». Серыял (16+).
23.50 «Глядзі сам» (16+).
0.05 «10 самых» (16+).
0.40 «Лінія абароны» (16+).
1.15 «Сахара». Маст. фільм (12+).

ТБ1000

5.00, 1.35 Вобласці цемры (16+).
6.55 Анаконда (16+).
8.30 Кінг Конг (16+).
11.55 Монстра (16+).
13.20 Гісторыя аднаго вампіра (16+).
15.15 Дракула (16+).
16.55 Прывід дома на ўзгорку (16+).
19.00, 3.20 Іншыя (16+).
20.55 Піяніст (16+).
23.35 Апантанасць (18+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Высоцкі. Дзякуй, што жывы (16+).
7.45 Пятніца (16+).
9.10 Землятрус (12+).
11.00 Калідор неўміручасці (12+).
13.30, 19.05 Павук (16+).
15.30 Тэрмінова выйду замуж (16+).
17.25 Кур'ер з «Раю» (12+).
21.05 Васьмёрка (16+).
22.35 Вартаўнік (16+).
0.30 Уцячы, дагнаць, закахацца (12+).
2.05 Дамавік (6+).
3.55 Лёгкі на ўспамін (12+).

National Geographic

6.00, 6.45, 11.45 Інстынкт выжывання (16+).
6.05, 18.25 Фабрыка ежы (16+).
7.30, 17.35 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
8.25, 14.15, 22.40, 1.55, 4.55 Аўта-SOS (16+).
9.15 Ледзяная дарога (16+).
10.05 Сапраўдны суперкар (16+).
10.55 Зрабіць за адзін дзень (16+).
12.35, 16.45 Нотр-Дам: гонка супраць пекла (16+).
13.25, 21.00, 3.30 Дзікі тунец: поўнач супраць поўдня (16+).
15.05 Ліхтугі за мяжой (16+).
15.55, 19.15, 0.20 Расследаванні авіякатастроф (16+).
21.50 Выратаваць «Тытанік»: скарбы з глыбіні (16+).
23.30 Зборнік «Гульняў розуму» (16+).
4.10 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
5.00 Асушыць акіян (16+).

Discovery

8.00 Ратавальнікі-цяжкавагавікі (16+).
8.45 Бітвы скарбашукальнікаў (12+).
9.35, 17.12, 22.18 Круты цюнінг (12+).
10.25 Брудныя грошы (12+).
11.15, 21.27, 4.56 Як гэта ўладкавана? (12+)
12.06, 19.45, 4.10 Махінатары (12+).
12.57, 3.24, 7.14 Узрываючы гісторыю (12+).
14.39 Голыя і напалоханыя XL (16+).
16.21 Як гэта зроблена? (12+)
18.03 Гаражнае золата (12+).
18.29 Бітвы скарбашукальнікаў (12+).
18.54, 2.33 Чыгунка Аўстраліі (12+).
20.36, 5.42 Каралі аўкцыёнаў (12+).
23.09 Паляўнічыя на склады (16+).
0.00 Голыя і напалоханыя XL (16+).
0.51 Выжыць разам (16+).
1.42 Музейныя загадкі (12+).
6.28 Сямейка Осбарнаў — праўда ці хлусня (16+).

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10, 22.15 Серыял «След». (16+).
10.50 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Меладрама «Выбар маці» (16+).
13.55 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.40, 15.25 Меладрама «Сядзелка» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
18.15, 0.25 «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень. (12+).
0.05 Сфера інтарэсаў.
0.45 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 16.30 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
9.55 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
10.55 Дэтэктыў «Унутры» (16+).
12.35, 17.25 «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
13.30 «Да пабачэння» (16+).
14.15 «Камень, нажніцы, папера».
14.45 Серыял «Анатомія страсці» (16+).
15.40 Нічога сабе ньюз (12+).
15.45 «ПІН_КОД». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
16.35 «Клон». Серыял (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.20 «Развод і дзявочае прозвішча» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.20 «Беларуская кухня». Бонды з юшкай.
8.05, 12.00, 20.20, 23.15 Навіны культуры.
8.25, 18.10 «Вольф Месінг. Ён бачыў скрозь час». Маст. фільм (16+).
10.05 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
10.35,15.55 «Крэпасць на колах». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.50 «Наперад у мінулае».
13.15, 21.05 «Легенды кіно». Інакенцій Смактуноўскі (12+).
13.55, 21.40 «Вечны кліч». Маст. фільм (12+) [СЦ].
15.05 «Кадры жыцця». Оперная спявачка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Людміла Колас.
17.20 «Рэдакцыя» з Барысам Герстэнам. Рэжысёр Уладзімір Ісат.
17.45 «Жывая спадчына». Мастацкія практыкі саломапляцення (Мінская вобласць).
19.55 «Гукі ў футляры». Цымбалы.
20.40 «Калыханка» (0+).
22.50 «Фарбы памяці». Мастак Яўген Зайцаў.

Беларусь 5

7.00 Азбука спорту.
7.10, 10.55 Гандбол. Чэмпіянат свету.
8.45 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Тарпеда» (Ніжні Ноўгарад).
12.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Лестэр».
14.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэячасопіс.
15.10 Слэм-данк.
15.45 Агнявы рубеж.
16.20 Хакей. КХЛ. «Барыс» (Нур-Султан) — «Нафтахімік» (Ніжнякамск). (У перапынках — Спорт-мікс; Спорт-цэнтр.)
18.50 Хакей для ўсіх.
19.20 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
21.40 Між іншым.
22.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
22.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.30** Нашы навіны.
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15, 22.40 Серыял «Дзе жыве Надзея» (12+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.40 Серыял «Шпік» (12+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.05 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 21.00, 0.55 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.15 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.50, 16.50 «Меч». Серыял (16+).
20.30, 23.05 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Мінскчына».
22.00 «Глядзець усім!» (16+)

МІР

5.00 Серыял «Выходжу цябе шукаць» (16+).
8.50, 10.10 Серыял «Чужы раён-3» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 17.15, 3.45 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 4.15 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15 Міравое пагадненне (16+).
18.15, 19.25 Серыял «Чужы раён-3» [СЦ] (16+).
21.40 «Гульня ў кіно» (12+).
23.25 «Назад у будучыню» (16+).
23.25 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
0.15 Серыял «Маргарыта Назарава» [СЦ] (16+).
4.40 Серыял «Выходжу цябе шукаць» (16+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35 Серыял «Жыццё пасля жыцця» (12+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.40 Серыял «Марозава» (12+).
17.15 «60 хвілін». Ток-шоу.
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Скліфасоўскі» (12+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.00, 8.20, 16.20, 19.40, 22.05, 23.25 Сёння. Галоўнае.
6.10 Спорт-мікс.
6.25 Беларусы (6+).
7.15 «Здароўе» (12+).
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35 Сфера інтарэсаў.
8.55 «Навукаманія» (6+).
9.30, 22.10 «НЗ.by».
9.50, 10.25 Серыял «Юрысты» (16+).
12.15, 13.50 Серыял «Пчаляр» (16+).
13.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.55 Пракурорская праверка (16+).
16.25 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 «ДНК» (16+).
18.00 Серыял «Добрая жонка» (16+).
19.55 Серыял «Пёс» (16+).
21.05, 22.25 Серыял «Чужая зграя» (12+).
23.40 «Справа ўрачоў» (16+).

8 канал

7.00, 14.45, 19.05,21.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 14.50 «Мультпарад». «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (6+).
7.30, 20.50 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).
8.00, 19.10 Серыял «Знайдзі мяне» (16+).
9.35 Меладрама «Сардэчна запрашаем, або Пабочным уваход забаронены» (0+).
10.50 СБ ТБ.
11.00 Баявік «Падзенне Алімпа» (16+).
13.05, 18.00 Серыял «Гамбіт каралевы» (16+).
14.00 Серыял «Неўтаймоўны валадар» (16+).
16.10 Серыял «Нішто не здараецца двойчы» (16+).
18.50 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
20.55 «Вечарніца» (6+).
21.05 Баявік «Трансформеры. Эпоха вынішчэння» (12+).
23.50 Камедыя «Хто падставіў труса Роджэра» (6+).
1.30 «Надвор'е».

ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.00 Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
10.35, 21.30 Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
12.05 «Лаві момант» (16+).
13.00 «Руса турыста» (16+).
15.50, 3.05 Серыял «Лонданград» (16+).
16.55 «Уральскія пельмені» (16+).
17.30, 19.00 Серыял «СеняФедзя» (16+).
20.30 Серыял «Івановы—Івановы» (16+).
23.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
0.05 Серыял «Новы чалавек» (16+).
1.00 «Супермамачка» (16+).
2.40 Серыял «Татавы дочкі».
3.55 Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 Скетч-шоу «6 кадраў».

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква армянская.
7.05, 20.05 «Правілы жыцця».
7.35, 18.40, 0.00 «Сапраўдная вайна прастолаў». Дак. серыял [СЦ].
8.25 Легенды сусветнага кіно. Сяргей Гурзо.
8.50, 16.30 «Тайнік каля Чырвоных камянёў». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.45 XX стагоддзе. «Алена Абразцова». Дак. фільм.
12.15 Дарогі старых майстроў. «Мсцёрскія галандцы».
12.25, 22.15 «Ідыёт». Серыял [СЦ].
13.20 Жывы Сусвет. «Зямля і Венера. Суседкі». Дак. фільм.
13.50 Абсалютны слых.
14.30 Да 85-годдзя Леаніда Гакеля. «Я не баюся, я музыкант». Дак. серыял.
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 Пернікавы домік. «Сані, саначкі» [СЦ].
15.45 «2 Вернік 2».
17.40 Раман у камені. «Іспанія. Тартоса». Дак. фільм.
18.10, 1.50 Э. Элгар. Серэнада для струннага аркестра ў 3 частках. Мітрапаліт Іларыён (Алфееў) і Камерны аркестр «Віртуозы Масквы».
19.45 Галоўная роля.
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.50 Кіно пра кіно. «Каўказская палонніца». «Гэта ж вам не лезгінка, а твіст!» Дак. фільм [СЦ].

Настальгія

6.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «У адзінай сям'і брацкіх народаў». 2006 год (16+).
6.50, 8.40, 9.45, 11.00, 14.15, 15.45, 17.00, 21.45, 23.00, 0.50, 3.45, 5.00 Музычная настальгія. (12+).
7.10 Маст. фільм «Дзіця да лістапада» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2008 год (12+).
13.00 Маст. фільм «Сярод тысячы дарог...» (16+).
17.55 Фільм-спектакль «Балалайкін і К» (16+).
20.00 Фільм-канцэрт «Міхаіл Жванецкі. Сам-насам з сабой...» 1992 год (12+).
23.10 Дак. фільм «Каханне і галубы года 1957». 2007 год (16+).
23.55 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Уладзімір Высоцкі». 2005 год (18+).
1.10 Маст. фільм «Нікалі» (16+).
2.35 Канцэрт «Спявае ВІА «Синяя птица» 1979 год (12+).

EuroSport 1

1.05 Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Жанчыны. Мас-старт (6+).
1.45 Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Жанчыны. Эстафета (6+).
2.30, 10.30 Лыжнае дваябор'е (12+).
3.30, 7.00 Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
5.00, 11.30, 21.05 Снукер. German Masters (6+).
8.15 Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Мужчыны. Індывідуальная гонка (6+).
9.15 Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Мужчыны. Эстафета (6+).
10.00 Біятлон. Кубак свету. Антхольц. Мужчыны. Мас-старт (6+).
20.00 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету (12+).

Кінакамедыя

1.00 Дзеці сексу не перашкода (16+).
3.25 Кадры (12+).
5.35 Такія розныя блізняты (12+).
7.15 Сэрцаедкі (16+).
9.35 Кіраванне гневам (12+).
11.25 Асаблівасці нацыянальнага паляванння (16+).

13.15 Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі (16+).
15.10 Марлі і я (12+).
17.20 Усё ці нічога (16+).
19.30 Таксі-5 (18+).
21.20 Муві 43 (18+).
23.05 Ашуканцы (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.40, 23.40 «Улегцы» (12+).
10.10, 16.05, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
11.10, 17.40 «Сны» (16+).
12.10, 18.40, 3.00 «Сляпая» (16+).
13.20, 19.50 «Варажбітка» (12+).
14.30 «Містычныя гісторыі» (12+).
15.30 «Паляўнічыя на прывіды» (16+).
17.05, 4.00 «Знакі лёсу» (16+).
21.00 «Косці». Серыял (16+).
22.50 «Грым». Серыял (16+).
0.15 «Знак якасці» (16+).
1.05 «1 + 1». Маст. фільм (16+).

ТБ1000

5.00 Дракула (16+).
6.25 Піяніст (16+).
9.00 Вобласці цемры (16+).
10.50, 1.50 Прывід дома на ўзгорку (16+).
12.55 Разумніца Уіл Хантынг (16+).
15.10 Іншыя (16+).
17.05, 3.35 Дзіцё чалавечае (16+).
19.00 Марскі бой (12+).
21.20 Раён № 9 (16+).
23.15 Блізкія кантакты трэцяй ступені (6+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Вартаўнік (16+).
7.20 Урфін Джус і яго драўляныя салдаты (6+).
9.05 Васьмёрка (16+).
10.35 Калектар (16+).
11.55 Кур'ер з «Раю» (12+).
13.30, 19.00 Павук (16+).
15.25 Пятніца (16+).
17.00 Вечнае жыццё Аляксандра Хрыстафорава (16+).
21.00 Тэрыторыя (12+).
23.45 Гісторыя аднаго прызначэння (12+).
1.45 Зайздрасць багоў (16+).
3.55 Недараваны (16+).

National Geographic

6.00, 11.45 Інстынкт выжывання (16+).
7.35, 17.35 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
8.25, 14.15, 2.00, 4.55 Аўта-SOS (16+).
9.15 Ледзяная дарога (16+).
10.05 Сапраўдны суперкар (16+).
10.55 Зрабіць за адзін дзень (16+).
12.35, 16.45 Дзікі тунец: поўнач супраць поўдня (16+).
13.25 Дзікі тунец (16+).
15.05 Ліхтугі за мяжой (16+).
15.55, 19.20, 0.25, 3.30 Расследаванні авіякатастроф (16+).
18.25 Фабрыка ежы-2 (16+).
21.50 У пошуках Амеліі (16+).
23.35 Зборнік «Гульняў розуму» (16+).
4.20 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
5.05 Асушыць акіян (16+).

Discovery

8.00 Ратавальнікі-цяжкавагавікі (16+).
8.45, 18.03 Бітвы скарбашукальнікаў (12+).
9.10 Выгаднай старызна (12+).
9.35, 17.12, 22.18 Круты цюнінг (12+).
10.25 Брудныя грошы (12+).
11.15, 21.27, 4.56 Як гэта ўладкавана? (12+)
12.06, 19.45, 4.10 Махінатары (12+).
12.57 Узрываючы гісторыю (12+).
13.48 Дабітыя тачкі (12+).
15.30 Як гэта зроблена? (12+)
16.21, 1.42 Музейныя загадкі (12+).
18.54 Чыгунка Аляскі (12+).
20.36, 5.42 Каралі аўкцыёнаў (12+).
23.09 Паляўнічыя на склады (16+).
0.00 Залатая ліхаманка (16+).
0.51, 6.28 Выжыць разам (16+).
2.33 Чыгунка Аўстраліі (12+).
3.24 Узрываючы гісторыю (12+).
7.14 Голыя і напалоханыя XL (16+).

СУПРАЦОЎНІЦТВА

НА СУВЯЗІ З КРАСНАДАРАМ

Дэпутаты Магілёўскай вобласці пашыраюць супрацоўніцтва з прадстаўнікамі прадстаўнічай улады Кубані

Ні каранавірус, ні закрытыя граніцы не перашкаджаюць народным абраннікам Расіі і Беларусі ўмацоўваць масты сяброўства. Не так даўно адбылася анлайн-сустрэча паміж прадстаўнікамі Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў і Асацыяцыі «Савет муніцыпальных утварэнняў Краснадарскага краю».

Сяброўскія адносіны Прыдняпроўскага рэгіёна з Кубанню пачаліся з V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які праходзіў у Магілёве. З таго часу яны толькі паглыбляюцца. Падчас анлайн-сустрэчы ўдзельнікі выказалі спадзяванні на ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. У магілёўскай асацыяцыі вопыт работы пакуль невялікі, але расійскія партнёры, якія стварылі сваю арганізацыю ў 2006 годзе, гатовыя падзяліцца практычнымі напрацоўкамі. За час свайго існавання Савет муніцыпальных утварэнняў стаў вельмі важнай структурай на Кубані, якая займаецца не толькі абаронай правоў і каардынацыяй работы яе ўдзельнікаў, але і актыўна ўзаемадзейнічае з рознымі ведамствамі і грамадскімі арганізацыямі.

— Узаемадзеянне з рэгіянальным парламентам — гэта адзін з найважнейшых кірункаў работы Савета, — адзначыў падчас перагавораў **старшыня камітэта па мясцовым самакіраванні Заканадаўчага сходу Краснадарскага краю Сяргей ЖЫЛЕНКА.** — Прадстаўнікі асацыяцыі бяруць удзел у пасяджэннях рабочай групы камітэта Заканадаўчага сходу па пытаннях мясцовага самакіравання, а таксама ў рабоце Кансультатыўнага савета пры камітэце. Акрамя таго, сёння савет цесна ўзаемадзейнічае з Краснадарскім рэгіянальным аддзяленнем Усерасійскага савета мясцовага самакіравання, які я ўзначальваю. Сумесна абмяркоўваем актуальныя пытанні і прапрацоўваем шляхі іх вырашэння, падтрымліваем і распаўсюджваем найлепшыя муніцыпальныя практыкі.

Дарэчы, адзін з кірункаў, які актыўна развіваюць народныя абраннікі Кубані, — інфармацыйна-асветніцкая дзейнасць. Савет муніцыпальных утварэнняў — заснавальнік і распаўсюджвальнік часопіса «Мясцовае самакіраванне Кубані». А летась яго сіламі была выдадзена кніга «Кубань 1941—1945. Малыя старонкі Вялікай Перамогі», дзе сабраная інфармацыя па ўсіх муніцыпалітэтах Краснадарскага краю.

За час анлайн-сустрэчы дэпутаты абгаварылі план узаемадзеяння і канкрэтныя мерапрыемствы, якія можна было б рэалізаваць у найбліжэйшым будучым. Па выніках сустрэчы было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве ў адукацыйнай, культурнай і турыстычнай сферах.

— Калегі запрасілі нас да сябе ў госці, і, як толькі знімуць усе эпідэмічныя абмежаванні, мы зможам напоўніць гэтыя сустрэчы практычным зместам, — падкрэсліла **выканаўчы дырэктар Магілёўскай абласной асацыяцыі Паліна ЦЕРАШКОВА.** — У найбліжэйшы час будзе распрацаваны план мерапрыемстваў, па якім мы збіраемся дзейнічаць.

— Такія сувязі вельмі патрэбныя для рэгіянальнага развіцця тэрыторый, — адзначыў **старшыня Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН.** — А яшчэ мы ўмацоўваем сувязі з Ленінградскай і Калінінградскай абласцямі. Зараз рыхтуем адпаведныя дагаворы. Паколькі ўмовы пакуль пандэмічныя, усе зносіны перанесены ў анлайн-фармат.

У перагаворах таксама ўзялі ўдзел член прэзідыума Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Анатоль Глаз і выканаўчы дырэктар асацыяцыі «Савет муніцыпальных утварэнняў Краснадарскага краю» Алег Навумкін.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Магілёўскай асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

Аснова забеспячэння сацыяльнай стабільнасці

На нядаўняй сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў абмеркавалі вынікі года і планы на 2021 год, агучылі і перспектывы на пяцігодку.

Кіраўнік «абласнога парламента» Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ падкрэсліў, што, як і ў краіне ў цэлым, у вобласці забяспечылі стабільнае сацыяльна-палітычнае становішча. Правядзенне мерапрыемстваў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Віцебскай вобласці на 2016—2020 гады дала магчымасць гарантаваць неабходную дынаміку па большасці паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця. І сацыяльная накіраванасць па-ранейшаму — галоўнае ў дзейнасці мясцовай улады.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ адзначыў, што спецыфіка Віцебшчыны ў наступным: сёння больш за 30 % выпуску прамысловай прадукцыі вобласці залежыць ад рытмічнасці паставак нафтахімічнай сыравіны.

Пачынаючы з сакавіка, рэзка скараціўся попыт на паслугі турызму, спорту, аздараўлення, культуры і забаў, устаноў грамадскага харчавання. Скараціўся рознічны тавараабарот. Безумоўна, гэта — вынік уздзеяння каранавіруса. І Беларусь тут нічым не адрозніваецца ад іншых краін.

Эканоміка спрацавала эфектыўна, канстатаваў губернатар. Напрыклад, за студзень — кастрычнік мінулага года чысты прыбытак склаў 1 мільярд рублёў — рост у 1,5 раза. А зніжэнне выдаткаў адбылося на 4,8 %. Узровень рэнтабельнасці продажаў у сярэднім па вобласці склаў 6,6 % (4,4 % — за 2019 год).

Не дапушчаны рост узроўню беспрацоўя. Калі пяць гадоў таму яно складала 1,1 %, у канцы 2020 года — усяго 0,3 %. Найбольш запатрабаваныя прафесіі — швачка, кіроўца аўтамабіля, кухар, прадавец, зборшчык абутку, электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання, слесары розных профіляў. Пастаянным попытам карыстаюцца кваліфікаваныя бухгалтары, інжынеры, медыцынскія сёстры, урачы. У сельскай мясцовасці запатрабаваныя трактарысты, аператары машыннага даення, жывёлаводы, ветурачы.

> Прыкладамі выпуску новых відаў прадукцыі служаць зарадныя станцыі для электрамабіляў на «Віцязю», тэлескапічныя аўтамабільныя гідрапад'ёмнікі — кампаніі «Вітбудтэхмаш», кабельная прадукцыя ад «Энергакамплекта», вымяральныя прыборы — на аднайменным прадпрыемстве і іншыя.

2020 год — завяршальны год пяцігадовага развіцця, нагадаў старшыня аблвыканкама, галоўны вынік якога — рост даходаў насельніцтва: 107 % да ўзроўню 2015 года. Рэальная заработная плата павялічылася ў 1,3 раза.

На новыя рабочыя месцы, дзякуючы стварэнню новых вытворчасцяў і прадпрыемстваў, за пяць гадоў працаўладкавана больш за 30,5 тысячы чалавек. Узровень інфляцыі знізіўся: са 112 % да 106,2 %.

За пяцігодку прамысловымі арганізацыямі ўкладзена ў асноўны капітал больш за 4,5 мільярда рублёў інвестыцый. Створана каля чатырохсот новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў.

Наладжаны выпуск абсталявання для гандлёвых сетак на міжнародным холдынгу «Мадэрн-Экспа», завершана поўная рэканструкцыя і мадэрнізацыя Віцебскага футравага камбіната. У Оршы ўведзены ў эксплуатацыю першы ў Беларусі завод па вытворчасці стальных бясшвовых балонаў «ЦыліндэрсБел», завершаны другі этап тэхнічнага пераўзбраення на Аршанскім ільнокамбінаце.

Цікава, што большасць арганізацый, якія ствараюцца, займаюцца перапрацоўкай драўніны і выпускам вырабаў з дрэва. Летась былі створаны пятнаццаць такіх вытворчасцяў.

У мэтах павышэння эфектыўнасці перапрацоўкі сыравіны створаны новыя вытворчасці: поліпрапіленавых нітак на «Віцебскіх дываны», паркетнай дошкі — на Пастаўскім мэблевым цэнтры, сухой сыроваткі і малочных прадуктаў — на Глыбоцкім малочнакансервавым камбінаце, сыроў — на «Савушкін-Орша».

У аб'ёме прамысловай вытворчасці ўдзельная вага адгружанай інавацыйнай прадукцыі складае каля 30 %.

Прыкладамі выпуску новых відаў прадукцыі служаць зарадныя станцыі для электрамабіляў на «Віцязю», тэлескапічныя аўтамабільныя гідрапад'ёмнікі — кампаніі «Вітбудтэхмаш», кабельная прадукцыя ад «Энергакамплекта», вымяральныя прыборы — на аднайменным прадпрыемстве і іншыя.

Разам з тым, па-ранейшаму існуе шэраг праблем, якія неабходна тэрмінова вырашаць. Асобныя прамысловыя арганізацыі з-за складанага фінансавага становішча не маюць абаротных сродкаў і магчымасці прыцягнуць крэдытныя рэсурсы для мадэрнізацыі. Абсталяванне абнаўляецца кропкава, не закранаючы тэхналагічнага ўкладу, капітальныя ўкладанні накіроўваюцца на абслугоўванне бягучай дзейнасці, агучыў праблемныя моманты губернатар.

Захоўваецца праблема загрузкі магутнасцяў, высокая закрэдытаванасць, неэфектыўнае выкарыстанне маёмасці. Як вынік — рост выдаткаў, высокая матэрыялаёмістасць.

Асноўнымі пунктамі росту і рэзервамі ў павышэнні эфектыўнасці работы прамысловага комплексу ў 2021 годзе і на перспектыву да 2025 года будзе мадэрнізацыя арганізацый харчовай прамысловасці. Для загрузкі магутнасцяў працягнуць развіваць сыравінныя зоны сельскагаспадарчых арганізацый...

— 2021 год закладвае падмурак фарміравання сацыяльна-эканамічнага развіцця на найбліжэйшую пяцігодку. Мы павінны дакладна разумець — выкананне запланаваных мерапрыемстваў — аснова сацыяльнай стабільнасці і росту дабрабыту нашых людзей. Усё залежыць толькі ад кожнага з нас, незалежна ад пасад і функцыянальных абавязкаў.

Па нас людзі ацэньваюць эфектыўнасць работы дзяржаўнай улады, якасць кіраўніцкіх рашэнняў, іх адпаведнасць тэндэнцыям развіцця грамадства, у якім мы жывём, — падкрэсліў губернатар.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«МАМА, ПАЙШЛІ ДА «МАРУСІ»!

Пра тое, як пры жаданні дэпутат можа парадаваць дзятву, заслужыць павагу з боку дарослых — і не толькі тых, хто за яго галасаваў.

Ігар МЯДЗВЕДСКІ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Наваполацкага гарадскога Савета дэпутатаў па пытаннях мясцовага самакіравання і рэгламенце паразважаў наконт важнасці бесперапыннай сувязі з землякамі, прытрымлівання прынцыпу: паабяцаў — выконвай! Ён ужо не раз даказваў, што дэпутат — гэта той, хто рэальна можа дапамагчы вырашыць пытанне, якое хвалюе гараджан. Ігар Мядзведскі працуе намеснікам дырэктара Наваполацкага мантажнага ўпраўлення ААТ «Трэст Белсантэхмантаж № 1». А яшчэ ён быў адным з тых, хто збіраў прапановы магчымых змяненняў у Канстытуцыю.

На радасць дзятве!

— Прасцей давесці праблемную інфармацыю да адказных асоб выканкама і чакаць рэагавання. Але наўрад ці за такі падыход выбаршчыкі будуць паважаць, — перакананы суразмоўнік.

Калі параўноўваць колькасць зваротаў за два гады, іх стала больш. І самае цікавае, што да яго звяртаюцца жыхары і іншых акруг. У першую чаргу — па пытаннях добраўпарадкавання двароў.

> Маё суб'ектыўнае меркаванне: гараджанам патрэбныя работа з дастойным заробкам, камфортнае жыллё, якасная медыцына.

— Вельмі рады, што ў мяне атрымалася дамагчыся асфальтавання дарогі ўздоўж дома № 99 на вуліцы Маладзёжнай. Жыльцы звярнуліся да мяне проста на вуліцы з просьбай паспрыяць у рамонце дарогі, я заўсёды з работы іду ўздоўж гэтага дома. Мяне пазналі і папрасілі дапамагчы, — распавядае дэпутат.

Калі ён балаціраваўся, паабяцаў пабудаваць дзіцячую пляцоўку. І дзякуе за аказаную матэрыяльную дапамогу дырэктару прадпрыемства, дзе працуе, Міхаілу Эляшэвічу, супрацоўнікам іншых арганізацый. Дэпутат прыдумаў назву гульнявому комплексу — «Маруся». Гэта фактычна міні-гарадок для дзятвы — з дзвюма горкамі, кольцамі, рукаходам, двайнымі арэлямі і лаўкай «Пчолка».

А хутка будзе ўсталявана яшчэ і карусель, дамоўленасць са спонсарам ужо дасягнута.

— Мой раён не новы і да гэтага слаба абнаўляўся. Ганаруся маленькім дасягненнем, асабліва прыемна сэрцу і вачам, калі праходзіш міма гульнявой тэрыторыі і бачыш там шчаслівых, вясёлых дзяцей. І часам чую, як дзеці просяць сваіх бацькоў: «Мама, пайшлі да Марусі!» Шмат тэлефануюць з іншых вуліц, каб і ў іх двары такое ж было, — расказаў Ігар Мядзведскі.

Танней? А як жа людзі?

Дарэчы, да будаўніка часам звяртаюцца з пытаннямі працаўладкавання як з Наваполацка, так і з Полацка. Ёсць тэндэнцыя: многія рабочыя вяртаюцца з Расіі і хочуць уладкавацца на радзіме. Ды і з прыватных арганізацый шмат званкоў. Дэпутат дапамог з работай у трэсце электрагазазваршчыку, які працаваў у Расіі, мантажніку санітарна-тэхнічных сістэм і абсталявання, рабочаму агульнабудаўнічай спецыяльнасці і жанчыне, якая цяпер працуе ў ахове.

— На жаль, просьбы ўсіх не задаволіць. Дарэчы, нашы канкурэнты з прыватнай формай уласнасці, якія ўдзельнічаюць у тэндарах, практычна заўсёды не маюць рабочых у штаце, а наймаюць іх па дагаворах падраду. Адпаведна, і выдаткі ў іх іншыя, на тэндарах яны могуць знізіць кошт. У нашай жа арганізацыі ўсе супрацоўнікі ў штаце, у нас афіцыйная заработная плата (няма ніякіх «заробкаў у канвертах»), выдаецца спецвопратка, працуе служба аховы працы, мы спраўна плацім падаткі,— дзеліцца дэпутат. — Заўсёды пытаюся: колькі тых, хто працавалі ў прыватных будаўнічых арганізацыях, выйшла на пенсію? Ды іх практычна няма! З работнікаў у большасці прыватных будаўнічых арганізацый выціскаюць усе сокі, пакуль яны маладыя і поўныя сіл. А потым іх звальняюць, а прыбытак атрымлівае «гаспадар». І гэтыя людзі ідуць у цэнтр занятасці. У нас жа нават па дасягненні пенсійнага ўзросту, калі ёсць жаданне, працягваюць працаваць. А пенсіянерам аказваецца матэрыяльная падтрымка...

Каля 250 прапаноў

Дэпутаты нафтаграда правялі работу па зборы прапаноў ад насельніцтва па змяненнях у Канстытуцыю. Суразмоўнік быў адным з членаў камісіі, якая займалася гэтым пытаннем.

Прапановы накіроўваліся на электронную пошту: у гарсавет і гарвыканкам, у службу «Адно акно», выслухвалі і па тэлефоне. Народныя абраннікі выязджалі для абмеркавання ў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, праводзілі сустрэчы ў працоўных калектывах, ЖЭСах.

А з 15 кастрычніка да 12 лістапада штотыдзень па чацвяргах працавала грамадская прыёмная, у выніку было сабрана каля 250 прапаноў і просьбаў.

— Хачу падкрэсліць, што большая частка зваротаў грамадзян датычыцца не змяненняў у Канстытуцыю. Гараджан хвалююць штодзённыя праблемы: пытанні аховы здароўя, дзейнасці падраздзялення ЖКГ, добраўпарадкавання, магчымасці павышэння матэрыяльнага дабрабыту, — дзеліцца ўражаннямі Ігар Мядзведскі.

Сярод іншых прапаноў: адмена смяротнага пакарання, замацаванне паняцця шлюбу як выключна саюзу мужчыны і жанчыны; устанаўленне фіксаванай сумы па аліментах, якая не прывязваецца да заробку (гэта выключыць магчымасць хаваць даходы); не больш за два тэрміны дзеяння паўнамоцтваў кіраўніка краіны.

— Хачу адзначыць, што калі ў гараджан, якія прапануюць абмежаваць паўнамоцтвы Прэзідэнта, цікавіўся: а хто і як будзе выконваць дадзеныя функцыі, у адказ часта чуў «не ведаю». Гэта як з прапановамі вярнуць Канстытуцыю 1994 года. Калі пытаешся, а што менавіта варта вярнуць, — маўчанне. Гэта значыць, што людзі, якія падобнае прапануюць, на той час Асноўны Закон краіны не бачылі! — перакананы дэпутат.

Навапалачане таксама прапанавалі зрабіць парламент аднапалатным з тэрмінам паўнамоцтваў на пяць гадоў. Ёсць жадаючыя, каб усе выбары — ад мясцовых да прэзідэнцкіх — праводзіліся адначасова; каб работнікі выканкамаў пражывалі ў горадзе, дзе яны працуюць, каб гарадскія суддзі абіраліся Саветамі дэпутатаў.

Былі і просьбы вярнуць ільготы «чарнобыльцам», аб адмене падатку на дармаедства, кантрактнай сістэмы, дарожнага падатку для грамадзян Беларусі...

Аднак дэпутат не заўважыў ажыятажу з нагоды магчымых папраўак у Канстытуцыю.

— Гэта, паўтаруся, пацвярджае наступны факт: сутнасць зваротаў у асноўным датычыцца штодзённага жыцця. Маё суб'ектыўнае меркаванне: гараджанам патрэбныя работа з дастойным заробкам, камфортнае жыллё, якасная медыцына. Вельмі запатрабаваная бяспека ў грамадскіх месцах, каб можна было спакойна выходзіць на вуліцы, а дзецям — гуляць у дварах! — рэзюмаваў дэпутат.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота з асабістага архіва Ігара МЯДЗВЕДСКАГА.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

ПАМЯЦЬ У СЭРЦЫ НАЗАЎЖДЫ!

Наша краіна моцна пацярпела ад фашызму падчас Вялікай Айчыннай вайны, і помнікі тым, хто аддаў сваё жыццё за лепшы лёс сваіх нашчадкаў, быццам напамін: беражыце мір! Яны ёсць у кожнай вёсачцы Магілёўскага раёна.

Жахлівыя падзеі адбыліся 75 гадоў таму і ў вёсцы Малыя Бялевічы, дзе быў спалены 41 жыхар. Іх памяці прысвечаны мітынг, удзел у якім узяла і моладзь. Яна павінна ведаць, што наша вялікая краіна выстаяла ў гады вайны толькі таму, што такія паняцці, як любоў да Радзімы, патрыятызм і інтэрнацыяналізм былі не проста словамі, а жыццёвымі правіламі. Маладыя хлопцы і дзяўчаты пачулі жахлівыя аповеды з вуснаў тых, хто стаў сведкам ваенных часоў. Ад іх успамінаў сціскалася сэрца і наварочваліся слёзы. Такое забываць нельга. Вядомы паэт Расул Гамзатаў пісаў: «Хто страляе ў мінулае з пісталета, у таго будучыня будзе страляць з гарматы». І мы не забываемся. Нагадваем дзецям пра трагічныя моманты нашай гісторыі, каб яны маглі з гонарам працягваць справу сваіх продкаў, вучыцца ў іх мужнасці і стойкасці. Можна не сумнявацца, што памяць пра па-зверску закатаваных землякоў назаўжды застанецца ў сэрцах нашчадкаў.

Людміла ПАЛУЙКА,
выхавальнік ГПД ДУА
«Семукацкі НПК ДС–СШ».

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by **(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 21 студзеня 2021 года.**

Страта

...Беларускія хаты і твары людзей

У Парыжы памёр беларускі і французскі мастак Барыс ЗАБАРАЎ

Нарадзіўся жывапісец у Мінску — 16 кастрычніка 1936 года. Закончыў мастацкае вучылішча. Дыплом прафесійнага мастака атрымаў у інстытуце імя Сурыкава ў Маскве. Вярнуўшыся ў Мінск, шмат гадоў працаваў у галіне кніжнай графікі. Пісьменнікі лічылі за гонар, калі іх кнігі афармляў менавіта Барыс Забораў.

І ўсё ж у 1980 годзе творца эміграваў з Савецкага Саюза. Кароткі адрэзак часу правёў у Аўстрыі. І пасля ўвесь час жыў у Францыі, дзе адбыўся як жывапісец, атрымаў прызнанне. Карціны Барыса Заборава знаходзяцца ў самых прэстыжных музеях Еўропы, розных краін у іншых частках свету, экспанаваліся ў самых аўтарытэтных мастацкіх галерэях свету. Барыс Забораў — кавалер ордэна «Мастацтва і Літаратура» Французскай Рэспублікі.

У Беларусь жывапісец вяртаўся неаднойчы. Была і выстаўка ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, якая мела шырокі розгалас. Былі і сустрэчы з сябрамі — пісьменнікамі, мастакамі, рэжысёрамі, мастацтвазнаўцамі... Любіў прымаць землякоў Барыс Забораў і ў Парыжы. Шмат каму аказваў падтрымку. Праўда, і такі настрой быў у мастака, вялікага творцы — пра гэта пісаў пасля паездкі ў Парыж народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін: «Барыс неяк прызнаваўся, што пабойваецца ехаць у Беларусь: тое, што жыве ў душы, што жывіць памяць, можа імгненна памерці (эфект ускрытай мумііі), яго можа ўжо не быць, не існаваць, таго паветра, тых пахаў. А мастака праследуе пах цёплага пылу на летніх вясковых вуліцах. Між іншым, прыйшло мне на памяць, як баяўся Шагал сустрэчы з родным Віцебскам, бо ён жа пранёс свой Віцебск праз усё жыццё. Ягоны, шагалаўскі, Віцебск застаўся жыць на палотнах».

У 1997 годзе ў Беларусі, на адной са святочных імпрэз у музеі матэрыяльнай культуры «Дудуткі», Барыс Забораў даў вялікае інтэрв'ю газеце «Звязда». Вось што тады адказаў мастак на актуальныя ў той час пытанні на тэму вяртання:

«Вы думаеце калі-небудзь пра сур'ёзнае вяртанне вашага мастацтва на Беларусь?»

— Як вядома, «няма прарока ў сваёй Айчыне». Парадокс заключаецца ў тым, што расійскае пасольства ў Францыі арганізавала маю выстаўку ў Пушкінскім доме. Я, канешне ж, хацеў бы, каб у Мінску адбылася мая выстаўка. Ды неяк не атрымліваецца. Усе гавораць пра гэта, усе прапаноўваюць выстаўку, але ў той жа час адбываецца нешта такое, што становіцца перашкодай.

— Значыць, беларускі глядач вам патрэбен?

— Хутчэй, я хацеў бы вярнуцца ў свой родны дом. Калі ўсё будзе добра, у мяне адбудзецца невялікая выстаўка ў Траццякоўскай галерэі. І я вельмі хацеў бы, і гэта будзе каштаваць не вельмі дорага, калі гэтая выстаўка пераедзе ў Мінск. Дарэчы, яна задумана пад дэвізам «Дамы і людзі». Там будуць мае так званыя пейзажы — беларускія хаты і твары людзей. Калі такая выстаўка здзейсніцца ў Траццякоўцы і не прыедзе ў Беларусь — гэта будзе ненармальна. Трэба заўважыць, што я атрымліваў запрашэнні наладжваць выстаўкі ў Беларусі. У тым ліку — і ад беларускага пасольства ў Францыі, але разам з тым праяўляецца нейкае табу. Табу існуе ў асобе тых людзей, якія некалі кіравалі Саюзам мастакоў і ўплыў якіх і сёння дастаткова магутны.

Маладыя мастакі, што прыязджаюць у Францыю, усе заходзяць да мяне. Я рады ім. Бачу, што растуць цікавыя хлопцы. Адчуваю, што за шаснаццаць гадоў выраслa новае пакаленне.

Шкада толькі, што ў большасці сваёй беларускія мастакі слізгацяць па паверхні беларускага пейзажу, не пранікаючы ў яго сутнасць. Мяне асабіста цікавіць пах. Мастацтва павінна прапаноўваць свой адзіна магчымы погляд на рэчаіснасць. Адсутнічае спроба псіхалагічнага пранікнення ў сутнасць...»

Можа быць, у нечым і жорсткія словы, але такі ён, Барыс Забораў, і быў, такі і застанецца ў памяці часу. Дарэчы, інтэрв'ю было надрукавана ў «Звяздзе» 2 ліпеня 1997 года з такой назвай: «Барыс Забораў: «Гаварыць пра любоў да радзімы можа любы дэмагог. А вось сапраўды любіць могуць выключна асобы-адзінкі...»

...Некалькі гадоў таму ў Санкт-Пецярбургу (у 2018-м) выйшла кніга Барыса Заборава «Тое, што нельга забыць». Мастак расказаў пра свой шлях па жыцці, творчасці, растлумачыў тыя ці іншыя свае рашэнні. Біяграфічная канва, згодна з якой выбудаваны аповед, не прымусіла аўтара сысці ў сухую і, магчыма, цікавую толькі яму, блізкаму колу мемуарыстыку. У кнізе, вокладка якой настройвала на сустрэчу з мемуарыстыкай, выявіўся таленавіты мастак слова, цікавы празаік. Зараз гэтая кніга перакладаецца на беларускую мову і ў хуткім часе пабачыць свет у адным з мінскіх выдавецтваў.

Мікола БЕРЛЕЖ.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс: +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00-14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации:

В течение трех предшествующих лет ООО «СИ-трейдинг» как заказчиком строительства были построены следующие объекты, расположенные в д. Копище Минского района: жилой дом №19/4 по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 10 месяцев; жилой дом №1 по ул. Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 22 месяца; жилой дом №21Б по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 17 месяцев; жилой дом № 5 по ул. Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактический срок строительства – 15 месяцев.

Информация об объекте строительства:

Цели строительства – строительство многоквартирного жилого дома в составе объекта «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло» в г. Минске.

Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:

начало строительства – апрель 2019 года;

окончание строительства – октябрь 2021 года.

Результаты государственной экспертизы проектной документации:

Положительные заключения государственной экспертизы № 1021-60/18 от 08.11.2018, № 1388-60/18 от 21.01.2019, № 1021-60/18-Д1 от 20.02.2020 г., выданные Дочерним республиканским унитарным предприятием «Госстройэкспертиза по г. Минску».

Сведения о месте нахождения объекта строительства:

Местонахождение объекта строительства: Республика Беларусь, город Минск, Центральный район, ул. Гастелло. К объекту строительства примыкают: с севера – существующая среднеэтажная жилая застройка, с юга – ул. Гастелло и существующий сквер, с запада – существующая среднеэтажная жилая застройка и участок посольства Турции, с востока – существующая среднеэтажная жилая застройка и ул. Тарханова.

Характеристика объекта строительства:

Проектной документацией предусматривается строительство жилого дома по ул. Гастелло (далее – «жилой дом») по индивидуальному проекту.

Жилой дом 9-10–этажный с двумя подземными уровнями, цокольным этажом, «теплым» техническим чердаком и встроенными помещениями общественного назначения имеет следующие основные показатели: количество секций – 4; количество квартир – 186 (в том числе однокомнатных – 112, двухкомнатных – 16, трехкомнатных – 49, четырехкомнатных – 9); гостиница на 12 номеров с подсобными и вспомогательными помещениями с отдельными входами; 5 административно-торговых помещений с отдельными входами; гараж-стоянка на 199 машино-мест.

Жилой дом расположен в центральном районе г. Минска. Транспортное обслуживание осуществляется с улиц Гастелло и Тарханова. После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

Конструктивная схема жилого дома – монолитный железобетонный каркас с заполнением мелкоштучными кладочными материалами наружных стен. Здание имеет в каждой из секций по одному лифту.

В жилом доме предусмотрены поквартирные системы отопления с устройством индивидуальных узлов учета тепла. В качестве нагревательных приборов приняты радиаторы и конвекторы. Вентиляция жилых помещений – естественная с притоком через окна (микропроветривание). Вентиляция гаража-стоянки, администрации гостиницы с фитнес-залами – приточно-вытяжная с механическим побуждением; номеров гостиницы, административно-торговых помещений – механические вытяжные системы с естественным притоком через окна (микропроветривание). Здание оборудовано системой хозяйственно-питьевого водоснабжения, для гаража-стоянки предусмотрена система противопожарного водоснабжения. В здании предусмотрена система дымоудаления из гараж-стоянки, система подпора воздуха в шахты лифтов и тамбур-шлюзы в гараж-стоянке, автоматическое пожаротушение в гараж-стоянке. В жилых комнатах предусмотрена установка автономных пожарных извещателей.

Электроснабжение осуществляется путем поквартирной установки электрощитов. Учет потребляемой электроэнергии осуществляется электросчетчиками, установленными для каждой квартиры. Предусмотрена автоматизированная система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ).

Для телефонизации жилого дома предусмотрено построение пассивной оптической системы (PON), обеспечивающей возможность подключения телефонных аппаратов, высокоскоростного интернета, цифрового телевидения. Для обеспечения содержания входной двери в подъезд закрытой на замок, двухсторонней связи с жильцами и дистанционной разблокировки из квартир входной двери используются видеодомофоны.

Строительная готовность жилых помещений:

- частичная внутренняя отделка: штукатурка стен и перегородок, стяжка пола, монолитные железобетонные потолки;
- вентиляция – естественная по схеме: приток через окна (микропроветривание), вытяжка через каналы унифицированных вентблоков;
- электроснабжение – поквартирная разводка электроосвещения с установкой выключателей, звонка, электросчетчика, без установки электроплиты, розеток (за исключением 1 розетки под модем). Без внутриквартирной разводки электроснабжения;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, полотенцесушитель, выводы для подключения санитарно-технических приборов;
- канализация – стояк, выводы для подключения санитарно-технических приборов, установка унитаза;
- отопление водяное – скрытая в полу разводка, отопительные приборы (радиаторы, конвекторы);
- окна и двери на балконы – из ПВХ профилей со стеклопакетом;
- телефонизация, телефикация, интернет – ввод сетевого кабеля в квартиру, оптическая розетка;
- видеодомофон;
- дверь входная – металлическая;
- автономный пожарный извещатель.

Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:

- 1 (одна) трехкомнатная квартира № 1 (проектный) общей площадью по проекту 87,2 кв. метров на 2 этаже 1 секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет 3 428,00 рубля;
- 1 (одна) однокомнатная квартира № 160 (проектный) общей площадью по проекту 49,0 кв. метров на 6 этаже 4 секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет 3 555,00 рубля.

На предприятии действует система регулирования цены квадратного метра, зависящая от общей площади, этажа, типа планировки квартиры, а также система скидок, зависящая от размера первоначального взноса и графика внесения платежей.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях, перечисляется дольщиком на специальный и расчетный счет застройщика в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Условия заключения договоров создания объекта долевого строительства:

При заключении договора участник долевого строительства вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров на момент заключения договора создания объекта долевого строительства.

Оплата первоначального взноса в размере 50 % от стоимости квартиры осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной размер и срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляется не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с предоставлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке: застройщик вправе изменить цену объекта долевого строительства (цену договора) в случаях изменения прогнозных индексов стоимости строительно-монтажных работ в нормативный период строительства, а также изменения законодательства об уплате косвенных налогов в период строительства.

В возводимом жилом доме отсутствуют жилые помещения, при заключении договоров по которым должно отдаваться предпочтение гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Данные о правах застройщика на земельный участок, собственнике земельного участка, его границах и площади, элементах благоустройства:

- земельный участок с кадастровым номером 500000000007008389, площадью 0,7774 га, предоставленный ООО СИ-трейдинг в аренду для строительства объекта «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и поземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло», расположенного по адресу: г. Минск, район ул. Гастелло. Свидетельство (удостоверение) № 500/1355-12296 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на земельный участок (право аренды), составленное РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 9 апреля 2019 года;
- земельный участок с кадастровым номером 500000000007008391, площадью 0,0175 га, предоставленный ООО СИ-трейдинг в аренду для строительства и обслуживания трансформаторной подстанции, расположенного по адресу: г. Минск, район ул. Гастелло. Свидетельство (удостоверение) № 500/1355-12297 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на земельный участок (право аренды), составленное РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 9 апреля 2019 года;
- земельные участки с кадастровыми номерами 500000000007008597, 500000000007008598, 500000000007008599, площадью 0,1327 га, 0,0077 га, 0,0267 га соответственно, предоставленные ООО СИ-трейдинг в аренду для строительства транспортной инфраструктуры к объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и поземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло», расположенного по адресу: г. Минск, «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и поземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло». Свидетельства (удостоверения) №№ 500/1829-766, 500/1829-767, 500/1829-768 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на земельный участок (право аренды), составленное РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 8 января 2020 года.

Проектом предусмотрено благоустройство придомовой территории, тротуаров, пешеходных дорожек, площадки для игр детей, сбора твердых бытовых отходов.

Функциональное назначение нежилых помещений в жилом доме, не входящих в состав общего имущества: гостиница на 12 номеров с подсобными и вспомогательными помещениями с отдельными входами, 5 административно-торговых помещений с отдельными входами, машиноместа в двух подземных и одном цокольном этажах гараж-стоянки, объекты магистральной и распределительной инженерной инфраструктуры, финансируемые при строительстве объекта, которые будут переданы эксплуатирующим их организациям в установленном законодательством порядке.

Общее имущество жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию данного дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам: в состав общего имущества совместного домовладения, поступающего в общую долевую собственность всех дольщиков, входят фасад здания, помещения инженерного назначения (электрощитовая, тепловой пункт, лифтовые шахты, водомерный узел, насосная и т. д.), коридоры общего пользования, кладовые для уборочного инвентаря, лифты, лестнично-лифтовые холлы, межэтажные лестницы, тамбуры, конструкции водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилого дома, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства (площадки для раздельного сбора бытовых отходов, уличные парковочные места, проезды, тротуары, детская площадка), а также внутриплощадочные и внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения жилого дома. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего имущества совместного домовладения, определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации многоквартирного жилого дома и передаются застройщиком по акту приемки-передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода в эксплуатацию это товарищество создано. Если такое товарищество не создано, – лицу, определяемому общим собранием дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома: 17.10.2021 года.

Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком: договор строительного подряда № 15/03-2019 от 15 марта 2019 г., заключенный застройщиком со Строительным унитарным предприятием «СИ-трейдинг-Строй».

Строительство осуществляется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 № 263.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, **телефон/факс: +375(17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.**

СТАРОНКА СЛАВЫ Ў ГЕРАІЧНЫМ ЛЕТАПІСЕ

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі сталі ўтварацца партызанскія атрады. Пашырэнню партызанскага руху спрыяла ў тым ліку і вялікая колькасць лясных масіваў, балот, рэк і азёр. Калі да канца чэрвеня 1941 года на акупаванай тэрыторыі дзейнічалі чатыры партызанскія атрады, то ў жніўні — ужо больш за шэсцьдзясят.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

...КЛІЧАЎШЧЫНА. Усакінскі лес. Чуткі пра баявыя поспехі клічаўскіх партызан даўно выйшлі за межы раёна. Першы партызанскі атрад на Клічаўшчыне быў арганізаваны ў пачатку ліпеня 1941 года, а да канца года ў лясной зоне сталі дзейнічаць яшчэ тры новыя партызанскія атрады, у склад якіх увайшлі мясцовыя жыхары і акружэнцы.

Трывожны і таямнічы Усакінскі лес на занятай ворагам зямлі. Хто ведае, якім жыццём ён жыве, каго хавае?.. Векавыя дубы, бярозы, елкі і сосны, шчыльныя зараснікі падлеску, балоты ўтварылі суцэльны непраходны масіў. Тут, у лясной глушы, было месца дыслакацыі партызанскіх атрадаў і злучэнняў, адсюль партызаны ішлі на штурм фашысцкіх гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў. Партызанскі атрад 277 (у 1943 годзе перайменаваны ў партызанскі полк), у якім знаходзіўся і мой бацька, Мота Сахрай, спачатку дзейнічаў самастойна, а ў красавіку 1942 года ўвайшоў у склад Клічаўскага аператыўнага цэнтра і да мая 1943 года знаходзіўся ў складзе Клічаўскай брыгады.

Ні платформы з пяском наперадзе паравоза, ні ціхі ход лакаматыва, ні іншыя ахоўныя меры ворага не ратавалі становішча — склады з баявой тэхнікай, жывой сілай і боепрыпасамі бесперапынна ляцелі пад адхон.

З верасня 1941 года атрадам камандаваў Ігнат Ізох, які да вайны працаваў дырэктарам мясцовай сярэдняй школы. У лютым 1942 года атрад узначаліў А. Юркавец, а затым, перыядычна змяняючыся, камандзірамі партызанскага злучэння былі І. Рудаў, С. Мазур, С. Токараў. У снежні 1942 года атрад ізноў узначаліў І. Ізох. Гэта была магутная баявая адзінка, якая выконвала асаблівыя даручэнні Клічаўскага аператыўнага цэнтра па знішчэнні нямецкіх гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў. Атрад дзейнічаў у Клічаўскім, Бялыніцкім, Быхаўскім, Кіраўскім, Шклоўскім раёнах Магілёўскай вобласці, а таксама ў Крупскім, Бярэзінскім раёнах Мінскай вобласці. Пасля, калі 28 чэрвеня 1944 года атрад злучыўся з часцямі Чырвонай арміі, гэта ўжо быў партызанскі полк, які складаўся з трох батальёнаў агульнай колькасцю 1257 байцоў.

У гераічным летапісе тых гадоў партызанам Клічаўшчыны належыць асаблівая старонка славы. Імі былі разгромлены паліцэйскія ўправы ў Ганчакскім і Далгоўскім сельсаветах, знішчаны шэсць паліцэйскіх участкаў. Вызвалены ад гітлераўцаў часткі Кіраўскага, Бярэзінскага і Бялыніцкага раёнаў. Першыя карныя атрады паліцаяў і фашысцкія тылавыя каманды недалічваліся многіх сваіх галаварэзаў. Смерць спасцігала здраднікаў і ў камендатурах, і дома. Партызаны кантралявалі дарогі, ратавалі народнае дабро.

Усакінскі лес пастаянна папаўняўся байцамі «зялёнага бастыёна», у вёсках з ліку мясцовых жыхароў фарміраваліся атрады самаабароны. Арганізатарамі атрадаў самаабароны і партызанскіх атрадаў былі члены падпольных райкамаў партыі.

У маі 1942 года разведчыкі 277-га атрада далажылі камандаванню, што на запасных пуцях раз'езда чыгуначнай магістралі Мінск—Гомель у эшалоне знаходзяцца гітлераўцы. Камандзір прыняў рашэнне атакаваць фашыстаў. На досвітку 30 партызан адправіліся на заданне. Трэба было прайсці каля сарака кіламетраў. Як на тое, пачаўся праліўны дождж. Адзенне і абутак байцоў хутка прамоклі, ісці стала цяжка. Прайшла гадзіна, другая — лівень не сціхаваў. Людзі падалі з ног і тут жа засыналі на сырой зямлі... Ноччу наступнага дня група наблізілася да раз'езда.

Разведка данесла, што фашысты па-ранейшаму знаходзяцца ў эшалоне. Партызаны ўпотайкі падпаўзлі да вагонаў і залеглі. Потым у вагоны паляцелі гранаты і бутэлькі з запальнай сумессю. Аўтаматныя і кулямётныя чэргі прагрымелі сярод начной цішыні. Ад разрыўной кулі загарэлася бочка з бензінам, якая стаяла каля самага склада, агонь перакінуўся на вагоны, пачаўся пажар... Да світання гітлераўцы, якія збіраліся разграміць партызан, самі аказаліся разбітыя. Партызаны захапілі багатыя трафеі: шмат зброі, розны гаспадарчы інвентар і прадукты.

(Аповед пра гэты бой я чуў ад Якава Іванавіча Зайца, сакратара Клічаўскага падпольнага райкама партыі, аднаго з арганізатараў партызанскага руху на Клічаўшчыне.)

Толькі за кастрычнік-лістапад 1941 года партызанскія падрыўнікі пусцілі пад адхон шэсць варожых эшалонаў з гітлераўцамі і боепрыпасамі. Напярэдадні кастрычніцкіх свят 277-ы партызанскі атрад здзейсніў налёт на вёску Заполле. Партызаны ўзарвалі бронетранспарцёр, спалілі дзве аўтамашыны, захапілі два кулямёты, сем вінтовак, некалькі пісталетаў, знішчылі больш за дваццаць гітлераўцаў і без страт вярнуліся на сваю базу.

20 сакавіка 1942 года быў вызвалены Клічаў і прылеглая да яго тэрыторыя. Пастановай Клічаўскага падпольнага райкама партыі і выканкама раённага Савета дэпутатаў ад 3 красавіка абвяшчалася, што на тэрыторыі Клічаўскага раёна адноўлена савецкая ўлада. У раёне было абвешчана ваеннае становішча. Да канца 1942 года пад кантролем партызан аказалася шэсць зон, раёнаў і краёў Беларусі. У 1942 годзе была зацверджана пасада галоўнакамандуючага партызанскім рухам на акупаваных тэрыторыях СССР. Гэты пост заняў маршал Савецкага Саюза Клімент Варашылаў. (Пазней пасада была скасаваная.)

У 1941—1944 гадах на акупаваных тэрыторыях СССР дзейнічала звыш 6200 партызанскіх атрадаў і злучэнняў. Колькасць партызанаў і падпольшчыкаў дасягала мільёна чалавек.

Глухімі сцежкамі, а зімой — па глыбокім снезе, галодныя і напаўголыя, абыходзячы фашысцкія заставы, да партызанаў з усіх бакоў ішлі савецкія людзі.

Магілёўскае партызанскае злучэнне да 1943 года налічвала больш за 34 тысячы байцоў. У склад злучэння ўваходзілі дзевяць раённых ваенна-аператыўных груп, дзесяць палкоў, 12 брыгад і 50 асобных атрадаў.

ЛЕТАМ 1943 года фашысты задумалі знішчыць партызанаў ва Усакінскім лесе. У атрадах і злучэннях падрыхтаваліся да бою. «Няхай увойдуць у лес, — сказаў камандзір 277-га партызанскага палка Ігнат Ізох сваім сябрам, — а потым мы іх зловім». Як толькі карнікі апынуліся ў лесе, іх з усіх бакоў атакавалі партызаны. Эсэсаўцы кідаліся з боку ў бок, але іх усюды сустракаў агонь партызанскіх аўтаматаў і кулямётаў. У гэтым баі партызаны знішчылі больш за шэсцьдзясят гітлераўцаў, шмат хто з апошніх быў паранены.

Пра гэты бой расказаў былы баец 277-га партызанскага палка Якаў Лагун: «Мне добра запомніліся ўцёкі гітлераўцаў. Наперадзе карнікаў несліся, падціснуўшы хвасты, аўчаркі... Цыбаты эсэсавец імкнуўся не адстаць ад іх, але партызанская куля прымусіла яго ткнуцца ў зямлю...»

Весткі пра баявыя справы партызанаў, пра вызваленыя ад гітлераўцаў населеныя пункты абляцелі ўсе акупаваныя вобласці Беларусі. Глухімі сцежкамі, а зімой — па глыбокім снезе, галодныя і напаўголыя, абыходзячы фашысцкія заставы, да партызанаў з усіх бакоў ішлі савецкія людзі. Ішлі ў адзіночку і групамі, цэлымі сем'ямі, часта са скарбам, і знаходзілі ў партызанаў прытулак і дапамогу.

У 1943 годзе партызаны рабілі асноўны ўпор на ўдары па камунікацыях ворага. Асабліва вызначыўся ў гэтым партызанскі атрад № 752 пад камандаваннем Віктара Лівенцава. З усакінскіх лясоў, пасля прарыву блакады, атрад перабазіраваўся ў Асіповіцкі раён, месцам яго дыслакацыі сталі ўжо асіповіцкія лясы. Дзясяткі байцоў-падрыўнікоў атрада пранікалі далёка за межы раёна і ні ўдзень, ні ўначы не давалі фашыстам спакою. На чыгунцы пастаянна дзяжурыла некалькі дыверсійных груп. Ні платформы з пяском наперадзе паравоза, ні ціхі ход лакаматыва, ні іншыя ахоўныя меры ворага не ратавалі становішча — склады з баявой тэхнікай, жывой сілай і боепрыпасамі бесперапынна ляцелі пад адхон. У 1943 годзе атрад Героя Савецкага Саюза Віктара Ільіча Лівенцава загадам Цэнтральнага штаба партызанскага руху быў ператвораны ў 1-ю Бабруйскую партызанскую брыгаду.

З ліпеня 1944 года падчас аперацыі «Баграціён» савецкія войскі вызвалілі Мінск ад фашысцкіх захопнікаў. Гэты дзень святкуецца як Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі дзейнічалі 213 брыгад і 1255 партызанскіх атрадаў, з якіх 997 уваходзілі ў склад брыгад і 258 змагаліся самастойна.

Генадзь САХРАЙ.

Ізраіль, г. Ашкелон.

ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»

извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 19 марта 2021 г. очередного общего собрания по адресу: г. Минск, ул. Володько, 20, каб. 35

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ

1. Об итогах работы Общества в 2020 году и основных направлениях развития на 2021 год.
2. Отчет Наблюдательного совета и ревизионной комиссии о работе в 2020 году.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса Общества и направлений использования чистой прибыли за 2020 год. О дивидендах за 2020 год.
4. О направлениях использования прибыли Общества в 2021 году.
5. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
6. Выборы членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Место проведения собрания по месту нахождения ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»: г. Минск, ул. Володько, 20, каб. 35.

Начало работы собрания в 11.00.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.50 в день проведения собрания. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 1 марта 2021 г.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 18.02.2021, по месту нахождения Общества.

Наблюдательный совет ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»

УНП 100036332.

Информация о проведении открытого аукциона 18 февраля 2021 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь *(га)*	Целевое назначение	Начальная цена земельного участка *(бел. руб.)*
1	г. Смолевичи, ул. Ф. Скорины, д. 25	624850100008000214	0,1500	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	20000
2	г. Смолевичи, ул. Ф. Скорины, д. 13	624850100008000027	0,1418	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	20100
3	г. Смолевичи, ул. В. Купревича, д. 7	624850100008000419	0,1475	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	20200
4	г. Смолевичи, пер. М. Танка, д. 37	624850100008000384	0,1500	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	20300
5	г. Смолевичи, ул. В. Быкова, д. 12	624850100008000471	0,1500	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	20400
6	г. Смолевичи, ул. Кирилла Туровского (квартал 16, участок 7)	624850100008000764	0,1500	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	20500
7	г. Смолевичи, ул. Ивана Мележа, д. 51	624850100008000675	0,1356	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	20600
8	г. Смолевичи, пер. Гомельский	624850100001001080	0,0930	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	15000
9	г. Смолевичи, ул. Короткевича, (уч. № 2)	624850100005000821	0,1294	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки)	30000

Аукцион состоится 18 февраля 2021 г. в 15.00 в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: *г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125*, зал заседаний.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу:https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by



Багатая, дзякаваць богу (і людзям!..), пошта ў любімай звяздоўскай рубрыкі: шмат гісторый, шмат кампліментаў, якія, як правіла, застаюцца «па-за кадрам»... І хіба зрэдку, пры падвядзенні вынікаў конкурсу на найлепшую гісторыю, выносяцца на старонкі «Звязды».

Такім чынам яшчэ адзін ліст (у якасці прывітання новаму, спадзяёмся, актыўнаму аўтару) і яшчэ адна бываліца (ці прызнанне, так бы мовіць, старому). А далей — усё, як раней: «Провад» працуе. Да сустрэчы па пятніцах!

«Я выпісваю «Звязду» з тых часоў, калі стала атрымліваць зарплату — пайшла працаваць, — піша спадарыня Ларыса Купрыянчук з Рагачоўшчыны. *— Падабаецца падача матэрыялаў, разнастайнасць рубрык. Чытаючы іх, я, бывае, спрачаюся з аўтарам, часам згаджаюся, бывае — пераконваюся ў сваёй недасведчанасці і нават здаю экзамен на веданне роднай мовы...*

Але ж ці не больш за ўсё мне падабаецца ў газеце рубрыка «Алё, народ на провадзе!» Я проста ў захапленні ад многіх гісторый і шчыра зайздрошчу тым, хто ўмее пра нешта расказаць, хто можа так лёгка пасмяяцца з сябе. Паспрабую і я. Праўда, што з гэтага атрымаецца, пакуль не ведаю...».

Віват усім, хто не баіцца... у тым ліку спрабаваць!

А што датычыцца ведання...

Як кажуць нашы суседзі-расіяне: *«Знал бы прикуп, жил бы в Сочи».*

Лепш там ці не? Гэта, як падказвае жыццёвы досвед, залежыць не ад назвы горада, наяўнасці мора, грошай, машын і шмат чаго яшчэ. Рабі пільна — і тут будзе Вільня, казалі продкі.

Ад іх жа праверанае часам: рабі, што трэба, і хай будзе, што будзе! То ў добры шлях?!

НУ А ДРУЖБА ПАЧЫНАЕЦЦА... З УСМЕШКІ!

І НЕ ТОЛЬКІ З ЯЕ

Хітра ўладкавана чалавечая памяць. Бывае, нешта ўбачыў-пачуў, а што — хоць забі — назаўтра не ўспомніш, а нешта — якраз наадварот — «ляжыць» там гадамі ці нават дзесяцігоддзямі і ўспамінаецца досыць часта... Можа, таму, што ў хату пяць разоў на тыдзень прыходзіць «Звязда»? Што па пятніцах там любімая рубрыка «...Народ на провадзе», з якой, уласна...

Нічога крамольнага — проста адна праўдзівая гісторыя. Праўда, перш чым расказаць яе, трэба што-нішто растлумачыць. Справа ў тым, што я — чалавекі імпульсіўны. Гэта значыць, што нечым захапіўшыся, ужо не спынюся. Дзякуючы гэтай якасці ў нас з'явіліся свая бібліятэка, пчальнік, клеткі з трусамі, па́лкі для шведскай хадзьбы і шмат што яшчэ...Тое ж датычыцца і людзей: гэта значыць, што калі нехта з іх нечым уразіў, мне хацелася аб гэтым сказаць, напісаць, засваніцца з чалавекам альбо нават пашукаць магчымасці, каб сустрэцца ды пазнаёміцца. Часам гэта мне ўдавалася, часам, на жаль, не. Але і ў такім выпадку я (без ніякіх крыўд) працягвала сачыць за жыццём, за творчасцю сваіх улюбёнцаў.

Дык вось быў час: у гады перабудовы я страціла сувязь са «Звяздой». Тады не да падпіскі неяк было. Людзі старэйшыя помняць і пустыя паліцы ў крамах, і талоны з купонамі... Аднак чытаць газеты мне па-ранейшаму хацелася, таму ў вольную хвіліну я заходзіла на пошту (гэта блізка было, на той бок вуліцы), садзілася ў дальнім куточку і, можна сказаць, адводзіла душу — гартала свежую прэсу.

У «Звяздзе» вочы «зачапіліся» за «Простую мову», за рубрыку «...Народ на провадзе!». Помню, што чытала іх, а здавалася, што... слухаю, чую блізкія жывыя галасы, цікавыя слоўцы, сваё, роднае прастамоўе... І гэта — не кажучы пра сюжэты, пра стыль, пра гумар...

Міжволі запомніла прозвішча аўтара, стала шукаць яго на старонках газеты, якую ўжо хацелася атрымліваць дома і ў якую самой карцела штось напісаць. Але ж спачатку пазваніць гэтай загадкавай Валянціне Доўнар, пагаварыць, а калі пашчасціць, то, можа, і пабачыцца?

...Не магу сказаць, што мая просьба аб сустрэчы была прынятая з радасцю (я потым зразумела, што не самы ўдалы выбрала час: канец месяца, года, свя́ты на носе — работы ў кожнага шмат), але ж згоду я атрымала... Мы прызначылі дзень. Значыць, сустрэчы быць!

Ехаць на яе з пустымі рукамі (а тым больш напярэдадні каталіцкіх Каляд), згадзіцеся, ідэя не з лепшых». Купляць банальныя кветкі-цукеркі — таксама. Тады што? «Дзівачка, — пасмяялася з мяне сяброўка. — Ты ж «Поле цудаў» глядзіш? Глядзіш. Ты ж бачыш, што Якубовічу людзі возяць? Ды ўсё! Вось і ты нічога не ўскладняй».

І сапраўды, падумала, навошта горад гарадзіць, калі непадалёк ад нас — досыць вялікі свінакомплекс і калі там на заказ вэндзяць парасят. «Да святочнага стала, да Каляд (я чамусьці думала, што Доўнар з каталічак) гэта ж самае тое!..»

Засталося дамовіцца і забраць.

...Як цяпер помню, у Мінск, у рэдакцыю «Звязды» я ехала падрыхтаваная і цалкам шчаслівая. Ды і там: вось ён, патрэбны адрас, — Дом прэсы. Вось пяты паверх і дзверы амаль насупраць ліфта з надпісам «Рэдактар аддзела пісьмаў...». Вось насустрач мне з-за стала падымаецца ўсмешлівая танклявая жанчынка, вітаецца, дапытліва ўзіраецца, глядзіць, як я ўрачыста кладу на стол велікаваты пакунак.

— Што гэта?! — здзіўлена пытае ў мяне.

— Ну як «што»? Падарунак. Вам... Да каляднага стала...

— Я не каталічка...

— Ну тады да навагодняга...

— Не... Прабачце, але ніякіх падарункаў я не бяру, — сказала як адрэзала мая візаві.

Першы раз у жыцці я апынулася ў такой недарэчнай сітуацыі: стаяла і не ведала, што рабіць.

А вось гаспадыня таго кабінеціка наадварот — ужо гаспадарыла: хуценька дастала з шуфляды нейкі пакет, паклала туды мой «падарунак» і, уручыўшы, дала зразумець, што на гэтым знаёмства... скончана.

У бок ліфта ішла, як чужымі нагамі, успамінаючы аднаго знаёмца — яго надпіс на дзвярах: «Перш чым зайсці, падумай, ці патрэбен ты тут?». Выглядала так, што я зайшла, не падумаўшы?

— Нешта здарылася? — спытаў у мяне спадарожнік, калі прыпаўзла да машыны.

— З чаго ты ўзяў? — паспрабавала «адбіцца» я.

— Дык на вас жа твару няма...

— Няма і не трэба, — сказала яму. — Глядзі на дарогу. Мы едзем дамоў.

Больш да самай хаты сваёй я не сказала ні слова: нібы ў шахматнай гульні пракручвала ўсе хады і — з аднаго боку — не разумела нічога, а з іншага — ці не ўсё. Ну сапраўды, зусім незнаёмая цётка... Сярод белага дня... З нейкім парасём. Кажа — у падарунак... А можа, наўмысна? Можа, з праверкай на чэснасць?..

Словам, прыехаўшы дамоў, я адразу ж засела за ліст (думала: гэта першы мой і апошні). У ім я, помню, усё тлумачыла і шчыра прасіла прабачэння.

...Адказ на яго прыйшоў ледзь не назаўтра! Літаральна пад Новы год я атрымала хай трохі меншы ў аб'ёме, але ж таксама... пакунак (?!).

У ім былі прыгожая віншавальная паштоўка, некалькі звяздоўскіх блакнотаў і календароў, а галоўнае — кніга (з аўтографам!) з кароткіх мініяцюр Валянціны Доўнар «Праз каханне».

Чытаючы ды разглядаючы ўсё гэта, я быццам здымала з сэрца слой наледзі, разам з якой тут жа «сплывала» горыч неразумення і горкай крыўды.

...Пасля гэтага ў нас са «Звяздой», можна сказаць, найлепшыя сяброўскія сувязі. Я па-ранейшаму выпісваю і па магчымасці прапагандую газету, па-ранейшаму сачу за рубрыкамі «...Народ на провадзе!», «Хто каго?», «Простая мова» і цяпер са шчырай усмешкай ды цеплынёй успамінаю, з якога ж, як ні круці, «свінства» (!) пачалося наша знаёмства з вядучай рубрыкі.

Н. С.,

Бярэзінскі раён.

ЗУХ СУПРАЦЬ МУХ...

Як вядома, ва ўсім свеце і з усіх відаў спорту найбольшую цікавасць выклікае футбол. Камандная гульня: нашы — супраць не нашых... Праўда, цяпер у камандах ёсць шмат іншаземцаў. Я са здзіўленнем даведаўся, што ў Гарадзеі гуляюць французы, а ў Жодзіне — бразільцы. Таму гульні ўжо не такія цікавыя. А вось некалі... Дагэтуль помню, як у 1966-м разам з бацькам і ноч-апоўнач хадзілі да суседзяў на тэлевізар (свайго не было), каб паглядзець чэмпіянат свету ў Англіі.

А ладзілі ж іх і на месцах. Напрыклад, наша футбольная каманда ў Чачэрскім раёне была адной з найлепшых. Ды як іначай, калі ў камандзе поруч гулялі старшакласнікі, маладыя механізатары, сын старшыні калгаса, калі сам старшыня быў заўзятарам (а недзе і спонсарам), калі на поле выходзілі Бык, Дуб, Буржуй, варатар Баржа (Баўжа — прозвішча варатара ЦСКА — чамусьці не прыжылося)... Ды ад адных гэтых мянушак сапернікі дрыжэлі! Каманда разбівала ўсіх — яшчэ і таму (я сам быў сведкам), што старшыня ад лініі поля мог лёгка выдаць: «Рубель за гол!»

Гэта, вядома ж, сціплы ганарар, аднак галы былі!.. Нашы забівалі!

...Але ж бачыў я і тое, як забівалі ім.

Тады наша каманда як чэмпіён раёна прымала на сваім полі футбалістаў з Рагачова, якія з першых хвілін далі зразумець, што мацнейшыя, бо гулялі тэхнічна, лёгка, прыгожа. Яны забілі два мячы, і на полі адразу пацішэла.

Гэта была іншая гульня, іншы ўзровень! Як той казаў, зух супраць мух, а супраць зуха і сам муха.

Яўген Шастакоў,

г. Гомель.

Рубрыку вядзе ВАЛЯНЦІНА ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж... Гісторыю спадарыні Ларысы Купрыянчук чытайце ў адным з найбліжэйшых нумароў.

Неасабісты суб'ектыў

Смак сапраўднай зімы

Чаму раней не было холадна нават у люты мароз

НАРЭШЦЕ, упершыню за колькі гадоў — хай сабе і ўсяго на некалькі дзён — накрыла зямлю сапраўдная зіма. Такая, як была ў дзяцінстве, — з празрыстым паветрам, якое здаецца, звініць і пякуча казыча ў носе, з белымі бухматымі аблокамі на даляглядзе і са сляпучым халодным сонцам у высокім небе, з клубамі пары, што робяць людзей і машын аднолькава падобнымі на фантастычныя лакаматывы, са скрыпучым снегам пад нагамі. З пранізлівым холадам — як жа без яго, — ад якога нямеюць шчокі, пальцы на руках (нават у цёплых рукавіцах) і калені, а вей, калі дыхаеш праз шалік, пакрываюцца шэранню і імкнуцца прыліпнуць да броваў...

Карацей, амаль усё, як у маленстве. «Амаль» — бо, успомніце, — тады, даўней ніколі не было холадна, праўда? Прычым не толькі дзецям, але, здаецца, і дарослым. Прынамсі, у вёсцы. Пэўна, таму, што ўсе ўвесь час былі ў руху. Старэйшыя — даглядаючы скаціну, упраўляючыся па гаспадарцы. А дзеці — і пагатоў. Лыжы — найлепшая на нашай узгорыстай мясцовасці забава. Ці санкі — у іх можна было запрэгчы суседскага дурнаватага Біма і насіцца па вуліцы паміж высачэзных гурбаў. Або цэлафанавыя мяшкі з-пад калійных угнаенняў, набітыя сенам, — гэткі правобраз цюбінгаў, на іх на злом галавы ляцелі з віскам з Асінніка, самай крутой гары за рэчкай. Прыйдзеш дадому, калі ўжо сонца сядзе за хмызы, павесіш каля грубкі цяжкія рукавіцы, на якіх снег збіты ў буйныя абледзянелыя пацеркі, а сам укулішся на печ з кніжкай. Які холад? Ці быў увогуле час думаць, што холадна?

А яшчэ, я цяпер думаю, людзі раней не мерзлі нават у вясковых спартанскіх умовах, у якіх печ цёплая роўна настолькі, наколькі ты яе напаліш, бо зімой была адмысловая ежа. Смачная, сытная — ад адных успамінаў і сёння слінкі цякуць. Ну сапраўды, што на вёсцы елі і ядуць улетку? Акрамя халадніка ды маладой варанай бульбы з кропам так нічога і не ўспомніш, бо ўсё астатняе — што з грады сарвеш ці ў садзе падымеш. Зімовае ж вясковае меню — гэта проста кулінарная песня.

Вось, напрыклад, вараная кіслая капуста. Абавязкова ў печы ў чыгунку, абавязкова са свіной гудаўкай (іншае мяса, нават свініна, не дае таго непаўторнага смаку, пра курыцу і казаць няма чаго). Абавязкова да яе — бульба ў лупінах. Прычым чысціць пасля бульбу трэба не нажом, а проста разломваючы рукамі і акуратна пальцамі здымаючы тонкую скурку. Праверана неаднойчы — так смачней (чаму — растлумачыць не магу, але дакладна смачней). У капусту трэба пакласці яшчэ лыжку густой смятаны — тады зусім за вушы не адцягнеш.

А фасолю, вараную ў печы з панцаком... Туды яшчэ націралі на тарцы вялікую морквіну. Даволі густое гарачае варыва бялілі халодным малаком — гэты саладкаваты цёплы суп здаваўся самым смачным у зімовы абед... Быў у вясковым зімовым меню і суп-далікатэс — з сушаных баравікоў. Густакарычневая поліўка са зморшчанымі кавалачкамі грыбоў, што былі на дотык падобныя на гуму, пахла на ўсю хату, разносячы нават у настылыя сенцы водар нагрэтай сонцам ігліцы на жніўеньскім узлеску... У выхадныя на сняданак нярэдка варыўся квасок — так у нашых мясцінах завуць мачанку. Падкалочаны мукой і яйкам булён на свіных скабачках і да яго — стос цёплых пульхных бліноў. А яшчэ можна было першы блін — гарачы, толькі з патэльні — з'есці з кавалачкам настылага, толькі прынесенага з кубельца сала. Смаката!

НА «другое» — таксама сытныя, смачныя стравы. Калдуны — мая бабуля рабіла іх авальныя, падобныя на вялікія бульбяныя катлеты, а ўсярэдзіне — сакавітае мяса. Зваліся яны па-нашаму кульдзюкі. Ці бабка — на яе бульбу чысцілі цэлы вечар, пасля мама доўга дзерла яе на дробную тарку, дадавала цыбулю, нарэзаныя невялікімі кавалачкамі скваркі, залівала «цеста» ў гаршчок, ставіла ранкам у печ. Пасля ў гаспадарцы з'явілася вялікая чыгунная гусятніца, і бабка стала гатавацца ў ёй, больш «культурна». А вось кішку — крывяную каўбасу — спрадвеку пяклі на вялізнай прамавугольнай блясе, якая стаяла за печчу цэлы год, пакуль не закалолі свінчо. Бабуля казала, што гэта вялізная патэльня — з яе пасагу. А выходзіла бабка замуж у канцы 20-х гадоў мінулага стагоддзя. (Бляха тая, дарэчы, і сёння стаіць на сваім месцы за печчу ў нашай роднай хаце. Праўда, без справы — там ніхто не зімуе ўжо даўно, а летам — хто ж летам будзе кішку наліваць?). Нярэдка на зімовым стале была тушаная ў печы бульба — яе, як і моркву, у вялікай колькасці наразалі буйнымі крышанамі, ад морквы страва рабілася рудаватага колеру і саладкаватая. З салёнымі агуркамі ішла за мілую душу — аж за вушамі трашчала. А калі на выхадныя збіралася ўся сям'я — прыязджалі з Мінска студэнты — вечка з самага вялікага чыгуна станавілася самай вялікай патэльняй, на якой спачатку смажылася сала, пасля ўзбіваўся дзясятак яек, і ўсё гэта шчодра залівалася змяшанай з малаком смятанай, якая павінна была закіпець. Патэльню здымалі з пліты, ставілі ў цэнтр стала, і ўсе пачыналі мачаць смакату прама з патэльні блінамі, скручанымі ў трубачку. І было так весела, так хораша, так цёпла, хоць сонца ледзь праглядвала праз густа распісаныя марозам шыбы...

...ЦЯПЕР, мерзнучы нават пры мінус пяці, сядзім у абагрэтых не намі кватэрах і думаем, як бы не з'есці чаго лішняга, шкоднага, тлустага. Толькі ні цяплей, ні здаравей чамусьці не становіцца. А смак сапраўднай зімы, як і сапраўдная зіма, — толькі ва ўспамінах. І часам думаеш: а ці было яно калі наогул? Ці проста прымроілася ў некалькі халодных дзён, пасля якіх ізноў прыйшла студзеньская адліга...

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

информирует, что отказывается от проведения аукционных торгов по **лоту № 2 –** право проектирования и строительства группы многоквартирных жилых домов с объектами торговли и услуг (или административно-офисного назначения) **по ул. Дзержинского, 31, 31/1, 33, 35** в г. Бресте, на земельном участке площадью 0,1463 га, назначенных на **28 января 2021 года.**

УНП 290433924

Извещение о проведении повторных электронных торгов

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by
Продавец	ООО «БелВЭБ Капитал», г. Минск, ул. Карла Либкнехта д. 66, пом. 21а, ком. 1

Предмет электронных торгов

Лот № 1: капитальные строения, реализуемые одним лотом, по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, 10, 10Б (**здание банка** общ. пл. 581,7 кв. м., инв. номер 630/С-18374, **здание гаража на 3 автомобиля,** общ. пл. 58,1 кв. м, инв. номер 630/С-47339, **здание архива, склада, служебного кабинета и комнаты отдыха** общ. пл. 107,4 кв. м, инв. номер 630/С-39886)

Сведения о земельном участке: 1. предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,3542 га для содержания и обслуживания зданий и сооружений по ул. Виленская, 10 в г. Молодечно.
2. предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,0225 га для содержания и обслуживания административно-хозяйственного здания

Начальная цена с НДС 20 % – 1 226 670,17 бел. руб.

Лот № 2: здание банка общ. пл. 784 кв. м, инв. номер 240/С-34300 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Мира, д. 30. **Сведения о земельном участке:** пл. 0,2784 га предоставлен продавцу для использования под здание офиса на праве постоянного пользования

Начальная цена с НДС 20 % – 1 057 242,16 бел. руб.

Лот № 3: административное помещение № 3 общ.пл. 1 112 кв. м, инв. номер 500/D-687333 по адресу: г.Минск, ул. Гуляма Якубова, д. 10, пом. 3

Начальная цена с НДС 20 % – 2 490 437,88 бел. руб.

Лот № 4: здание банка общ. пл. 721 кв. м, инв. номер 130/С-26337, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 9. **Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. 0,0422 га для обслуживания административного здания

Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

Начальная цена с НДС 20 % – 930 090,00 бел. руб.

Лот № 5: изолированные помещения, реализуемые одним лотом, по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6 (пом. 3, 5,16, 7, 14, 12, 2, 13, 9, 11, 10, 6/3-17, 6/3-18, 6/3-19, 6):
1. Изолированное помещение технического этажа общ. пл. 628,9 кв. м, инв. номер 500/D-7115208, **2. Изолированное помещение машинного отделения в административном здании** общ. пл. 78 кв. м, инв. номер 500/D-7115210, 3**. Изолированное помещение в подвале административного здания** общ. пл. 20,1 кв. м, инв. номер 500/D-7115345, **4. Изолированное помещение в подвале административного здания** общ. пл. 96,8 кв. м, инв. номер 500/D-7115212, **5. Изолированное помещение на 1-м этаже административного здания** общ. пл. 6,3 кв. м, инв. номер 500/D-7115219, **6. Изолированное помещение на 1-м этаже в административном здании** общ. пл. 5,2 кв. м, инв. номер 500/D-7115217, **7. Изолированное помещение на 1-м этаже в административном здании** общ. пл. 134,2 кв. м, инв. номер 500/D-7115207, **8. Изолированное помещение на пятом этаже административного здания** общ. пл. 14,3 кв. м, инв. номер 500/D-7115218, **9. Изолированное помещение 6 этажа в административном здании** общ. пл. 568,9 кв. м, инв. номер 500/D-7115214, **10. Изолированное помещение 7 этажа в административном здании** общ. пл. 567,6 кв. м, инв. номер 500/D-7115216, **11. Изолированное помещение 9 этажа в административном здании** общ. пл. 568,5, инв. номер 500/D-7115215, **12. Нежилое помещение в подвале в административном здании** общ. пл. 331 кв. м, инв. номер 500/D-798802009, **13. Нежилое помещение на 1-м этаже в административном здании** общ. пл. 406,5 кв. м, инв. номер 500/D-798802010, **14. Нежилое помещение на 2-м этаже в административном здании** общ. пл. 570,3 кв. м, инв. номер 500/D-798802011, **15. Изолированное помещение на 5-м этаже в административном здании** общ. пл. 453,6 кв. м, инв. номер 500/D-7115211

Начальная цена с НДС 20 % – 10 877 126,88 бел. руб.

Дополнительная информация:
1. Обременения по лотам № 1-5: объекты находятся в залоге у ОАО «Банк БелВЭБ».
2. В состав лотов № 1-5 входит иное имущество. Перечень имущества размещен на сайте www.ipmtorgi.by.
3. Обременения: аренда по лотам 1,3-5. Подробная информация у Продавца

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи	10 *(десять)* рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 1 до 5% от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.12.2020 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: начало торгов **10.00 10.02.2021 г.** Окончание торгов **12.00 10.02.2021 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **09.02.2021 г. до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06 Email: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

